**Уладзімір Гніламёдаў**

# Праўда зерня

*Творчы партрэт Васіля Зуёнка*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1992

Василь Зуёнок — один из самых самобытных и талантливых современных поэтов, кто берется за перо не только ради того, чтобы высказать радость и очарование жизнью, а перво-наперво чтобы ответить на извечные вопросы: как жить, что любить, во что верить? В книге анализируется жизненный и творческий путь поэта, раскрываются глубина и своеособенность художественно-философских взглядов, гуманизм, вера в духовные ценности человека.

ISBN 5-340-00882-7 © У. В. Гніламёдаў. 1992

## ПАЧАТАК ДАРОГІ

Як становяцца паэтамі? Кажуць, што паэтамі нараджаюцца. Магчыма. Васіль Зуёнак — адзін з самых вядомых сучасных беларускіх паэтаў — адказвае на гэта пытанне так:

З табою не спраўлялі мы заручын,
Сватоў не засылаў я.
                    Ты сама
Прыйшла аднойчы песняю нягучнай...
І з хвілі той спакою мне няма...

Паэзію не выбіраюць — яна сама выбірае. З Васілём Зуёнкам гэта здарылася яшчэ ў школьныя гады, калі свет упершыню адкрыўся перад ім у сваім першародным бляску і харастве, натуральнасці фарбаў жыццёвай прыгажосці, прымусіў дзівіцца зямной красе.

Быў пярэдадзень вясны — прадвесне, як кажуць на Беларусі,— трывожна-рамантычная пара года, напоўненая нейкім асабліва хвалюючым чаканнем, прадчуваннем дзіва, незвычайнай падзеі.

Дзіва чакаюць бярэзнік, ліпоўнік.
Праз нейкі тыдзень
Над лесам узыдзе
Зялёная поўня.

Паэзія адкрылася аўтару гэтых радкоў В. Зуёнку як рэальнае хараство, прыгажосць навакольнага жыцця, здольнага пераўтварыць духоўны свет чалавека, падтрымаць яго ўнутраную годнасць і высакародства. Хлопец адчуў глыбокае ўзрушэнне — захацелася падзяліцца сваім адкрыццём з іншымі.

Першае пачуццё, звязанае з вострым адчуваннем навакольнага свету, абудзіла паэтычны дар.

Дзе ж гэта ўсё адбывалася? На радзіме паэта. Мы добра ведаем гэту малую яго радзіму — вёску Мачулішча (што каля Халопеніч) Крупскага раёна Мінскай вобласці, якая знаходзіцца якраз у цэнтральнай частцы Беларусі. Прырода тут надзіва багатая і разнастайная.

Густыя лясы і пералескі, шырокія палі і заліўныя лугі, гаі і дубровы...

Праз Крупскі раён цячэ некалькі жывапісных рэчак. У паэме В. Зуёнка «Сяліба» ёсць радкі: «Дзве ракі, як дзве рукі, Сялібу абдымалі». Гэта рэчкі Эса і Нача, паміж якімі знаходзяцца родныя мясціны В. Зуёнка — яго «сяліба». Паэт навекі парадніўся з сваёй «сялібай», якая з першых год жыцця фармавала яго чалавечыя якасці, характар, увесь

лад душы, садзейнічала станаўленню ўласцівых яму здольнасцей і схільнасцей, выяўленню духоўнага патэнцыялу.

Родная сяліба паэта — месца гістарычнае: тут некалі праходзіў шлях «з вараг у грэкі». Падарожнікам даводзілася волакам адольваць водараздзел паміж Эсай і Начай.

Спрадвечная сялянская зямля...

Мачулішча...
Відаць, і пры Ярыле
Ільны ў нас сеялі,
Вымочвалі ў Мачыле.
Бель-кужаль пралі, ткалі, вышывалі,
Кашулі ў кайстры напамінкам клалі...

Так у паэзіі В. Зуёнка з'яўляецца вобраз зямлі-карміцелькі, зямлі-маці, зямлі-радзімы, якая дае пачатак жыццю, падтрымлівае чалавечае існаванне, захоўвае ключы да пазнання духоўных скарбаў.

Тут ён і нарадзіўся — 3 чэрвеня 1935 года ў сялянскай сям'і. Бацькі працавалі на гаспадарцы — аралі, сеялі, збіралі ўраджай. Сялянскую навуку ён спасціг раней, чым навучыўся складаць вершы. Быў і пастушком, і касцом, і аратым, і малацьбітом.

Касіць? Давай. Араць? Будзь ласкаў:
Трымала плуг рука мая...
У пяць цапоў — не ў ладкі — пляскаў
У тым, сорак чацвёртым, я.

У гэтых словах, у самім рытме, мне думаецца, захавалася натруджанае, але цягавітае дыханне хлебароба-малацьбіта, апладніўшае эстэтычную прыроду радка.

Ужо ў першых кнігах паэт не толькі расказвае пра землеробчы ўклад жыцця прыроднага асяроддзя сваіх землякоў, але разам з тым імкнецца заглянуць у свет іх перажыванняў, акрэсліць гістарычны лёс, карыстаючыся ўласнымі, непаўторнымі фарбамі. Здзіўляе яго мастацкі мазок — густы і шырокі.

Мачулішча —
блакіт палёў,—
Нябёс,—
Блакіт вачэй —
блакіт туманны
Слёз...

Мачулішча — месца, дзе замочвалі лён, які ў пару цвіцення нагадвае блакітнае воблака, што ўкрыла зямлю.

Мачулішча адначасова і назва вёскі, у якой нарадзіўся паэт...

Чаго-чаго, а слёз, вядома, хапала... Паэтычная асацыятыўнасць, набліжаючыся да праўды жыцця, уключае ў сябе сацыяльна-гістарычны змест, частка адлюстроўвае цэлае, ахопліваючы яго глыбінны чалавечы сэнс.

Сыну блізкай аказалася доля землякоў, але лёс, як бачым, выпаў іншы.

Пару дзяцінства азмрочыла вайна, якая потым не раз адгукнецца ў творах. Яна пакінула трагічны след у душы на ўсё яго астатняе жыццё...

У многіх вершах, прадыктаваных сучасным поглядам на рэчы, будуць прысутнічаць два планы — не толькі сучаснасць, але і ўспаміны пра цяжкую ваенную пару.

Толькі ў рэкі сняжніцу згоніць,—
Я шукаў цябе, цётка-кісліца,
Каб сустрэцца ў жывых сягоння...

Кісліца — заечая капуста, як яшчэ яе называюць у народзе, ёю ратаваліся людзі ад голаду...

Да вайны пайсці ў школу не давялося, але чытаць і пісаць навучыўся рана, яшчэ да школы.

У 1944 годзе прыйшло вызваленне, раскрыла дзверы Мачулінская пачатковая школа, якую Васіль Зуёнак скончыў фарсіраваным тэмпам — нешта за два гады. Тады ж захапіўся вершамі, пачаў пісаць сам. Сёння цяжка меркаваць, наколькі яны былі ўдалыя. Першыя свае «спробы пяра» юнак прынёс у райком камсамола, некаторыя вершы паслаў у газету «Літаратура і мастацтва». Прыйшоў адказ — раілі больш вучыцца.

Пасля заканчэння Узнацкай сямігодкі бацька Васіль Захаравіч адвёз сына ў Барысаў — там было педагагічнае вучылішча. Хлопец паступіў туды працягваць вучобу. На развітанне бацька даў некалькі чырвонцаў. «Потым,— гэта асабліва кранула сынава сэрца,— пастаяў, маўклівы, і, як бы нешта ўспомніўшы, выняў з кішэні яшчэ рубель, з тых, што адклаў на дарогу». Гэта запомнілася на ўсё жыццё: «Не ведаю цаны таму рублю: яна не вымерная...»

Таксама з вялікай удзячнасцю і да гэтага часу ён успамінае сваіх настаўнікаў — Міхаіла Станіслававіча Яўневіча, Ніну Сяргееўну Шалаеву, Яўгена Мацвеевіча Замерфельда і інш. Яны выкладалі беларускую мову і літаратуру. Але з не меншай цеплынёй ён гаворыць пра матэматыкаў Сяргея Цімафеевіча Хацько, Яўгена Станіслававіча Бродскага, біёлага Якава Дзямідавіча Кушніра, метадыста па педагагічным майстэрстве Марыю Георгіеўну Мазінг...

У Барысаве творчая дзейнасць маладога паэта працягвалася далей. Тут ён убачыў свае вершы надрукаванымі ў раённай газеце.

Пасля педвучылішча, з дыпломам выдатніка, ён апынуўся на аддзяленні журналістыкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Гэта была, зразумела, не абы-якая падзея ў яго жыцці — адбылася яна восенню 1954 года. Тут ён сустрэў новых сяброў. Побач, калі не ў адной аўдыторыі, дык у адным інтэрнаце аказаліся Вячаслаў Адамчык, Мікола Арочка, Рыгор Барадулін, Сымон Блатун, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Леанід Гаўрылкін, Ніл Гілевіч, Віктар Карамазаў, Арсень Ліс, Іван Пташнікаў, Барыс Сачанка, Янка Сіпакоў, Міхась Стральцоў, Іван Чыгрынаў і інш. І ўсе — будучыя пісьменнікі.

З самага пачатку універсітэцкай вучобы малады паэт апынуўся амаль што ў літаратурным асяроддзі. Тады ж, у 1954 годзе, упершыню выступіў з вершамі ў рэспубліканскім друку. Сябры хвалілі, падахвочвалі. Аднак гэтыя першыя, раннія выступленні не прыносяць задавальнення — голас гучаў яшчэ квола. Малады паэт адчувае, што здольны на большае.

Вучоба, студэнцкае жыццё пайшлі на карысць. Узмацнілася, узрасла патрабавальнасць да самога сябе.

Працяглы перыяд малады паэт маўчаў.

У аўтабіяграфіі пад назвай «Бачу з усіх сцяжын...» пра гэта гаворыцца:

«Лекцыі, спрэчкі на семінарах і ў інтэрнаце, канцэртныя залы, цярплівае карпенне ў чыталках — і адкрываліся скарбы мастацтва, і міжволі думалася пра сваю пісаніну: «Чым такая, хай лепш ніякай не будзе...»

Маўчанне было пакутлівае, але, здаецца, не бескарыснае».

Карысць, вядома, была. Карысць — ад чытання, роздуму, спрэчак з сябрамі. Аднак магчымасці паэта — і гэта ён зразумеў якраз тады — у нечым абмяжоўваў, рэгламентаваў сам час.

«Час, калі пачыналі мы ўсведамляць цягу да слова, не надта прыхільны быў да лірычнага самараскрыцця, як асновы паэтычнага адлюстравання свету. Нават будучы ўжо першакурснікамі універсітэта, сталі мы сведкамі праборкі, якую наладзіла куратарша нашай групы (хай ёй добра ікнецца — кандыдат філалагічных навук, выкладчыца рускай літаратуры) двум студэнтам: «ад няма чаго рабіць» тыя заняліся «штудзіраваннем» Блока і Ясеніна. Што датычыць мяне, то на сходзе тым я быў чысты, як анёл, бо не чытаў амаль яшчэ ні таго, ні другога».

Сапраўды, гэты час — першае пасляваеннае дзесяцігоддзе — негатыўна адбіўся на развіцці літаратуры. Слова пісьменніка, на жаль, вельмі часта губляла сувязь з праўдай жыцця, абмінала яго складанасці і супярэчнасці, ідэалізавала рэчаіснасць. У змрочнай абстаноўцы культу асобы ўзнікла так званая «святочная літаратура».

Паэты, у тым ліку беларускія, не жадаючы адстаць ад імклівага дня, аператыўна адгукаліся на яго падзеі, розныя даты, юбілеі, але не заўсёды маглі ўлавіць глыбінную шматгранную сувязь часу і чалавека. Не заўсёды адчувалася тое, што звязвае справу чалавека з яго душэўным светам, слова з учынкам, думку з паводзінамі, «грамадзянскае» з «маральным», «інтымным», мінулае з сучасным і будучым. Лірыка страчвала сваю спецыфіку, ператваралася ў другарадны жанр, быццам бы недарэчны ў такі суровы, напоўнены турботамі час.

Шкодзілі шматлікія рэгламентацыі і павучэнкі, штучныя рамкі і межы, якія скоўвалі творчую ініцыятыву пісьменніка. У такіх умовах цяжка было весці гаворку пра лірычнае самавыяўленне, ці лірычнае самараскрыццё, як называе яго В. Зуёнак. Між тым што, як не асоба аўтара, яго чалавечая сутнасць, цікавіць чытача ў самую першую чаргу!

Л. М. Талстой на гэты конт пісаў: «Па сутнасці, калі мы чытаем або сузіраем мастацкі твор новага аўтара, асноўнае пытанне, якое ўзнікае ў нашай душы, заўсёды такое: «Ану, што ты за чалавек?[1] І чым адрозніваешся ад усіх людзей, якіх я ведаю, і што можаш мне сказаць новага пра тое, як трэба глядзець на наша жыццё?» Аб чым бы ні гаварыў мастак: пра святых, разбойнікаў, цароў, лакеяў — мы шукаем і бачым толькі душу самога мастака»

Праблема лірычнага самараскрыцця — у чым яна заключаецца? Чаму яна мае такое вялікае значэнне для творчага станаўлення паэта? Таму — што азначае неабходнасць актыўнага стаўлення да рэчаіснасці, свабоднага і поўнага выяўлення асабістага «я» паэта. Вядома, сапраўднага паэта, які мае вострую патрэбу адкрыцца, выказацца, сказаць свету нешта самае важнае, усвядоміць галоўную задачу для сябе асабіста і для літаратуры ў цэлым.

Дадзім слова самому В. Зуёнку:

«Найпершае назначэнне мастацтва,— сцвярджае ён,— праз прызму мінулага і існага праектаваць будучае. Тварыць — значыць намячаць перспектыву, хаця б на адзін далягляд, на адзін гарызонт. Паэзія гіне там, дзе ўсё зараней прадвызначана, усё ўжо ясна і без паэта. Тады на дарозе яго стаіць не пакутлівы (і творча-радасны) ро-

---

[1] Толстой Л. Н. О литературе. М., 1955. С. 286.

здум, не гарэнне, не пошук ісціны, а ўсяго толькі каментарый, які вымагае больш-менш быць аздобленым атрыбутамі вершаскладання. Тады і з'яўляюцца творы, дзе толькі і відно шчырае імкненне перадаць увесь набор інфармацыі пра той ці іншы факт або падзею. Усё тут рассыпаецца, бо не змацавана адзінствам лірычнага перажывання».

Аднак паступова час мяняецца. У 1956 годзе адбыўся XX з'езд КПСС. Разам з XXI і XXII партыйнымі з'ездамі ён адыграў значную ролю ў ліквідацыі дапушчаных у перыяд культу асобы парушэнняў сацыялістычнай законнасці, аздараўленні грамадска-палітычнага жыцця ў краіне, абнаўленні духоўнага і маральнага «клімату», сцвярджэнні і пашырэнні ленінскіх норм і прынцыпаў савецкай дэмакратыі. «У сярэдзіне 50-х гадоў, асабліва пасля XX з'езда КПСС,— гаварыў на ўрачыстым пасяджэнні ЦК КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, прысвечаным 70-годдзю Вялікага Кастрычніка, таварыш М. С. Гарбачоў,— над краінай пранёсся вецер перамен, народ акрыяў, ажыў, стаў смялейшым і больш упэўненым».

Дабратворнае ўздзеянне гэтых працэсаў на развіццё мастацтва не падлягае сумненню. Дапытлівая думка мастакоў становіцца тварам да жыцця. З'яўляюцца такія творы, як камедыя А. Макаёнка «Выбачайце, калі ласка!» (1953), крыху пазней — апавяданні і нарысы А. Кулакоўская, І. Мележа, Я. Брыля, І. Шамякіна, В. Быкава і іншых пісьменнікаў, вершы П. Панчанкі, М. Танка, А. Куляшова і ўсіх тых, хто першым адчуў неабходнасць глыбокіх змен у літаратуры, закліканай быць голасам жыцця, адкрываць перад чалавекам перспектывы сацыяльнага і духоўнага росту.

Поспехі беларускай савецкай літаратуры, у тым ліку і на сучасным этапе яе развіцця, значныя, у яе шырокі ўсесаюзны рэзананс, а лепшыя творы набылі — як, напрыклад, кнігі Васіля Быкава,— сусветнае гучанне. Ад прозы не адстае паэзія. Раней паэты часта і беспадстаўна ідэалізавалі рэчаіснасць, абыходзілі нявырашаныя праблемы і вострыя канфлікты. Другая палавіна 50-х гадоў, а затым 60-я з'явіліся перыядам якаснага абнаўлення паэзіі, напаўнення яе рэальным жыццёвым зместам, вяртання да сваёй эстэтычнай спецыфікі, у значнай меры звязанай з лірычным самавыяўленнем асобы паэта, узмацнення яго грамадскіх пазіцый.

Паэтычны ўздым, які пачаўся ў другой палавіне 50-х гадоў, як і ўздым усёй літаратуры, шырока перадаўся 60-м гадам. Паэты разам з усімі імкнуцца ўвасобіць у словах, фарбах, гуках усё лепшае, што ёсць у чалавеку. Пры гэтым — у чалавеку звычайным, «радавым». Яны паэтызуюць яго духоўныя магчымасці, узвышаюць асобу, сцвярджаюць адзінства праўды, дабра і прыгажосці.

На пачатак і першую палавіну 60-х гадоў прыпадае асабліва інтэнсіўнае і плённае творчае развіццё і станаўленне В. Зуёнка.

У гэты час ён, паралельна з «дарослымі» вершамі, шмат піша для дзяцей.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Скончыўшы ў 1959 годзе універсітэт, малады журналіст пачаў працаваць у рэдакцыі газеты «Рабочае юнацтва» (Мінск), а неўзабаве перайшоў у «Піянер Беларусі». Што яго туды прывяло — у газету, якая выдавалася для дзяцей?

Думаецца, не ў апошнюю чаргу тая акалічнасць, што малады паэт якраз вельмі захапляўся дзіцячай паэзіяй. Гэта было, па ўсім відаць, даўняе захапленне, і яно «цягнецца» праз усё жыццё паэта, які добра памятае вядомую формулу В. Бялінскага: «Выхаванне — вялікая справа: ім вырашаецца лёс чалавека».

«Вясёлы калаўрот» — так Васіль Зуёнак назваў свой першы зборнік вершаў, які ўбачыў свет у 1965 годзе. Адрасаваны ён быў дзецям — дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

У пачатку 70-х гадоў газета «Зорька» звярнулася да яго з пытаннем: «Чаму вы рашылі пісаць для дзяцей?»

Адказ быў такі:

«Відаць, таму, што гэта вельмі весела і радасна. Ну, як бы тут растлумачыць прасцей? Уявіце, што раптам дарослы, сур'ёзны дзядзька атрымлівае кароткатэрміновую камандзіроўку ў дзяцінства. Вось, прыкладна, у такім стане знаходзішся, калі пішаш для дзяцей. Неяк самі сабою збягаюць немаведама куды пражытыя леты і зімы, адступаюць клопаты, карацей кажучы, цябе кліча дзяцінства. І ты ідзеш, зноў перажываючы тыя гады, успамінаючы сяброў, вясёлыя прыгоды. А разам з тым пытаешся: «А якія вы зараз, хлапчукі і дзяўчынкі? Што ў вас новенькага?..» З гэтай вось пераклічкі «а ў нас, а ў вас?..» і нараджаюцца вобразы вершаў, у якіх выступае ў адзіным сплаве і асабіста перажытае аўтарам, і падгледжанае сёння, сярод вас».

Раскрыўшы кніжку, малы чытач трапляе ў той свет, сярод якога праходзіць яго штодзённае жыццё.

Вы не бачылі, сябры,—
Зоркі выпалі ў бары!
Дзе ні глянеш,
                    на паляне —
Усё гарыць чырвоным ззяннем.
Пад лістамі, ля пянькоў —
Сотні зыркіх аганькоў.
Свецяцца карынкі —
Цёплыя смяшынкі,
Сонечныя дочкі —

Зваблівыя вочкі.
У бары, у бары
Дол увесь іскрыцца,
У бары, у бары
Выспелі суніцы!

К. Чукоўскі некалі раіў, каб у творах для малодшага ўзросту «ў кожнай страфе, а часам і ў кожным двухрадкоўі павінен быць матэрыял для мастака, бо мысленню малодшых дзяцей уласціва абсалютная вобразнасць. Тыя вершы, з якімі мастаку няма чаго рабіць, зусім непрыгодныя для гэтых дзяцей».

Верш В. Зуёнка якраз можа натхніць мастака. Шматфарбны свет, які адлюстраваўся ў ім, пераўтвораны паэтычнай фантазіяй аўтара. Будзённае, натуральнае становіцца незвычайным, святочным — і тут паэту дапамагае багатая метафорыка, якая перадае асаблівасці мастакоўскага ўспрымання навакольнай рэчаіснасці. У прыватным і канкрэтным ён бачыць другі план — праяўленне універсальных заканамернасцей быцця. Суніцы — гэта, аказваецца, згусткі сонечнага цяпла і святла, «жарынка, «сонечныя дочкі — зваблівыя вочкі».

Птушкі, звяры і дрэвы — жывёльны і раслінны свет — часам выглядаюць мудрэй і разумней за чалавека, які, на думку паэта, страціў многае з таго, што збераглі гэтыя хавальнікі першасных законаў быцця.

Любі прыроду, яна — тваё другое жыццё,— гаворыць аўтар свайму чытачу,— без яе тваё існаванне будзе ой якім сумным...

Другі план, другі абсяг — заўсёды прыцягваюць увагу паэта. Вось як выглядае звычайны калаўрот, пабудаваны дзецьмі на замерзшай сажалцы:

Лёд — як неба,
Лёд — з блакіту,
Спадарожнік —
Санкі,
І дарога — як арбіта,
Легла абаранкам.

Паэт імкнецца абудзіць фантазію свайго чытача, узбагаціць дзіцячае ўяўленне пра свет, знайсці для гэтага патрэбныя вобразы.

«Самыя кароценькія вершы або маленькія апавяданні для дашкольнікаў,— патрабаваў С. Я. Маршак,— павінны быць таксама завершаныя, як вялікая аповесць, як вялікі раман, як паэма». В. Зуёнак памятае пра гэта. Яго вершы для дзяцей пазбаўлены непатрэбнага мудрагельства і выкрутасаў, якія часам замінаюць некаторым

паэтам. Яны прасякнуты радасцю ўспрымання жыцця, тут ён адпачывае душой.

Разам з тым у вершах для дзяцей і ў развагах пра дзіцячую літаратуру выявіліся важныя рысы мастакоўскай індывідуальнасці В. Зуёнка, уласцівыя і для яго «дарослых» кніг.

«Нельга брацца за дзіцячую літаратуру,— піша ён,— з сэрцам халодным, раўнадушным, не ведаючы таго чарадзейнага слова, ад якога ажываюць самыя звычайныя рэчы, становяцца сябрамі дзіцяці птушкі, звяры, дрэвы.

Шмат у нас пішуць для маленькіх. Але цуд гэтакі сустрэнеш не часта. Многія вершы будуюцца па схеме што на што падобна.

Ля абочыны пажар,
На дарозе лісцяў жар.
Ліска збочыла з дарогі:
Апячэш яшчэ тут ногі,—

вось і ўся «мудрасць». Здалося паэту, што лісце — гэта жар (хоць яно даволі цяжка ўяўляецца) — і вершык гатоў. Нават пахваліць можна — усё быццам прыгожа, незвычайна. Але няма тут галоўнага — чалавечай душы. Паспрабуем сябе паставіць на месца лісы — здасца нам што-небудзь такое? Наўрад. I ў гэтым — фальш. Надуманасць твора, ён не ачалавечаны.

Адсутнасць жывых чалавечых характараў перавандроўвае і ў многія творы для старэйшага ўзросту».

У 1969 годзе выйшла другая кніга для дзяцей — «Жылі-былі пад вадой», напісаная з выкарыстаннем матываў беларускіх народных казак. Разлічана яна на самых маленькіх, для якіх аўтар умее знайсці адпаведны тон і інтанацыю, адчувае патрэбу дзяцей у камічным.

Жылі-былі пад вадой
Дзед з зялёнай барадой
I бабуля, што ўсім рыбкам
Па начах люляла зыбку.
Да мяне прыйшлі яны —
Вадзяныя баюны;
Слухаў я і ўслед пісаў...
Што?
Чытай, будзь ласкаў, сам.

У «дарослых» вершах паэта адсутнічала іронія, у творах для дзяцей яна ёсць. Іронія, жарт, усмешка — прыкметы той ачалавечанасці, якой патрабуе В. Зуёнак ад твораў для дзяцей. Зрэшты, сам ён ніколі не абмяжоўваецца адным толькі жартам. За жартам абавязкова ёсць нешта сур'ёзнае і важнае, ён умее адшукаць паэзію ў

штодзённых клопатах дзіцяці, яго радасцях і турботах, узаемаадносінах з равеснікамі, імкненнях і спадзяваннях, якія знаходзяць яскравае мастацка-вобразнае ўвасабленне ў паэтычных творах.

У яршыстага ярша
Шмат сяброў было спярша.
«А нашто? — падумаў ёрш.—
І без іх не будзе горш».
Наяршыўся ёрш яршом,
Зубы камнем-галышом
І калючкі натачыў: —
Марш, маляўкі, пад карчы!
Паразбегліся сябры...
Ёрш адзін...
І дзень, і тры...
І няма з кім паспрачацца,
І няма з кім праімчацца.
Уператанкі...
І каму
«Добры дзень» сказаць яму?..
Ходзіць ёрш сам не свой:
Хоць ты ў вір галавой...

Такія вершы — без ценю дыдактызму — здольны дапамагчы малому чытачу ў яго роздуме над чалавечымі паводзінамі і ўзаемаадносінамі, пашырыць жыццёвы вопыт.

Натуральна і нязмушана раскрывае ён унутраны свет і дзіцяці, і падлетка, іх схільнасці, умее адчуць у сваім маленькім героі характар, яго жаданні і імкненні, прагу справядлівасці, праўды, дабра.

Розныя паводле сваіх характараў Сымон і Клім з верша «Як Сымон даваў разгон». Псіхалогія таго часу, які перажыла краіна ў так званы перыяд застою, не магла не адбіцца і на справе выхавання падрастаючых Пакаленняў. Дапамагаючы адстаючаму аднакласніку Сымону дагнаць выдатнікаў, Клім, аднак, праследуе свае, вузкакарыслівыя мэты...

Выдатна напісаны верш «Лясны будзільнік» — пра сонечны зайчык, які — уявіце сабе! — заблудзіўся і застаўся нанач у лесе...

Эстэтычнае ў дзіцячых вершах В. Зуёнка арганічна знітавана з маральным, ідэйным. Паэт — дбалы, заклапочаны выхавацель падрастаючага пакалення. Супраць чалавечых недахопаў звернуты вершы «Гоша-грыбнік», «Чэмпіён», «Мы», «Ну а вы?». Сур'ёзнаму пытанню — неабходнасці вучыцца, набываць веды, пашыраць кругагляд — прысвечаны верш «Цемната» і многія іншыя, у якіх расказваецца пра

жыццё нашага сучасніка, раскрываецца прыгажосць чалавечых адносін, свет роднай прыроды.

Удачай В. Зуёнка ў галіне дзіцячай паэзіі з'яўляецца кніга яго дасціпных загадак «Сонечны клубочак» (1974). Загадкі ў яго спалучаюць паэзію і гульню, будзяць у дзяцей цікавасць да навакольнага свету.

Не толькі вершы пісаў ён ў 60-я гады для дзяцей, але і нарысы, замалёўкі,— з цягам часу, на пачатку 60-х гадоў, яны склалі кніжкі: «Любіць прыроду — любіць Радзіму» (1962), «Працай славіцца чалавек» (1963).

В. Зуёнак піша для дзяцей і зараз. У 1987 годзе выйшаў зборнік вершаў «Хата, поўная гасцей» — выбранае для дзяцей. Усе мы адтуль — з краіны маленства...— яшчэ раз нагадвае ён. Кантакт з маленькім чытачом узбагачае паэта эмацыянальна, пастаянна вяртае да зямных спраў з іх жывой канкрэтыкай, да «наіву», павышае творчую адказнасць.

Падарожжа ў дзяцінства працягваецца...

## ПАРАДОКС ПАЭТА

Кантакт з «дарослым» чытачом напачатку даваўся, відаць, цяжэй. Справа ў тым, што паэт не хацеў фарсіраваць сваё творчае выспяванне, як гэта часам рабілі і робяць некаторыя маладыя ў мэтах эпатажу публікі. В. Зуёнак папярэджвае:

Дні — колавыя спіцы,
А час — агонь-рысак.
Стрымай,
стрымай,
вазнічы,
Фурманку-паражняк...

Па-майстэрску дасціпнай формай гэтых радкоў аўтар падтрымлівае мастацка-паэтычныя пошукі свайго часу. Паглядзіце, як ён графічна — «горкай» — пабудаваў радок «стрымай, стрымай, вазнічы», быццам бы і сапраўды па ім з усё нарастаючай хуткасцю коціць парожняя фурманка.

Але ўсім зместам верша адстойвае больш глыбокую канцэпцыю мастацкай творчасці, права паэта на непаспешлівасць, грунтоўнасць творчага пошуку, вынашанасць думкі і пачуцця.

Першы зборнік «дарослай» лірыкі пад назвай «Крэсіва» з'явіўся ў 1966 годзе.

За год да яго выхаду равеснік Зуёнка Рыгор Барадулін (пачыналі некалі разам) пісаў пра свайго сябра:

«Мне вельмі хочацца сказаць некалькі слоў пра паэта, які пакуль што не мае ніводнага зборніка, паэта, якога ведаю вось ужо дзесяць год, паэта, чые вершы для мяне заўсёды сустрэча з нечым чыстым, родным, наскім, беларускім.

Працяглы час паэт маўчаў. Гэта непакоіла. А раптам назусім выпусціў са стайні свайго Пегаса? На шчасце — не! Набіраў сілы, выходзіў на арбіту — і выйшаў!

Як заўсёды, «хросным бацькам» быў Анатоль Вялюгін,— падборка ў «Полымі», у гэтым старэйшым гарніле нашай паэзіі, у гарніле, дзе набываюць гарт вершы і абпальваюць кволае крылле вершыматылькі»[1]

Сапраўды, надрукавацца ў «Полымі» для маладога паэта заўсёды было вельмі важна,— значыць, недзе на падыходзе ўжо і першая кніжка...

Зборнік «Крэсіва» адкрываўся наступным вершам:

---

[1] Дзень паэзіі. Мн., 1965. С. 86-87.

Мільёны год,
мільёны год
Да сонца
З цемені ірвуся.
Мільёны год,
мільёны год
іду.
Іду —
І не спынюся.
На ніве смерці і жыцця
Мне вечна
юным быць аратым,
Бо ўсіх пачаткаў
я — працяг
І ўсіх працягаў
я — пачатак.

Прызнацца, гэта неяк адразу азадачыла: адкуль такая «пазачасавая» рамантычная пастава лірычнага героя — «мільёны год, мільёны год...»?

У чым справа?

Гаворачы пра творы В. Зуёнка для дзяцей, мы адзначылі імкненне аўтара, не адрываючыся ад жывой, эмпірычнай канкрэтыкі навакольнай рэчаіснасці, шукаць і знаходзіць «другі план», закліканы дапамагчы разгадаць сэнс штодзённага чалавечага існавання. Ён нібыта ўзнаўляе нейкі старажытны міф пра вечнага аратага, міф, які ў сваім духоўна-практычным значэнні дайшоў да нашых дзён, блізкі нам сваім высакародным сэнсам.

Чаму блізкі?

Таму што за гэтым «вечным аратым» адчуваўся наш сучаснік — жывы чалавечы характар як сукупнасць устойлівых уласцівасцей і зменлівых адносін, якія складаюць пэўнае біясацыяльнае адзінства, што знаходзіць выяўленне і адлюстраванне ва ўсім жыццёва-вытворчым укладзе чалавека.

Нездарма ў першай кнізе паэт, імкнучыся пазнаць асновы чалавечага існавання, заяўляе:

Зямля —
мая аснова.

Тут — шматзначная думка: канкрэтная зямля, глеба, на якой расце жыта, і зямля — улонне чалавечай цывілізацыі, жыцця.

Сучасны чалавек ва ўспрыняцці В. Зуёнка — фігура маштабная. Гэта — вечны чалавек, вечны і заўсёды малады працаўнік, творца, якому падабаецца такая «пасада» на зямлі.

Такім — неабмежаваным сваім вузкаасабістым «я» — як паэт — ён і нарадзіўся... Інтэнсіўнае самасцвярджэнне абвастрыла пачуццё формы, стылю, рушыла наперад паэтыку, абумовіла яе метафарызм і асацыятыўнасць, зварот да іроніі і гратэску, выкарыстанне ўмоўнасці і нават некаторую празаізацыю радка.

Цікава зараз перачытваць першыя зборнікі нашых знакамітых паэтаў — кожны з іх пачынаў па-свойму.

Маштаб, узбуйненне, гіпербалізацыя ў В. Зуёнка не супярэчаць праўдзе жыцця, у адлюстраванні якога ён імкнуўся да шырокіх абагульненняў, да стварэння ёмістых умоўна-асацыятыўных вобразаў.

Ралля — аснова,
Зерне ўток няспынна
Кідаю я рукою агрубелай,—
І тчэцца,
тчэцца мудрая тканіна —
Жыццё...

У тым жа першым зборніку прысутнічала і другая стылявая тэндэнцыя. Думаецца, не менш гаварылі пра паэта, пра яго характар і настроі і такія вершы, як «Добры прыезд», «*** Я сябра кожнай птушцы...», «Вясновая казка», «Стары цецярук» і інш. Ужо ў гэтых вершах звяртае на сябе ўвагу глыбокае і дакладнае веданне побыту, прадметнасць апісанняў, нейкая сялянская ўгрунтаванасць і непаспешлівасць.

Вяртаецца студэнт з горада на канікулы, а спёка стаіць страшэнная. Палявая дарога «гудзе як брук».

...павысмяг глей на грэблі,
Над жытам вісне пыльная смуга,
А сонца паліць,
смаліць, непатрэбнік,
Не тоўпіцца духоцце ў берагах...

У нас будзе яшчэ не адна магчымасць звярнуць увагу на цудоўнае мастацтва паэта — талент жывапісаць словам, маляваць, перадаваць праз мастацкі вобраз стан навакольнага свету. Зараз размова пра іншае. Тут, у вершы «Добры прыезд», той самы лірычны герой, толькі, калі можна так сказаць, у іншай сваёй «іпастасі» — больш прыземлены, звычайны. Нават нягледзячы на тое, што студэнту давялося прадстаць перад землякамі-аднавяскоўцамі ў якасці

«бога-грамавержца»: у яго прыезд дадому выпаў — на радасць усім — дождж!

І забуяла радасцю зямля ўся,
І землякі-дзядзькі навесяле
Гукаюць мне:
— З прыездам добрым, Вася!
І я хаджу прарокам на сяле.

Вобраз лірычнага героя тут пазначаны нават пэўнымі аўтабіяграфічнымі рысамі — у ім мы пазнаём маладога паэта, самога В. Зуёнка, што прыехаў пераведаць бацькоў.

Паэт не толькі не пазбягае аўтабіяграфізма — ён нават падкрэслівае яго. «Я» паэта не нейкае ўмоўнае, чыста сімвалічнае: «я» — гэта ён сам (у адрозненне, скажам, ад «вечнага аратага», пра якога ішла гаворка вышэй).

«Зразумела, лірычнае «я» не заўсёды патрабуе ад аўтара, каб ён абавязкова апіраўся на дакументальна-дакладныя, анкетныя падрабязнасці сваёй біяграфіі. Унутранае жыццё паэта ці героя нярэдка знаходзіць выражэнне ў фактах небіяграфічных, аднак яны садзейнічаюць стварэнню цэласнага вобраза, асабліва калі паэт імкнецца ўспрыняць і асэнсаваць гэты факт праз сваю асабістую біяграфію. Аўтабіяграфічнасць у такім сэнсе з'яўляецца важнейшым прынцыпам паэзіі. Крыніцай самавыяўлення для паэта становіцца яго ўнутраны свет, які выступае ў адзінстве з навакольным светам сацыяльнага жыцця. Паглыбляючыся ў свае самыя запаветныя, інтымныя хваляванні і трывогі, ён раскрывае не толькі сваю душу, але і душу сучаснага чалавека, у асабістым знаходзіў агульнае, і наадварот, агульнае, чужое «абжываў» як асабіста сваё.

Аднак лірычны герой В. Зуёнка разам з тым аб'ектывізаваны, у многім тыповы вобраз — у ім абагульнена шмат такога, што ўласціва не для аднаго толькі паэта, але і для шматлікіх прадстаўнікоў яго пакалення — выхадцаў з вёскі.

Гаворка ідзе пра своеасаблівую дыялектыку, якая вызначае сувязь паміж асабістым і агульным, канкрэтным і тыповым, суб'ектыўным і аб'ектыўным у паэзіі. Вядомы савецкі літаратуразнавец Л. І. Цімафееў пісаў:

«Усялякая творчасць у шырокім сэнсе слова аўтабіяграфічная, і кожны вобраз звязан з жыццёвым вопытам і светаадчуваннем мастака, але ў мастацкім творы ён заўсёды пераўтваран у параўнанні з прататыпам.

Яшчэ Гётэ гаварыў, што ў яго творчасці няма ніводнай рысачкі, якая не была б ім перажыла, і разам з тым ні адна з іх не выражана так, як была перажыта паэтам» [1]

Вобраз «вечнага аратага» таксама перажыты В. Зуёнкам, блізкі яму. Ён, калі хочаце, складае сутнасць філасофскай канцэпцыі яго лірычнага героя.

Але паэта неадольна вабіць зямная канкрэтыка. Хіба можа задаволіць яго адно толькі ўмоўнае «я», калі ён такі шчыры і непасрэдны.

Я сябра кожнай птушцы,
Ва ўсіх —
наперахоп:
Заве глушэц у пушчу,
Бакас — на расцяроб,
А салаўі — на спеўку,
А жаўранкі — у рунь.
Прыходжу я знячэўку,
Ніхто не мчыцца ўгрунь...

Гэты чалавек выдатна ведае навакольны свет вясковага ўлоння, усіх яго насельнікаў. І першае, што заўважаеш у лірычным героі В, Зуёнка,— гэта яго разумнасць і дабрыня, якія праяўляюцца ў вялікім і малым, нават у тым, «каб гнёзд не астудзіць». У яго перажываннях шмат свайго, уласнага, асабістага, нават інтымнага, што захавала «памяць босых ног», успаміны дзіцячых і юнацкіх год.

Вядома, што першыя кнігі звычайна не абыходзяцца без слабых мясцін і асобных, менш удалых твораў, рытарычных радкоў. Такія радкі, добра пашукаўшы, напэўна, можна было знайсці і ў «Крэсіве».

Але пераважала іншае! Здзіўляла свабода і раскаванасць пачуццяў і перажыванняў, адкрытасць чалавечай душы. А дзе ўсё гэта лепш адчуеш, як не пад дахам бацькавай хаты!

Гэтак спалася добра!..
Сп'янелы, ляжу на гарышчы.

Такім шырокім і вельмі сімпатычным эмацыянальным жэстам пачынаецца «Вясновая казка», у якой паэт запрашае ў госці да сябе... яблыньку, што плыве аблачынкай пад акном роднага дома.

У В. Зуёнка — сялянскага сына, які нарадзіўся і ўзрос на ўлонні прыроды,— гэта гучала вельмі міла і арганічна.

---

[1] «Литературная газета». 30 окт. 1963 г.

* * *

Паралельна пісаліся гумарыстычныя вершы, якія ў 1973 годзе склалі зборнічак «Качан на п'едэстале». Аўтар, аказваецца, шматгранна адораны талент з вельмі шырокім спектрам эстэтычных адносін да свету. З добрай усмешкай ён расказвае пра свой студэнцкі чамадан, які яму служыў і сховішчам для кніг, і буфетам, і крэслам (калі даводзілася дабірацца дамоў на папутным «газіку»). Вершаваны эцюд «Летнія ямбы» — гэта замалёўкі гарадскога лета: пляж, стадыён, магазін. Але паэту ўсё ж такі бліжэй вясковае лета.

Мне ў леце люба сталасці пара:
Камбайнаў спелы і паважаны рокат,
Ільноў купанне ў сонечных вірах,
А на таках — мяхі па-брацку
упокат.

Такія вершы характарызуюцца выразнасцю паэтычнай думкі, прастатой і даходлівасцю мастацкіх вобразаў.

Крыніцай творчасці для яго стала душэўнае, маральнае пачуццё, талент адгукацца на вялікія і малыя праявы жыцця. Вось верш, напісаны ў далёкім юнацтве:

Над лесам —
Заводскія гмахі,
У неба —
Труба з размаху.
Не знаю,
Хто клаў там цагліны,
Ды надпіс
Ён добры пакінуў.
І бачаць усе здалёку:
«Мама!»
І бачаць усе:
высока
Мама!

У такіх творах таксама праяўлялася мастакоўская назіральнасць аўтара, здольнасць адкрываць паэзію ў навакольнай рэчаіснасці, пабач. Вельмі натуральна, што гэткія вершы прысутнічаюць у першым зборніку, у значнай меры абумоўліваючы, так сказаць, лірыка-апавядальную стылявую тэндэнцыю ў творчасці паэта.

Такім чынам, у паэзіі В. Зуёнка ўжо на самым пачатку прасочваліся дзве стылявыя тэндэнцыі: маштаб і падрабязнасці быцця.

Адзначаныя напрамкі пошукаў не рэдка збліжаліся і ўзаемапранікалі, узбуйняючы паэтычны вобраз і адначасова паглыбляючы яго

рэалістычны змест, дапамагаючы раскрываць духоўны свет лірычнага героя, сцвярджаць яго жыццёвыя каштоўнасці.

Гэта адбілася на ўсіх творах, уключаючы і тыя, якія былі звязаны з тэмай Вялікай Айчыннай вайны. Роздум пра народны подзвіг знаходзім у вершах «Помнік», «*** З вайны сустрэлі мацяркі сыноў...», «*** У прымыльніку — мыліцы і пратэз...», прасякнутых жалобай і смуткам і нянавісцю да вайны.

Кранае вобраз маці, якая стаіць, скамянелая, над магілай сына, у вершы «Помнік», пазначаным уплывам фальклору. У ім адлюстраваўся спрадвечны лёс жанчыны-сялянкі, якая ўжо згубіла надзею вызваліцца ад накопленага за векі гора.

А вось партрэт былога салдата:

У прымыльніку — мыліцы
і пратэз,
Нага са скрыпам хромавым...
Не пусціў гаспадар,
без яе палез
На палок дубовы, стогромавы.
Сячэ гаспадар —
то па левай, то па...
І раптам венік зрываецца...
Дваццаць год,
як на дзве не ступаў,
Дваццаць год — памыляецца.
Паслухай, пратэз, не крыўдуйся, брат.
Хоць ты служака і верны —
Не лезь у вочы,
калі на палку салдат:
І без цябе душу пераверне.

Гэтая замалёўка кранае глыбокім дэмакратызмам і экспрэсіўнасцю пачуцця. Перажываемыя паэтам пачуцці нараджаюць незвычайныя, трагічныя па сваім змесце, вобразы-абагульненні, за якімі паўстае цяжкі зямны шлях чалавека.

Ужо той першы зборнік адкрыў такую каштоўную ідэйна-эстэтычную якасць паэзіі В. Зуёнка, як народнасць, і тут яму дапамагае апора на фальклор, які з'яўляецца эстэтычнай асновай многіх твораў і дапамагае аўтару сцвердзіць маральную сутнасць свайго героя. Яго мастацкі свет па многіх прыкметах блізкі да фальклорнага ўспрымання рэчаіснасці (фальклорныя «токі» адбываюцца на глыбокім «капілярным» узроўні), аднак гэта свет нашага сучасніка, узброенага і ўзбагачанага веданнем многага з таго, што стала даступна ў наш час.

Маё сэрца
у жыце б'ецца
Перапёлчыным боем.

Герой гэты, як бачым, селянін. Сялянскае для паэта тоесна агульначалавечаму. З гэтаю рысай светапогляду і светаўспрымання паэта звязаны яго інтэлектуалізм і філасафічнасць, якія грунтуюцца не толькі на асабістым вопыце паэта, але і на вопыце цэлых пакаленняў яго землякоў. Адсюль афарыстычнасць яго радка:

«Жыву сяўбой, бяру сяўбой».

Інтэлектуальнасць у яе чыстым выглядзе, калі перамагае голы рацыяналізм, развага, не ўласціва беларускай паэзіі, пачуццёвай, «плоцевай» па самой сваёй зямной прыродзе. У вершы В. Зуёнка гарманічна ўзаемадзейнічаюць думка і эмоцыя.

Калі б нараджэння не знаў я,
Дык стаў бы, напэўна, нарогам
І поле ўзараў бы.
Жытнёвым бы зернем упаў я
У цёплую, ціхую глебу
І рунню б узяўся.
На ніву сасмяглую
летам
Праліўся б гаючай, жывучай
Вадою...

Верш хвалюе гэтай вось знітаванасцю асобы паэта са светам, своеасаблівым пантэізмам, прасякнутым глыбока чалавечай думкай і клопатам.

У свядомасць паэта ўключаецца ўвесь свет — у гэтым адчуваўся, відаць, уплыў Э. Межэлайціса, А. Вазнясенскага і іншых паэтаў, якія звярталіся да так званых касмічных матываў, умелі ўзбуйняць паэтычны вобраз. Гэты своеасаблівы лірычны манументалізм і ў далейшым будзе прысутнічаць у творчасці В. Зуёнка, у яго мастакоўскім успрыняцці жыцця.

Ніхто не пачуў:
Яблык упаў дасвеццем —
Ля Халопеніч,
на Беларусі.
Ніхто не пачуў —
Ні людзі,
ні травы,
ні вецер...
Ніхто.

А шар зямны
Здрыгануўся...

Верш сведчыць, што паэт пачаў задумвацца аб вельмі істотных рэчах, хоць часам і стоеных пад знешнім покрывам жыцця. Аказваецца, усе — не толькі самыя «значныя» — падзеі маюць права на ўвагу і «рэагаванне» з боку паэта. Любая простая з'ява тоіць у сабе ўнутраную значнасць, вартую чалавечага пазнання і водгуку. З першай кніжкі можна было пераканацца, што гэта не кніга пачаткоўца,— голас паэта гучаў натуральна, шчыра. Разам з тым лірычны герой меў патрэбу ў большым «зазямленні», набліжэнні да рэальных праблем і клопатаў, напаўненні паэтычнага слова большым сацыяльным зместам.

## З НАБОРАМ ВЫШЫНІ

У 1966 годзе Васіль Зуёнак уступіў у рады КПСС. Прадаваў у часопісе «Маладосць» — намеснікам рэдактара. Тут панавала атмасфера Пімена Панчанкі, які незадоўга перад гэтым рэдагаваў часопіс.

П. Панчанка — адзін з самых выдатных беларускіх паэтаў з пакалення 30-х гадоў, франтавік, які прайшоў доўгі і горкі шлях вайны. Сапраўдны паэт-грамадзянін, надзелены значным жыццёвым і мастакоўскім вопытам. Вастрыня пастаноўкі сацыяльна-маральных пытанняў у яго творах прасякнута глыбокім лірызмам і пасапраўднаму грамадзянскай Страснасцю.

Мікраклімат, які стварыўся ў рэдакцыі «Маладосці», спрыяльна ўплываў на В. Зуёнка. У яго паэтычную свядомасць разам з жыццёвым вопытам рана ўвайшла думка аб складанасці жыцця і аб тым, што яго трэба і ўспрымаць ва ўсёй яго рэальнай праўдзівасці.

Ужо ў першым зборніку былі гэтыя мудрыя радкі:

Калі б так проста
кахалася,
Калі б так проста
раджалася,
Калі б так проста
жылося...
Калі б так проста
спявалася,
Калі б так проста
ўзляталася,
Калі б так проста... —
Навошта...

Паэту адкрываецца шматмернасць жыцця... У 1969 годзе ўбачыла свет другая кніга вершаў «Крутаяр», якая развівала лірычны характар, закладзены ў першым зборніку, і з'явілася новым пераканаўчым доказам таго, што аўтар вельмі моцна трымаецца за свой сялянскі грунт, які складае галоўнае ў яго духоўна-практычным вопыце.

«Асноўны яе матыў,— пісаў А. Вярцінскі,— памяць вясковага дзяцінства, роднай вёскі» («Полымя». 1970. № 2. С. 198). У многім гэта сапраўды так, хаця тэматычна кніга вельмі разнастайная. Аднак усе закранутыя тэмы (вайна, рэвалюцыя, сучаснасць, барацьба за мір, каханне...) даюцца праз успрыманне вясковага чалавека, які многае перажыў і ведае цану жыццёвым каштоўнасцям, бо і сам шмат перажыў. Ля парога бацькавай хаты ляжыць спрацаваны камень ад старых Жорнаў.

Ад яго —
пачынаюцца ўсе дарогі...
Сцяжынкі ў мураве,
першапуткі сіберныя,
Гравейкі, сівыя ад пылу,
выбоістыя,
Магістраляў грымотны разбег,—
Я звязаны вашымі нервамі
З зямлёю —
ад полюса і да полюса.
Мембранай
трасецца камень...
Плач...
Смех...

Другая кніга сведчыць пра душэўную адкрытасць аўтара, здольнасць на эмацыянальны водгалас, на суперажыванне. У лірычных вершах выяўляюцца думкі і пачуцці людзей працы, стваральнікаў чалавечага шчасця і дабрабыту, услаўляецца прыгажосць родных краявідаў, вернасць народным традыцыям. Творы, якія ўвайшлі ў зборнік «Крутаяр», перадаюць водар густых мачулінскіх бароў на радзіме паэта, прыгажосць вясковага ўлоння («Фантазія скошанага лугу»), спаконвечны кругазварот у прыродзе, самаадчуванне чалавека, які ўжыўся ў гэта сваё асяроддзе.

Карціна вясенняга абуджэння намалявана ў вершы «*** Нібы за стол бяседны...». Сярод дзейных асоб тут і дзед-лясун, і гракі-манахі, і «лектары лясныя — салаўі...». З вялікай любасцю абжывае, адухатварае ён чароўны свет беларускай прыроды, сцвярджаючы сваю ўнутраную роднасць з ёю.

Паэзія В. Зуёнка абапіраецца на ўласнае разуменне і ўспрыняцце свету, у якім «травінкі ў лёдзе» і «ўзнацкі шлях», які вядзе ў родную вёску, летні гром і соль, якую здабываюць з шахтаў,— займаюць сваё натуральнае і незаменнае месца.

У словах чутны бурлівасць ручаёў, пошум ветру, крык жураваў у прасторы палёў, гоман лесу. Пры гэтым вельмі важна адзначыць, што навакольная прырода ў паэзіі В. Зуёнка звязана з унутранай прыродай яго лірычнага героя, абумоўліваючы яго натуральнасць і чалавечнасць. «Ахвярнік прашчурскіх бароў» — кажа пра яго паэт.

У вобразах прыроды ён, як і, скажам, А. Фет, выказвае свет сваёй душы, аднак гэтая тэма выяўляецца у іх па-рознаму. У А. Фета, пры ўсёй яго псіхалагічнай заглыбленасці і лірычнай пранікнёнасці,

нейкага асабліва дакладнага ведання прыроды няма, хаця суперажыванне аўтара стану прыроды незвычайнае.

У В. Зуёнка карціны прыроды амаль што дакументальна дакладныя.

Чарнатроп.
А ўзверх —
навасёлам
Легкадумны гарэза-снег...
*(«Зазімак» )*

Праўдзівасць ва ўсіх дробязях і дэталях...

Чытаючы кнігі беларускага паэта, успамінаюцца словы сучаснага малдаўскага пісьменніка Іона Друцэ: «У прынцыпе ўсе мы з вёскі,— піша ён у аповесці «Бярозы, хлеб і мужнасць»,— і ўсе нашы продкі — хто бліжэй да нас, хто далей — самі аралі і сеялі. У падсвядомасці кожнага гараджаніна жывуць яшчэ навыкі хлебароба — сутнасць толькі ў тым, наколькі глыбока сядзяць у тым ці іншым чалавеку яго вясковыя карэнні. А сядзяць яны часам нечакана глыбока». В. Зуёнак даўно стала жыве ў Мінску, але родная вёска ўладна цягне да сябе. Кожнае наведванне родных мясцін ён успрымае як святочны падарунак. Не, ён не супрацьстаўляе горад вёсцы, але тым не менш, будучы цвярозым рэалістам у сваіх поглядах на жыццё (бываюць рэалісты і сярод паэтаў!), выразна адчувае разрыў паміж сучаснымі горадам і вёскай. Але, нягледзячы на дынамізм сучаснага свету, герой В. Зуёнка не губляе сувязі з пачаткамі свайго фізічнага і духоўнага існавання. Яму па-ранейшаму ўласціва непаспешлівасць, некаторая замаруджанасць думкі і рытму, кантралюемыя эмоцыі, стрыманасць, аднак не сакрэт, што радок стаў больш спавядальным і ў большай ступені наблізіўся да псіхалагічнай праўды чалавечага перажывання.

На сэрцы — неспакою камень:
А раптам я паміж сяброў
Хаджу — апошні магіканін,
Што вылез з прашчурскіх бароў?..

Пытанне на сённяшні дзень зусім не рытарычнае.

Паездка ў вёску для яго нешта незвычайнае.

«Дадому еду...» — Ды такое ж ніколі я
Пра сваю 21-ю не гаварыў...

«21-я» — гэта нумар гарадской кватэры паэта, якой ён, вядома, удзячны за жыццёвы прытулак і хатнюю ўтульнасць. (Пачуццё ўдзячнасці за дабро — наогул важнейшае ў маральным спектры яго героя.)

Сюды на плячах цягну сваю стому,
Тут радасці, крыўды мае і пацехі,

Тут ноч
трыбуналіць маўклівым громам.
Калі аўтобус «не па графіку
ехаў...».
Бываюць жа адступленні...
А так маршрут пэўны:
21-я — работа, работа — 21-я зноў.
Дзень у дзень.

Прыезд у вёску для паэта — як доўгачаканае выключэнне з гэтага аднастайна заведзенага ходу рэчаў, як свята душы. ён нават падкрэслівае:

Я заўсёды люблю прыязджаць знянацку.
Я ж не ў госці, каб ладзіць пад пэўны час...

Верш заканчваецца адназначным вывадам:

Іншага дому няма.
Нідзе.

Вядома, сёння такое катэгарычнае меркаванне здаецца нам у нечым і наіўным, аднак у ім глыбокая праўда душы і сэрца, якімі паэт звязаны са сваёй сялянскай «краінай Маравіяй».

У вёсцы на старажытным пагосце засталіся магілы бацькоў. Бацька Васіль Захаравіч памёр восенню 1954 года, маці Куліна Канстанцінаўна перажыла бацьку на трыццаць пяць год — яе жыццёвы шлях завяршыўся ў 1989-м.

А восень пяцьдзесят чацвёртага
Забірала апошні вырай:
Адлятаў ён —
Навекі.
Суседзі рупна кідалі
Зярнят залатую надзею,
І рунню зялёнай яна
засталася —-
Навекі...
*(«Ты пайшоў...»)*

Восенню сяляне сеялі азіміну. Ужо без Васіля Захаравіча...

«Зярнят залатая надзея» — які цудоўны (ізноў жа сялянскі) вобраз — засталася з сынам-паэтам назаўсёды.

Любоў да бацькі, вернасць бацькоўскім запаветам гучаць у вершы «*** Прыйдзі аднойчы...», які ўспрымаецца як удзячнасць бацькам, як прачулае, гарачае сцвярджэнне ідэі пераемнасці пакаленняў, непарыўнасці духоўнай сувязі, якая існуе паміж імі.

Сялянская аснова не звужае грамадскія далягляды паэта і не збядняе яго патрыятызм таму якраз, што яны звязаны з асабіста перажытым і выпакутаваным. Такіх вершаў у кнізе «Крутаяр» шмат.

Я знаю хлеб.
Было ладункаў! —
З сурэпкай, з конскім шчаўлюком,
Я карой, з чырвонаю мядункай
Ды з жалудовым крупчаком.
З сухой скарынкаю ваеннай,
Што, як шынелік той,— лубком,
З бензінным духам пасля змены,
З вясельным сонечным хмяльком...
Пракіслы, ёлісты, гаркавы —
За ўсё на свеце саладзей
Здаваўся шчасця цёплы кавал...

Гаворка ідзе пра нястачы ваеннай пары. Верш вызначаецца яскравай вобразнасцю, багаццем мовы, шчырасцю і эмацыянальнасцю. У ім, як і ў іншых творах, прысвечаных перажытаму ў час вайны, выяўлена пазіцыя чалавека, жыццё якога супала з вялікімі выпрабаваннямі, што выпалі на долю нашага народа за гады вайны і ў пасляваенны перыяд, ён шануе ўсё, што звязана з паняццямі Радзіма, Праца, Мір. Звяртае на сябе ўвагу строгасць думкі, нешматслоўнасць у выяўленні пачуццяў, прастата і стрыманасць паэтычнага радка, глыбокі падтэкст.

Тэма гераічнага подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны прысутнічае ў яго творчасці, пачынаючы з першага зборніка. Вайна са сваім трагізмам і героікай, драматызмам і самаадданасцю фарміравала светаўспрыманне паэта і ў многім вызначыла яго сучасны погляд на рэчы. Яго лірычны характар — характар гераічны, бескампрамісны, гатовы на самаахвяраванне ў імя людзей і жыцця.

Асабіста перажытае аўтарам усведамляецца ім не толькі як асабістае — яно дазваляе ўзняцца да шырокіх абагульненняў.

Я веру ў хлеб, як у людзей.
Хвала прамудрасці гіпотэз!
Але —
табою я сагрэт,
Здабыты мазалём і потам
Прапрашчураўскі запавет.
Мой дзень,
малю цябе прад небам:

На тым, апошнім, рубяжы
Спрадвечны цуд зямнога хлеба
Наступнікам перакажы!

Сялянскасць не пярэчыць шырыні і маштабнасці перажыванняў, якія ў яго дасягаюць агульначалавечай заклапочанасці.

Яшчэ б люляць зямлю ў пялёнках
Людскіх турбот, людскіх надзей...
А хтось гвалтоўна і шалёна
Ёй бомбу на плячо кладзе.
Трымай!
Трымай, хоць цела млее,
Нясі, пакуль бікфордаў шнур —
Цяжкая памяць —
не датлее —
І выбухнуць мільёны бур!..

І, нарэшце, самы непасрэдны, прамы зварот, падмацаваны ўсёй сілай агульнанароднай памяці:

...Зямля мая!
А можа, хопіць
Ісці да вогненнай мяжы?..
Бушуй сабе
гарачым чэравам,
З глыбінь вяршыні узнімай!
Ды помні пра дарогу
з чэрвеня
У светлы той
і горкі май.

В. Зуёнак адчуў вялікія сацыяльныя супярэчнасці нашага стагоддзя, і гэта не магло, як мы ўжо казалі, не адбіцца на яго паэтыцы. Маштабнасць успрыняцця рэчаіснасці прымушае ўспомніць У. Маякоўскага, уласцівае яму майстэрства спалучэння розных планаў, калі ёмістасць мастацкага абагульнення не толькі не выключае канкрэтызацыі жыццёвых з'яў, падзей, прадметаў, але нават і абумоўлівае яе. Творчае засваенне традыцый У. Маякоўскага добра відаць у вершы «*** Люблю цікаваць...», у якім адчуваецца эстэтычная сувязь з вядомым вершам рускага паэта «Незвычайны выпадак, які адбыўся з Уладзімірам Маякоўскім летам на дачы».

Вось пачатак верша В. Зуёнка:

Люблю цікаваць
неўпрыкметі, здалёк,
Як сонца

промнем, бы ніткай вашчонай,
Прысеўшы ў бары на смолкі пянёк,
Сшывае два полагі — белы і чорны.

Развіццё думкі рухаецца вобразна-асацыятыўным шляхам.

...Вось так і ў мяне —
турбот
аж кішыць,
Сонца — па рупнасці — брат мой.

Справа, вядома, не ў тым ці не толькі ў тым, што там і тут гаворка ідзе пра сонца («Светить всегда, светить везде..» і «Сонца — па рупнасці — брат мой»), а ў мастацка-тыпалагічнай блізкасці, смеласці паэтыкі, імкнення да гранічнай выразнасці.

Аднак разам з тым трэба мець на ўвазе, на наш погляд, і тое, што ўплыў Маякоўскага большай часткай адносіцца да галіны мастацкай формы, абумоўленай буйнамаштабным планам паэтычнага мыслення. Як мастак В. Зуёнак ніколі не ішоў і не ідзе за пасіўным, апісальным капіраваннем рэчаіснасці, абмяжоўваючыся знешнім падабенствам. Наадварот, ён адчувае за сабой права шырока карыстацца сімволікай, умоўнасцю, гіпербалай, якія з'яўляюцца ў яго мастацкім сродкам дзейснага асэнсавання і адлюстравання рэчаіснасці.

Уласцівы Маякоўскаму прыём апрадмечвання метафары знаходзім у вершы В. Зуёнка «Жарт пра вясновы настрой»:

...на маладзіку
Вунь —
сядзіць і гайдаецца —
Вясновы настрой мой.
Крычу блазнюку: —
Злазь!
— Пачакай да раніцы!..

Свабодная, натуральная інтанацыя і фразіроўка — тут таксама можна адчуць павевы выдатнага рускага савецкага паэта.

Што ж датычыцца зместу, то вобраз сонца ў беларускага паэта ідзе таксама і ад народнай, фальклорнай традыцыі, паводле якой сонца трактуецца як нястомны працаўнік, руплівец, дабрадзей.

Разам з тым у Зуёнка адчуваем, магчыма, не зусім усвядомленую палеміку з Маякоўскім, які, як вядома, часам з залішнім нігілізмам ставіўся да культурнай спадчыны мінулага, недаацэньваючы яе ствральнае значэнне.

Пазіцыя В. Зуёнка здаецца нам у гэтых адносінах больш канструктыўнай.

Я тут, на зямлі, каб мінулае сшыць

З будучым моцнаю дратвай —
Барознамі ў полі,
пракосамі траў,
Істужкамі рэк, зберажоных ад
згубы...

Другая кніга «Крутаяр» засведчыла, што паэзія Зуёнка — на варце жыцця, якое немагчыма без пераемнасці, без захавання «залатой ніткі» гісторыі — «каб глыбіня любові і памяці не дрыгвянела». У яго за ўсім гэтым няцяжка заўважыць прыкметы рамантызацыі рэчаіснасці, аднак рамантызм у дадзеным выпадку не азначае адмаўлення ці адыходу ад сапраўднасці ў нейкія бясконцыя далі. Наадварот, ён прызнае і сцвярджае сапраўдную рэальнасць як рэальнасць паэтычную.

У вершы «*** Ноч разліта ў кубы-кватэры...» ён уяўляе сябе чарадзеем-рамантыкам, які ідзе па зямлі, аберагаючы жыццё, шукаючы замовы ад таго,

...каб кужаль
Не рабіўся зноў
чорным сцягам,
Не ўпіваўся дымам пажарышч,
Каб пратэз, што калека
нацягвае,
Зелянеў дубком над імшарай,
Каб свінец, што па кулях
раздзелен,
Манументам узнёсся да неба,
Каб збыліся
усе надзеі...—
Што ж яшчэ
чарадзею
трэба?..

Ужо ў першых кнігах В. Зуёнка намецілася тое адзінства свету асабістага, «прыватнага», свайго і свету знешняга, агульнага, якое затым стане яго асноўным творчым прынцыпам. У гэтым сэнсе зборнік «Крутаяр» быў, на нашу думку, значным крокам наперад, у многіх творах шырока і пераканаўча праявіўся дэмакратызм паэта, яго павага да праўды жыцця, здольнасць бачыць паэтычнае ў звычайным і прывычным для ўсіх.

## ШЛЯХ ДА ПАЭМЫ

Паэзія В. Зуёнка рознымі шляхамі, але ўвесь час развіваецца па лініі ўзбагачэння духоўнага свету лірычнага героя. Пра гэта, між іншым, сведчыць любоўная лірыка паэта, адзначаная высокай культурай унутранага пачуцця.

Узоры інтымнай лірыкі знаходзім у зборніку «Крутаяр». Вось як гэты, напрыклад, напоўнены пяшчотай зварот да каханай:

Буду
садам тваім па вясне.
Буду
ў полі сцяжынкай забытай:
Перапёлка
на золку засне —
Прыбягай дажынаць сваё жыта.
Буду
цёплаю муравой
На тваіх лугах-сенажацях,
Буду
ў Нёмана сіні сувой,
Як русалку, цябе спавіваць я,
Буду
раніцай лёгкім дымком
Над страхой тваёй віцца у просінь,
Буду
ціхім дамавіком
Сны жаданыя ў хату прыносіць.

Які россып паэтычных дыяментаў!

Лірыка кахання дапамагае глыбей і паўней адчуць і пазнаць багацце душы і прыгажосць чалавечых адносін у іх унутранай паўнаце і шматграннасці. У каханні чалавек выпрабоўваецца на вернасць і высакароднасць, яно — фермент чалавечай жыццядзейнасці.

Паэтычны свет В. Зуёнка, адлюстраваны ў яго лірыцы 60-х гадоў, прасякнуты непадробнай сапраўднасцю — сапраўднасцю чалавечых пачуццяў. Пра гэта сведчыць не толькі працытаваны верш. Вельмі плённым этапам росту, інтэнсіўных пошукаў і адкрыццяў сталі для В. Зуёнка, як і для іншых беларускіх паэтаў, не толькі 60-я гады, але і перыяд 70-х (нягледзячы на з'явы застою), калі паднялася цана на сапраўднасць пачуцця, вызначылася перспектыўная тэндэнцыя: ад «зерняў праўды» — да «праўды зерня», да новай, больш глыбокай канцэпцыі рэчаіснасці. Найбольш чулыя паэты ўжо не маглі зада-

вальняцца «зернем праўды», абаяннем непасрэднасці. Эмпірычнае засваенне новых з'яў уступае месца імкненню паэтаў улавіць сутнасць сучасных канфліктаў. У дзверы літаратуры стукаецца — на новым узроўні сталасці — другая праблематыка, звязаная з вялікімі «быційнымі» пытаннямі чалавечага існавання. Паэзія паўстала перад неабходнасцю даследаваць сэнс і сутнасць таго, што адбываецца, пазнаць заканамернасці, глыбінныя прычыны і сувязі сучасных канфліктаў, прадугадаць і адстаяць будучае (адсюль, між іншым, яе зварот да ўмоўных форм). Узнікла вострая патрэбнасць на значныя мастацкія абагульненні, яркія характары, у якіх маглі б адлюстравацца тэндэнцыі часу.

З цягам часу праўдзівасць карціны рэчаіснасці, адлюстроўваемай у літаратуры, павялічваецца і паглыбляецца. Доказ таму — паэтычная творчасць В. Зуёнка і многіх яго калег. Аднак у сувязі з гэтым хацелася б сказаць і пра іншае.

Творы сапраўднай паэзіі (як і літаратуры ў цэлым) каштоўныя і цікавыя не толькі тым, што яны адлюстроўваюць жыццё грамадства, падзеі гісторыі, паказваюць лёс людзей пэўнай эпохі, выяўляюць сацыяльныя праблемы і сацыяльную псіхалогію, але і тым, што яны ўвасабляюць духоўныя якасці і духоўную біяграфію самога аўтара — сведкі і ўдзельніка гэтых падзей. Непаўторныя асаблівасці творчай індывідуальнасці В. Зуёнка складае талент у сукупнасці з духоўна-практычным вопытам, ідэйнымі поглядамі і перакананнямі.

У сапраўднага паэта ёсць свая духоўная біяграфія.

Што гэта такое — духоўная біяграфія?

Каб усвядоміць гэтае паняцце, папярэдне трэба адказаць на пытанне, што такое духоўнасць. З пункту гледжання псіхалогіі, духоўнасць — функцыя другой сігнальнай сістэмы. Філасофія лічыць духоўнасць катэгорыяй грамадскай. У аснове духоўнасці ляжыць здольнасць чалавека суадносіць сябе, свой народ з іншымі людзьмі, светам. Гэта форма яго індывідуальнай арыентацыі ў свеце. Духоўную біяграфію маюць пісьменнікі, якія ставяць перад сабой значныя творчыя задачы — «заданне неба», як кажа Л. Ляонаў. Яго даводзіцца выконваць страсным напружаннем усіх душэўных сіл, на якія толькі і можа быць здольны сапраўдны мастак.

70-я гады, першая палавіна 80-х і наступны перыяд у паэзіі адзначаны паглыбленнем характару яе духоўнасці. Яна ўбірае ў сябе магутныя пласты народнага вопыту, адчуванне прыроды, уключае філасофскае асэнсаванне праблем жыцця і смерці. Экспрэсія і страсць апладняюць змест паэзіі як і раней, але адначасова з'яўляецца і нешта новае. Думка становіцца больш філасафічнай, дапамагаючы паэту

пазнаць усеагульную сувязь з'яў, жыццядзейнасць чалавечага духу. У якасці аб'екта паэзіі ўсё часцей выступае не асобны факт, бытавая дэталь, выпадак, а сукупнасць фактаў, важная праблема часу. Паэзію займае пытанне аб сэнсе жыцця, аб тым, у імя чаго людзі жывуць, працуюць, змагаюцца, імкнуцца, пераадольваюць цяжкасці, аддаюць свае сілы і нават часам само жыццё. Такі аб'ект паэтычнага асэнсавання патрабуе актывізацыі мастацкай думкі, падключэння ўсіх духоўных магчымасцей чалавека з апорай на багацце і мудрасць гістарычнага вопыту народа.

Жыццёвы лёс В. Зуёнка (пра гэта ўжо часткова гаварылася) і яго духоўная біяграфія, пошукі адлюстраваліся ў яго паэтычных зборніках. Прыкметным крокам у гэтым сэнсе стала кніга «Сяліба» (1973), якая ўключала вершы і паэму аднайменнай назвы. Гэта кніга яшчэ больш наблізіла яго да надзённых жыццёвых пытанняў, турбот і клопатаў. У вёсцы з'яўляліся хаты з зачыненымі дзвярыма і вокнамі, забітымі дошкамі, зводзіліся коні, як «нерэнтабельныя», вочы людзей засцілаў п'яны чад. Паэт, вядома, бачыў змены, але ўсёй сваёй жыццёвай фактурай у яго паэзію яны не ўвайшлі. Ды, можа, і патрэбы такой не было. Як-ніяк, перад намі паэт-лірык, настроены больш на роздум, самавыяўленне, чым на «апісанне» свету. Куды важней іншае: яго паэзія ўжо не можа абмежавацца мілай непасрэднасцю пачуццяў, знешнім сцвярджэннем дабраты і гуманнасці, якія самі па сабе, безумоўна, прыгожыя. Паэт ідзе ўглыб. Узнікае неабходнасць уважлівей даследаваць рэальны змест гэтых катэгорый, разам з павышэннем грамадскай актыўнасці паэзіі ўзрастала яе імкненне да аналізу, да філасофскай медытацыі.

Паміж сэрцам маім і трывогай —
Як сцяна — два крутыя парогі:
За адным —
        дзе спагаду б чэрпаць —
Абжываецца хіжая чэрствасць,
За другім —
        дабрата людская
Ні на крок ад сябе не пускае...

Вядома, паэзія на баку дабра. Паэт уяўляе сябе «штодзённым драбільшчыкам каменя». Яго задача — «чэрствасць біць, што чарсцвела вякамі».

Я прашу вас, добрыя людзі,
Шчодрасць ваша хай гнеўна судзіць:
Прakляніце,
        з парога —

ганіце,
Дзе дарога лягчэй — не кажыце,
Покуль гэтымі вось рукамі
Не скрышу сваёй чэрствасці камень...
Пыл на крылах вятроў развею,
Ля дарогі жыта пасею...

За радком, у падтэксце, заўсёды прысутнічае пытанне, як жыць, і імкненне адказаць на яго.

Аўтабіяграфія В. Зуёнка «Бачу з усіх сцяжын...», якую мы ўжо цытавалі, напісана ім ў 1970 годзе. Гэта быў час актыўнай працы над кнігай «Сяліба», час пошукаў і роздуму.

Самае цікавае ў паэзіі гэта, відаць, вечныя тэмы, удумлівая засяроджанасць над якімі надае сэнс самому працэсу творчасці, узбагачае яго духоўна.

Паэт смела ўключаецца ў спаконвечны роздум-спрэчку аб жыцці і смерці. Смерць не ўсёмагутная — па-свойму даводзіць ён. Гаворка ідзе пра верш «***Як лёгка наперад глядзець...».

...Далонь у тугіх мазалях,
Часоў супярэчнасць,
На шыбах трапічная стынь,
Акраец жытняга хлеба —
Не маюць апошняй вярсты:
Паўторыцца ўсё пад небам.

Гэта толькі пачатак развяг. Філасофская думка набірае разгон, развіваецца далей, адольваючы ўсё новыя і новыя кругі мастацкага пазнання, не страчваючы свайго эмацыянальнага зместу.

Паўторымся, можа, і мы,
Ды толькі не будзе спаткання:
Час, як страла, прамы
Не знае вяртанняў.
Між зор,
між палёў —
кватаруй —
Нязнанай планеты полюс...
Не скажаш,
не крыкнеш:
«Даруй»,—
Не ўчуе ніхто і ніколі.
Усім,
каго ў сэрцы насіў
І горам азмрочыў чорным,—

Як тысячы Хірасім —
Адно застанецца:
УЧОРА...

І усё ж такі паэт знаходзіць у сабе сілы, каб не даць чалавеку разгубіцца, вярнуць яго да жыцця, якое будзе мець свой працяг у наступных пакаленнях.

...Час, не віхурся ж дарма,
Сэрца маё пераворвай!
Шчодры рабі засеў —
Не позна яшчэ!
А потым —
Хай б'ецца да сёмага поту:
Людзям дабрату нясе.

Зуёнку не ў меншай ступені, чым іншым паэтам і пісьменнікам старэйшых пакаленняў і равеснікам, рупіць задумвацца над сэнсам і тайнамі чалавечага жыцця, смерці, гісторыі, над «чалавечымі якасцямі», ад якіх залежыць лёс прыроды, лёс планеты. Знешне яго вершаваныя формы часта выглядаюць традыцыйна, нават старамодна (у параўнанні, скажам, з так званымі сучаснымі «метаметафарыстамі»), але гэта толькі на першы погляд. Асаблівасці формы ў Зуёнка строга падпарадкаваны змястоўным задачам. Лірычнае дзеянне падкрэсліваецца, узмацняецца сродкамі гнуткай, выразнай, па-сапраўднаму экспрэсіўнай паэтыкі.

Яго вершаваным медытацыям уласцівы ўнутраны драматызм.

Устаньце, мёртвыя тыраны
Усіх народаў і эпох!..
І вы, што не прайшлі па рангу,
Хоць дужа вабіў той парог.
Злягайце з будучых прастолаў,
Сыноў і праўнукаў багі...
Ірву бясплатна і вясёла —
Бяссілля вашага кругі!

На ўсё распаўсюджваецца ўлада тырана, але якраз па гэтай прычыне сам ён, на думку паэта, не можа з'яўляцца свабодным чалавекам. Ідэал паэта — свабодны чалавек, «не закайданены разбоем, зладзействам, подласцю, крывёй».

Вам, толькі вам не знаць свабоды.
Тыран — нявольнік з веку ў век.
У сведкі клічу ўсе народы:
Я — самы вольны чалавек!

Паэт звычайна хоча паставіць з'яву ў сістэме свету, асэнсаваць яе месца і ролю ў гэтай сістэме, як мага паўней раскрыць маральна-псіхалагічны і палітычны вопыт сучасніка. Чалавек у яго не толькі частка грамадства, але і частка прыроды і гісторыі, пачуццё адзінства, з якім з'яўляецца адной з прадумоў яго свабоды. І яшчэ — працавітасць, напоўненая высокім духоўным сэнсам.

Я знаю бога!
Я малюся
Усясільнай працы, хлебу на стале,
Рукам мазолістым —
Малюся!

*(«Пачатак»)*

Лірычнае перажыванне паэта — спавядальнае па сваёй сутнасці. У асобе лірычнага героя перакрыжоўваюцца і арганічна спалучаюцца прыватнае і агульнае, мінулае, сённяшняе і будучае. Адсюль грунтонасць мастацкай канцэпцыі і той «запас трываласці» ў яго вершах, які адзначыў у адным з артыкулаў А. Грачанікаў («Літаратура і мастацтва», 1969. 31 кастр.).

Паэт імкнецца прасачыць лёс каштоўнасцей народнага жыцця, створаных стагоддзямі,— у сучасны «машынны век».

Век машынны пачаў забывацца,—
Век машынны, напомніць дазволь:
Што такое мазольная праца,
Што такое, урэшце, мазоль...

Такія і падобныя матывы часта сустракаюцца ў яго вершах, выступаючы кожны раз у новым, нечаканым мастацкім абліччы.

Вясковая тэма заўсёды шмат значыла для яго. «Прыходзіць хлеб у хаты. Ён ад зямлі, а з ім ўсё — гасціны, заручыны, вяселлі, парадзіны, і геній, што ў стагоддзях уваскрэсне...» Ён перакананы: «сэнс жыцця — у працы», тут паядналіся для яго практычны і духоўны пачаткі, сялянскае і мастакоўскае.

У вершы «Песня» гучыць трывога за лёс «зялёнага гаю» і «салаўёў надрэчных», якіх цяпер можна пачуць хіба што з грамафоннай пласцінкі ці магнітафоннай стужкі. Запісаны на дыскавым крузе спеў салаўя яшчэ нешта гаворыць таму, хто чуў яго ў натуральных умовах. А таму, хто не чуў?

Аб чым ты, круг, раскажаш сыну?
І што — калі не адвяду
Ад той апошняй, салаўінай,
Ад песні — тапароў бяду?..

Тут, думаецца, маецца на ўвазе не толькі песня салаўя, але і народная наша песня, над якой таксама навісла пагроза забыцця. На гэты конт думка паэта гучыць строга адназначна. «Народ, мова, літаратура,— падкрэслівае ён,— гэтыя паняцці нельга раз'яднаць, нельга паставіць паасобку ў гістарычным працэсе. Штучны разрыў аднаго звяна вядзе да вынікаў катастрафічных» («Літаратурам мастацтва». 1986. 20 крас.).

Шмат гаворыць пра В. Зуёнка як паэта верш «Змярканне». Уявіце сабе чалавека, які адвячоркам, калі аціх руплівы працоўны дзень, выйшаў у жытняе поле, услухаўся ў яго цішыню.

Усюды лад, усюды згода
І цішыня
на той мяжы.
Над полем спелым
хлебны водар
Бушуе, быццам у дзяжы.
Ад неба вечнасцю таемнай —
Калі прад ім ты толькі сам —
Сурова вее.
І нядрэмна,
Адточана,
звініць каса,
Што над табой была узнята,
Калі адчуў ты першы раз
Вось гэту вышыню над хатай,
Адчуў, як зоры важаць час...

Тут ізноў маем справу з лірычнай медытацыяй, філасофскім маштабам паэтычнага мыслення. Аўтар выразна перадае духоўна-псіхалагічны стан свайго героя.

І вось —
прад Космасам халодным,
Дзе ходзіць вогненная раць,
Стаіш —
бяссільны і свабодны...

Гэтыя словы — «бяссільны» і «свабодны», парадаксальна стаўленя побач, даюць неабходны ўнутраны аб'ём, смеласць думкі.

О, як жа,
як жа паміраць,
Калі не ўбачыш больш ніколі,
Як з гэтай цёплай цішыні
Выходзіць месяц на прыволле,

Не затуманены ані,
Як, сонца ўскінуўшы за плечы,
У золь бяроз, у сінь асін
Пайшоў — не адгукнуўся вечар...
Ці не было яго
зусім?..

Жыццё, паводле паэтычнай філасофіі В. Зуёнка, вышэйшы дар. Яго нельга разменьваць на дробязі, пакінуўшы ў баку «універсальныя» духоўныя ісціны, якія далучаюць чалавека да жытняга поля, зорнага неба, бясконцасці сусвету, высокаму маральнаму ідэалу.

Адсюль пачуццё вечнай удзячнасці «равеснікам ваеннага ўзросту», якія засталіся па той бок жыцця, адкуль «не вяртаюцца дахаты» і якім мы абавязаны шчасцем і радасцю жыцця.

Расой чырвонай апаліў траву
Хтось за мяне ў той чорнай крутаверці.
Чым адплаціць, што я жыву?
Жыву,
Хаця маімі
стаць маглі
ўсе смерці.
*(«Роздум»)*

Духоўная актыўнасць паэта праяўляецца вельмі разнастайна. Часам немагчыма нават вызначыць тэму верша — паэт імкнецца да ўсебаковага і глыбокага ахопу рэчаіснасці, якая знаходзіць адбітак у яго лірычным перажыванні, у ёмістым, багатым на эстэтычныя адценні слове.

Верш, які так і называецца,— «Слова» прысвечаны Рыгору Барадуліну. Працытуем яго поўнасцю.

Усё размерана на свеце:
Радзіны і хаўтурны звон,
Святы спакой і ліхалецце,
Пяшчоты слодыч і праклён.
Не падуладна толькі слова
Халоднай пэўнасці акоў.
Яго бунтарныя высновы
Вастрэй адточаных штыкоў.
Яго судзілі і каралі
З упартай мудрасцю аслоў.
Яно прайшло праз дні і далі
І ў новых сэрцах прарасло.
Якім агнём яно заззяе,

Які пад ім успыхне знак —
Ні я, ні ты — ніхто не знае...
Давай памолімся, аднак:
Займайся на заходзе, ранак!
У студзені крышыся, лёд!
Будзь, як маланка, нечаканы,
Неразгаданых слоў палёт!

Цікавасць да слова ў В. Зуёнка не толькі філалагічная. Слова — з'ява універсальнага парадку, якая ўзыходзіць да сівой даўніны.

Украінскі паэт — Паўло Моўчан — адзін з удзельнікаў дыскусіі аб сувязях літаратуры з фальклорам, што вялася ў канцы 70-х гадоў на старонках часопіса «Вопросы литературы»: «Слова — рэзервуар, які папаўняецца зместам часу. Слова — міф. Гэта зразумела. Але слова ў песні, у казцы стварала, у спалучэнні з другімі словамі, яшчэ больш аб'ёмныя міфы. Пашыраўся кантэкст слова, пашыраўся і міф. Слова было справаздачай чалавека пра сябе і пра свет. Першапачаткова кожная з'ява ў свеце патрабавала новага слова, ішоў працэс актыўнай словатворчасці. Калі чалавек перастаў тварыць слова, пачаўся працэс творчасці словам: яно стала зброяй думкі, якая выяўляла новы змест жыцця. Міфатворчасць — гэта другі этап, другая ступень ва ўзвышэнні чалавека. Да міфатворчасці перш за ўсё адносіцца фальклор, ад якога адпачкавалася літаратура. Усё тут узаемазвязана, адно жывіць другое».

У В. Зуёнка цяжка знайсці твор, дзе б гэта сувязь не праяўляла сябе ў самай поўнай меры — праз сакаўное, знятае з народных вуснаў слова, здольнае бесперапынна абнаўляцца сённяшнім жывым перажываннем.

П. Моўчан, відаць, улічваў вопыт сучаснай беларускай паэзіі, калі пісаў, працягваючы сваю думку: «Фальклор пастаянна жывіць літаратуру, таксама як слова бясконца жывіць паэзію. Вобраз — слова — міф — літаратура — вось звенні ланцуга, пастаянныя, непарушныя»[1]

Міфа-паэтычная свядомасць — своеасаблівая ступень у развіцці (на новым вітку «спіралі») сучаснай беларускай паэзіі. Старажытныя паэтычныя погляды і вераванні беларусаў застаюцца для В. Зуёнка вобразатворным эстэтычным матэрыялам, ён майстар своеасаблівага паэтычнага «калажа»: вобраз, узяты з сівых пластоў старажытнай міфалогіі і фальклору, паэт умее паставіць у сучасны кантэкст. Тым самым паглыбляецца змястоўнасць і паэтычная прывабнасць верша.

---

[1] Мовчан П. Возвращение ради обновления // Вопросы литературы. 1978. № 3. С. 72.

Лірыка яго становіцца разнастайнай у жанравых адносінах. Паслабляецца апавядальнасць верша, узмацняецца своеасаблівая лірычная адвольнасць, якая ўключае элементы оды, элегіі, балады адначасова.

Адчувалася, што паэт узняўся да новага ўзроўню сталасці.

## ПРА НАШУ СЯЛІБУ

Галоўнае ў кнізе складала паэма «Сяліба», якую аўтар пісаў на працягу 1965-1970 гадоў, Яна вядзе нас далей у свет народнага жыцця.

Ужо ў першай кнізе В. Зуёнка паявіліся матывы, звернутыя ў гістарычнае мінулае. Яны атрымалі працяг і развіццё ў паэме «Сяліба». У дачыненні да гэтай паэмы можна гаварыць не толькі пра наяўнасць гістарычных матываў, але і пра сцвярджэнне гістарызму як важнейшага прынцыпу мастацкай творчасці. У паэме па-новаму ставіцца пытанне аб традыцыях і наватарстве, яна мае філасофска-публіцыстычны характар, скіраваны на пазнанне і раскрыццё маральна-этычных, духоўных каштоўнасцей чалавека. «Сяліба» — гэта сціслая гісторыя роднага краю. Калі гаварыць канкрэтна, дык размова ў ёй ідзе пра ўзаемаадносіны чалавека з прыродным ландшафтам, грамадска-сацыяльным і культурна-экалагічным асяроддзем.

Паміж чалавекам і прыродай, як вядома, адбываецца пастаянны абмен рэчываў, які ў пэўным сэнсе рэгулюе грамадскую вытворчасць. Без такога абмену было б немагчымым само чалавечае жыццё (гл.: К. Маркс і Ф. Энгельс. Соч. Т. 23. С. 51, 514). Чалавек і прырода — адно цэлае. Паэт набліжаецца да думкі, што асновай іх існавання павінна быць узаемная згода і гарманічнасць. Пра гэта нагадваў (у той жа, прыкладна, час — другая палавіна 60-х гадоў) А. Куляшоў у сваім шырокавядомым вершы «Сасна і бяроза»: «А што, як зямлю нашу выпусцяць з рук сасна і бяроза?»

У XX стагоддзі развіццё гістарычнага працэсу набыло асабліва паскораны тэмп. Мяняецца сацыяльнае, эканамічнае, палітычнае аблічча грамадства, па-новаму складваецца лёс цэлых народаў. Войны, рэвалюцыі, міграцыі насельніцтва... Прыродны свет, здавалася б, застаецца ў цэлым без змен — але толькі да таго моманту, пакуль чалавек не пайшоў у «рашучы» наступ на прыроду. Пад уплывам гэтых дзеянняў прырода пачала змяняцца хутчэй нават, чым гісторыя. Зрэшты, гісторыя таксама не адставала...

Паэма пачынаецца з завязкі, своеасаблівага «зачыну»:

Я памяць крэсліў
безліччу дарог,
Я памяць засціў
стромамі падзей...

Пачуццё «сябра кожнай птушцы» прывілося аўтару «Сялібы» з дзяцінства, аднак з цягам часу, з гадамі яго «прыродныя» адчуванні, безумоўна, нашмат узбагаціліся. Паэт адчуў небяспеку для ўсяго

чалавецтва з боку тых, хто атручвае зямлю, паветра і ўсё экалагічнае асяроддзе стронцыем, іншымі небяспечнымі рэчывамі, а таксама псуе, руйнуе воблік планеты накапленнем розных суперсучасных відаў узбраенняў, ад якіх ідзе рэальная пагроза вайны, знішчэння ўсяго жывога.

Ідуць дажджы.
                А птушкі млеюць
І нема падаюць на дол.

Гэтыя радкі мы прачыталі яшчэ ў першай кнізе — «Крэсіва».

Дождж — дарунак нябёс, заступнік жыцця — ператвараецца ў нешта зусім супрацьлеглае. Свет поўны супярэчнасцей. Неабходнасць абароны прыроды мысліцца беларускім паэтам у адзінстве глабальных намаганняў чалавека ў барацьбе за сусветную гармонію.

Некалі — у сярэдзіне 60-х — у вершы, прысвечаным салігорскім шахцёрам, ён з захапленнем пісаў:

Соль,
                соль у клецях
Ляціць з-пад зямлі.
Соляцца нашы душы,
Соляцца нашы плечы,
Нашы палі!

У ім узрадаваўся хлебароб. Але прайшоў час. Цяпер мы гаворым пра «ўрокі Салігорска», якія вучаць многаму, у тым ліку і таму, як трэба любіць родную зямлю і ставіцца да яе багаццяў.

Паэма «Сяліба» хвалюе актыўнай любоўю і крэўнай прывязанасцю паэта да роднай зямлі. Аўтар хоча ўнесці ў чалавечыя адносіны да зямлі і яе багаццяў, да нашай вялікай спадчыны разумны пачатак. З гэтай мэтай ён бярэ на сябе смеласць раскрыць сапраўдную сутнасць усяго таго, што адбывалася. Драматычныя падзеі, пра якія расказваецца ў паэме, вызначаюць рух аўтарскай думкі. Гаворка, як далей высветліцца, не толькі пра прыродны, так сказаць, ландшафт у яго матэрыяльна-практычным выяўленні, а і аб праблемах больш ідэалагічнага, духоўнага парадку.

Паэма мае падзагаловак: «Дыялог праз гады і ростані». Аўтар імкнецца прасачыць з'яву ад яе вытокаў. Нягледзячы на тое, што апавядальна-падзейны сюжэт у «Сялібе» не вельмі распрацаваны (там-сям сустракаем недагаворанасць, намёкі), ён ставіць на мэце раскрыць сацыяльную матываванасць экалагічнай этыкі сваіх персанажаў.

На першых старонках паэмы «Сяліба» ён згадвае свайго далёкага продка язычніка-ліцвіна-першапраходца гэтых лясных мясцін, які асвойваў іх для свайго жыцця.

Дуброву спляжыў вогненнай касой
І кінуў на гарэлле
жменю семя.
Затым на ўсход схіліўся —
Сонцу слава!
На захад —
пакланіўся Перуну.
Жытло зляпіў.
З ліцвінкаю бялявай
Абжыў за ноч глухую старану.

Паселішча атрымала найменне — Сяліба, у пэўным сэнсе сімвалічнае, бо пад ім можна разумець і ўсю Беларусь, і нават нешта яшчэ больш шырокае.

Падзеі, што адбываюцца ў паэме, з самага пачатку набываюць эмацыянальную экспрэсіўнасць і драматычную вастрыню. Лірычны герой паэмы, ад імя якога вядзецца размова,— наш сучаснік, але гэта ў поўнай меры гістарычны чалавек, ён далёкі нашчадак таго лавіна, які абжываў Сялібу. Яго можна лічыць другім «я» паэта, параднёным з ім і паходжаннем, і ўзростам, і супольнасцю жыццёвага лёсу.

Лірычны герой — летапісец гэтага краю. У яго, між іншым, таксама ёсць свая маральная віна перад Сялібай: як-ніяк, ён пакінуў родныя мясціны (і дзяўчыну, якую кахаў), «ад зямлі з'ехаў». Але яе ўсё ж такі не параўнаць з віною таго сына вёскі, які вярнуўся дадому з дыпломам рашуча настроенага механізатара.

Намеры былі быццам бы і добрыя.

Зямлю мы хочам падлячыць,
Дрыгву аддаць аратым...
Над вечнай багнай загучыць —
Як гром —
меліяратар!

Зрэшты, не з меліяратараў гэта пачалося— погляд паэта пранікае ў даўніну, у часы паншчыны. У паэме ёсць раздзел пад назвай «Гон (накід іконы «Святое паляванне»)», у якім даецца апісанне панскага палявання як увасаблення жорсткасці ў адносінах да ўсяго жывога.

Гісторыя прыроднага асяроддзя раскрываецца таксама ў хвалюючым лірычным адступленні «Голас Вялікага Каменя»:

Пакінула пушча мяне,

адышла,
Вятры заспявалі
у тысячу глотак...
А возера —
бросня ў палон узяла...
Радзелі над Начэй зубрыныя нетры.
Імхі наступалі, плылі зыбуны...

Але асабліва паскорыўся працэс збяднення прыроднага асяроддзя, біясферы ў наш час.

Цяпер далёка ў нас відно —
Бадай што вёрст на трыццаць.
Зірні туды, зірні сюды:
Ні кусціка, ні дрэва...

Такой стала Сяліба.

Антыпод лірычнага героя паэмы — па прозвішчы Крамёйак (прозвішча якое!) — сваёй бяздумнай, безадказнай, але вельмі энергічнай дзейнасцю рэзка мяняе прыродны ландшафт, спусташае зямлю. Нельга сказаць, што ён імкнецца толькі да задавальнення сваіх асабістых спажывецкіх патрэб. Не! ён так ідэалагічна выхаваны. Яму ўласціва функцыянальная аднамернасць. Гэта, выражаючыся філасофскай мовай, нейкі утапіст, які жыве фанатычнай ідэяй ператварыць прыроду (а заадно і грамадства) у нейкі адзіны механізм, кіруемы аднекуль з цэнтра. Ён не давярае натуральнай прыродзе і бачыць сваю задачу і прызванне ў тым, каб стварыць «другую прыроду», свет чалавечай культуры — прадметы і працэсы, якіх у прыродзе ў гатовым выглядзе няма і якія не могуць узнікнуць пад уздзеяннем яе ўласных сіл. У гэтым штучным, схематызаваным свеце павінен быць усеагульны «парадак», але ён якраз і выклікае трывогу ў душы паэта.

Рэкі, песні зямлі,
Рэкі, душы зямлі,
Бы ў трунах ляжаць — прамыя,
Бы струны — ды нежывыя.
Высечам пушчы,
Крыніцы засушым...
Як жа яны будуць — нашыя душы:
Ці не збяднеюць?
Ці не змялеюць?..

Вось яно — галоўнае пытанне, таму што Крамёнак заадно — і гэта асноўная яго мэта — хоча стварыць (выхаваць) і так званага новага чалавека — чалавека будучыні. «Новы чалавек» бачыцца яму

як пакарыцель усяго навакольнага прыроднага свету, які, на думку Крамёнка, павінен развівацца не паводле сваіх натуральных законаў, а па тым, па якім яму прадпісваецца развівацца. Адсюль Чарнобыль, адсюль і іншыя беды... Крамёнку, мякка кажучы, бракуе таго рэалістычнага мыслення, пра неабходнасць якога сёння так настойліва гаворыць С. Залыгін:

«Так, магчымасці нашага далейшага існавання на зямлі — гэта магчымасці рэалістычнага мыслення і дзейснай практыкі, і вось ужо рэалізм перастае быць толькі «плынню» або «напрамкам» мастацтва, а становіцца адзіна магчымым сродкам забеспячэння будучыні» («Правда». 1986. 29 верас.).

Такога вось рэалізму мыслення, якое павінна было б увабраць у сябе ўвесь накоплены чалавецтвам жыццёвы вопыт, і не стае функцыянальнаму Крамёнку, які, па сутнасці, з'яўляецца толькі «вінцікам» створанай ім сістэмы.

Адзін з герояў паэмы вясковы святар айцец Лявонцій, згодна біблейскай думцы, што людзі здрадзілі зямлі, дадзенай ім богам для жыцця, гаворыць:

Парушана гармонія ў прыродзе.
Сябе царом над ёй
смяротны мысліць...
У велічы і гонары забыўся,
Што ён часцінка тут, не заваёўнік...

Маштабы ўздзеяння чалавека на прыроду дасягнулі ў сучасную эпоху такіх памераў, што ўзніклі сур'ёзныя экалагічныя праблемы. Гэта, у прыватнасці, прыводзіць да рознага зніжэння маральнага ўзроўню грамадства.

І паляцела ўсё ў тартарары:
Царква,
Хрыстос, Лявонціем абплаканы,
І роспісу забыты цуд стары,
І песня — чалавечая бяссонніца...

Такія радкі можна разглядаць як крытыку сучаснага атэізму, які адмаўляе існаванне бога і гэтым абмяжоўваецца, спрашчаючы і агрубляючы навуковую карціну свету, накладваючы табу на ўсе яго пакуль што недаследаваныя таямніцы. Атэісты-вульгарызатары, на думку паэта, забылі пра чалавечую душу, не ўзняліся да станоўчага сцвярджэння асобы ў багацці яе маральных, духоўных патрэб. Паэт разумее экалогію як светапогляд сучаснага чалавека, як сістэму яго ўзаемаадносін з усім асяроддзем, у якім ён жыве і часткай якога выступае ўся духоўная культура.

«Сяліба» пісалася ў час застою: паэт, на жаль, не мог сказаць усяго, што хацеў, але ён у многім падрыхтоўваў людзей да думкі аб прыярытэце агульначалавечых каштоўнасцей над усімі іншымі, больш вузкімі.

Апошнія радкі паэмы ўсё ж такі прасякнуты гістарычным аптымізмам, ідэяй адзінства чалавека і прыроды, усяго жывога на зямлі.

Мы, камуністы,
з бою —
як салдата —
Выносім на руках сваіх
планету.
Мы раны забінтуем ёй, загоім,
Перададзім — блакітную — нашчадкам.

## ПЕРШЫ ПАДРАХУНАК

Кніга выбранага — «Нача» — выйшла ў 1975 годзе. Аднак тут былі і новыя творы.

Паводле мясцовых паданняў, слова «Нача» — значыць «ураддівая зямля». У ваколіцах Халопеніч — на радзіме паэта — так называецца старадаўняя рачулка, у якой і да нашага часу ловяць рыбу.

Рыбак — да рыбака:

— На Начы?
— На Начы.
— З паўпуда?
— Няйначай...

Увага і любоў да жывой народнай гутарковай мовы — мастацкі прынцып, які шырока праявіўся ў творчасці паэта.

Кніга В. Зуёнка «Нача» трапіла на касмічную арбіту — там яе гартаў зямляк паэта Уладзімір Кавалёнак. «Атрымаў,— успамінаў ён потым,— томік вершаў на «Прагрэсе» на сваёй роднай беларускай мове... І назва «Нача» — родная. Гэта рачулка, якая цячэ непадалёк ад нас. Невялікая, але вельмі маляўнічая».

Кніжка, хоць, можа, чытаць яе не было надта часу, нагадвала касманаўту пра радзіму, якую ён бачыў з ілюмінатара касмічнага карабля, пралятаючы над Беларуссю.

Дрыготкая бярозка пад акном,
Як адзінца, калыша ліст змарнелы.
Замкнуўшы сонца, сквапны аканом —
Асенні дзень —
блукае адубела.
І будзе так, пакуль сухі мароз
Заломіць на трыццатае калена.
І будзе так:
панура, без пагроз
Дождж наступае — нетаропка, лена...
Дзіравы стаў, ці што, нябесны дах?
Плюшчыць, сячэ з халоднаю прыпаркай.
Тапырацца шпакі на правадах...
Сарваліся...
Знікаюць чорнай хмаркай...
І вечарэ ранішні прасцяг...
Пружыніцца рачулкі стынь тугая.
На ўзгорку —
хвойнік, як вясновы сцяг,

Вечназялёным полымем шугае.

Тут што ні радок, то трапны, паэтычны вобраз, напісаны не проста з феналагічнай дакладнасцю, а з глыбокай і беспаваротнай адданасцю роднаму, свайму, айчыннаму, хоць выглядае яно без экзатычнай пышнасці.

Цеплыня, шчырасць пачуцця, прастата, натуральнасць выражэння — у поўнай меры ўласцівы гэтаму вершу, у якім адбілася вельмі ж беларуская, сялянская назіральнасць і веданне навакольнай прыроды, духоўны вопыт яе ўспрымання.

Асоба паэта ў сваёй чалавечай змястоўнасці вельмі смела раскрылася ўжо ў самых першых яго зборніках. Яны сведчылі пра адоранасць талентам метафарычнага ўспрыняцця свету, які, аднак, бачыўся паэту не толькі ў сваёй прыгажосці і эстэтычнай зваблівасці, але і ў святле тых трывог, праблем і наспелых пытанняў, што не могуць не трывожыць нашага сучасніка. Калі гаварыць пра самы агульны напрамак духоўных пошукаў паэта, трэба з усёй сур'ёзнасцю адзначыць, што позірк яго скіраваны ў глыбіню жыцця, на пазнанне яго сутнасці, разгадку ісціны «ў апошняй інстанцыі».

Прызнаны паэт, ён сцвердзіў сябе як майстар філасофска-канцэптуальнага верша, у якім выяўляецца не проста душэўны жэст паэта, а разуменне жыцця. Дэталі і падрабязнасці, якім ён надае вялікае значэнне, часцей за ўсё падпарадкоўваюцца ў ім асэнсаванню больш агульназначных пытанняў. Адсюль — інтэлектуалізм паэта, якога ўсё часцей застаём у роздуме — над марамі і рэчаіснасцю, спадзяваннямі і іх здзяйсненнем.

У вершы «*** Гавораць: раўнавага...» ён выступае супраць утульнай філасофіі тых, хто сцвярджае, што ў свеце ўсё ўраўнаважана, ігнаруючы сацыяльныя і маральныя супярэчнасці і кантрасты навакольнага жыцця, якія павінны непакоіць наша сумленне.

Насуперак манерам
Хачу адкрыта стаць
І раўнавагі шэрасць
Сурова вымятаць!

Свой намер паэт пацвярджае сваімі творчымі паводзінамі. З'яўляецца адчуванне ўнутранай тэмы, якая ідзе з глыбіні асабістага вопыту, неаддзялімага ад часу. Ва ўнутранай тэме знаходзіць адлюстраванне лёс паэта і тая задача, якую ён перад сабой ставіць і якая можа быць рэалізавана на шляхах актыўнага самавыяўлення, самараскрыцця асобы, скарачэння дыстанцыі паміж лірычным героем і аўтарам.

Прадмет яго лірычнай паэзіі, а таксама паэт — грамадская свядомасць, і ён абапіраецца на ўсё багацце духоўнага жыцця народа, а не толькі на побыт. Уражанне такое, што ў творах В. Зуёнка ўзнікаюць пытанні, пастаўленыя анталагічна самім быццём.

Яшчэ ў першым зборніку быў змешчаны выдатны верш «*** Тры цішыні, тры сілы знаю ў лесе...» — адзін з лепшых твораў беларускай паэзіі 60-х гадоў. У цэнтры яго — роздум пра лёс нацыянальнага багацця беларускага народа.

Тры вышыні,
тры сілы знаю ў лесе:
З камлёў — сталёвая,
дзе мох бароды звесіў;
Другая —
песняй звонкай —
пасярэдзіне,
Дзе сонца захлынаецца ад медзі;
А ля аблок —
у гойданцы зялёнай —
Жыцця пачаткі
правяць цуд штодзённы...

Галоўны, стрыжнявы вобраз — вобраз лесу, умоўна-асацыятыўны па сваім эстэтычным напаўненні і сэнсе. Іншыя вобразы больш лакальныя і падпарадкаваныя яму.

З камлёў тугіх
спрадвек вянцы вязалі,
З балоняў
звонкія цымбалы выразалі,
Узляталі думкай да вяршынь
паэты —
Пазнаць імгнення і жыцця
сакрэты...
Такім я знаў цябе...
А тут жахнуўся:
Не ўцяміў —дзе я...
І не ўцямлю, мусіць:
Рабрыстыя — ў падсочках,
нібы здані,—
О сосны,
хто прыдумаў вам Майданак?!
Хто цвёрдаю рукой падрэзаў жылы,
Жывіцу цягне з вас —

жывую сілу?..

Размова ідзе не толькі пра беларускія лясы і дубровы, але і пра лёс роднай культуры. Верш цікавы сваёй канцэптуальнасцю і духоўнай напоўненасцю. Паэт пераконвае ў глыбокай сувязі і ўзаемазалежнасці, якая існуе паміж галінамі і каранямі, паміж мінулым і будучым. «Чаму дух смольны з нашых хат знікае і гніль вянцы бярэ? І гэтак вяла і глуха так чаму пяюць цымбалы?» — вось пра што клопат паэта.

Вобраз лесу, такім чынам, суадносіцца з духоўным жыццём народа. Моцна гучыць дакор аб страце вялікіх духоўных каштоўнасцей.

У. Караткевіч у артыкуле пра кнігу «Крэсіва» з захапленнем пісаў: «Але нават каб нічога не было напісана, акрамя верша «Тры вышыні, тры сілы знаю ў лесе»,— аднаго з найлепшых за апошнія гады, пра які гаварыць і гаварыць бы асобна,— хапіла б і яго. Філасофія, глыбіня, сіла высакароднага сімвала. Верш, над якім думаць і думаць, перажываць і перажываць. Верш з соснамі, рабрыстымі, як здані, ад падсочкі, з соснамі, што пазбаўлены жывіцы, крыві,— таму і знікае смольны дух з хат, звонкасць з цымбал, вышыня думкі — у паэтаў. Цудоўны, высокі верш, які якраз і сцвярджае, што не знікае і не знікне вышыня думкі ў сапраўдных паэтаў».

Гэтая тэма знайшла працяг і ў кнізе «Нача» і стала, па сутнасці, скразной і для наступных зборнікаў.

У вершы «Зарука» гаворка ідзе аб нацыянальным характары беларуса.

Эпохам не грукалі ў грудзі,
Аб долі сваёй не крычалі.
Казалі: «Што будзе, то будзе...»
А болей — маўчалі.
Глядзела гісторыя звыкла
На лёс беларуса:
Армяк, падпяразаны лыкам,
Магерка ды вусы...
Не варты вышынь эпахальных,
І ў доме сваім бяздомак,
Бо ў сэнсе нацыянальным
Зусім, як ёсць, несвядомы.

З'явіліся, аднак,— і пра гэта аўтар нагадвае— Купала, Колас, Багдановіч, якіх пачуў свет. Аказваецца, як зазначае паэт, «голас тут людзі маюць!». Маюць — дададзім мы ад сябе,— ды які яшчэ арыгінальны голас!

Ды тоіцца сверб устарэлы

Ва ўпартых галовах,
І ходзіць пра нашую песню
Пагудка старая:
Ты, браце, спявай, хоць трэсні,
А ўсё ж яна адмірае...

Балючае пытанне для шчырага беларуса!

І думка ад холаду стыне,
І часам апусцяцца рукі:
Няўжо мы крычым у пустыні?..
Ды слова ўзыходзіць зарукай!
Не будзь жа, не будзь іншаверцам
На родным прычале,
Паўстань, паўстань, маё сэрца,
З пустыні маўчання!

Беларуская паэзія мае даўнюю эпічную ўласцівасць: лірычны верш будуецца так, што размова ў ім ідзе часцей за ўсё не ад першай асобы, а ад трэцяй, і адчуваецца ўласцівы беларускай лірыцы сюжэтна-навелістычны, у пэўнай меры апавядальны характар. Не пазбягае апавядальнасці і аўтар верша «Зарука», аднак пад канец ён мяняе спакойную медытацыю на палкі публіцыстычны зварот.

Успрыманне жыцця афарбоўваецца ў трагічныя колеры. Ззаду — азмрочанае вайной дзяцінства — да яго паэт звяртаецца ў вершы «Мой ліпень»: «На сотні год старэйшы, мусіць, стаў я сам за сябе і за пакутны век», але ж і сённяшні дзень таксама далёка не ясны.

Трагічнасць сучаснага свету ўражвае і праймае ў вершы «Хлопчык з помстай у сэрцы». На нашай планеце, на жаль, і да гэтага часу не спыніліся рэгіянальныя войны, ліецца чалавечая кроў, гінуць дарослыя і дзеці. Паэту, які на свае вочы бачыў вайну з яе жорсткасцю і бесчалавечнасцю, стала блізкім гора тых, хто сёння памірае ад кулі. Гэта тэма пастаянна хвалюе сэрца мастака.

Героі верша «Гаварыла маці...» — удава і яе загінуўшы на вайне сын. Маці скардзіцца на сваю долю:

У людзей унукі —
Грыўкі ільняныя,
А мае ж во рукі
Па дзіцятках ныюць...

У адказ яна чуе:

— Не крыўдуй на сына:
Я і сам не знаю,
Як вясну пакінуў
Тым грымотным маем.

Вечна застануся —
Вольны, не жанаты:
Хто ж, скажы, мамуся,
Пойдзе ў маю хату,
Што ў далёкім краі,
Што ў чужым куточку —
Цёмная, сырая,
З жоўтага пясочку?..

Традыцыйна-фальклорны сюжэт, можна сказаць, песня. Сувязь з фальклорам бясспрэчная на ўсіх узроўнях паэтыкі, формы і зместу. Магчыма, таму верш нагадвае дні ўсенародных святкаванняў нашай перамогі, якія сталі ў Беларусі нацыянальнай традыцыяй.

Роздум над гістарычнай хадою часу знаходзім у вершах «Пеўчае поле», «Бахчысарайскі палац. Ля фантана слёз». Датуль будзе жыць народ, сцвярджае аўтар, дакуль будзе жыць яго дух, культура і мастацтва. У стылі, як гэта і ўласціва В. Зуёнку, спалучаюцца мастацтва зрокавага вобразу (жывапіснасць і пластыка) з натуральнай меладычнай асновай. Спектр эстэтычных пошукаў надзвычай шырокі — ад элементаў традыцыйна-фальклорнай паэтыкі да свабоднага верша. Верш В. Зуёнка гучыць вельмі натуральна, нязмушана ў рытміка-інтанацыйным сэнсе, адчуваецца пастаяннае імкненне да абнаўлення паэтычнай мовы, да збліжэння яе, як ужо гаварылася, са звычайнай штодзённай гаворкай.

Своеасаблівая з'ява — верлібр В. Зуёнка. Трэба сказаць, што ў яго паэзіі наогул паслаблена роля рыфмы, як асацыятыўная энергія. Аўтар часта арыентуе верш на прамое, экспрэсіўнае выказванне, ахвяруючы часам да некаторай ступені выяўленчасцю. Аднак і выяўленчасць тут не занядбана: шырока выкарыстоўваюцца паралелізмы, паўторы, кантрасты — як сінтаксічны, так і фанетычны арсенал. Верлібр у многім прадвызначае і выбар лексічных сродкаў. Паэтычнасць у яго канцэнтруецца ў слове, ва ўзаемаадносінах слоў. ён не цураецца празаізмаў, якія даволі смела і натуральна адчуваюць сябе ў яго паэтычным радку, надаючы яму свабодны, гаваркі характар, якому аўтар аддае перавагу — перавагу канкрэтна-рэалістычнай вобразнасці, прастаце і натуральнасці паэтычнай інтанацыі. Пры ўсім пры тым верш застаецца музычным — аўтар не любіць скопішча галосных. Развіваючы вобразна-асацыятыўныя і жывапісна-пластычныя магчымасці, радок захоўвае сваю музычна-песенную аснову.

## ПРАЎДА ЗЕРНЯ

У 70-я гады выспявае задума новай паэмы, больш буйной і падрабязнай па ахопе падзей і іх сацыяльна-гістарычным асэнсаванні.

Узмацненне лірычнага «я», паглыбленне народнасці і пачуцця гістарызму садзейнічалі новаму звароту В. Зуёнка да гэтага жанру, закліканага сінтэзаваць думкі і жыццёвыя назіранні. Перамяшчэнне чалавека ў цэнтр мастацкай увагі вяло да ўдакладнення канцэптуальнай асновы твора, павелічэння ёмістасці сцвярджаемай у ім «формулы быцця».

У сучаснай паэме прыкметна тэндэнцыя да ўзмацнення яе «чалавеказнаўчай» накіраванасці. Адзін час нават было прынята хваліць паэму «беспадзейную» і крытыкаваць так званую «апавядальную» за лішнюю апісальнасць, вяласць думкі. Справа, відаць, не ў падзейнай паўнаце, а ў рэальнасці канфлікту, напружанасці духоўных пошукаў, вастрыні думкі, якія патрабуюць для свайго ўвасаблення адпаведных паэмных структур. З гэтага пункту гледжання значную цікавасць мае не толькі распаўсюджаная сёння ў беларускай літаратуры лірыка-маналагічная паэма, але і паэма-агляд, паэма-панарама, паэма-біяграфія і г. д.— у жанравых адносінах сучасная паэма багатая. Эфект эпічнасці нярэдка дасягаецца ў ёй з дапамогай сінтэзу камбінавання лірычных, драматычных элементаў з эпічнай апісальнасцю, выкарыстаннем нечаканых прыёмаў і форм. Спектр творчых пошукаў паэмы даволі шырокі — ад жыццяпадобных форм да ўмоўных, звязаных з пафасам пазнання чалавека, прагназіраваннем яго лёсу.

Сёння ад літаратуры ў большай ступені, чым раней, патрабуецца праўдзівасць і аналітычнасць у мастацкім адлюстраванні і асэнсаванні жыцця і чалавечых лесаў, шырокія сацыяльна-гістарычныя далягляды.

Пра гэтыя патрабаванні В. Зуёнак помніў, працуючы над паэмай «Маўчанне травы» (1974-1979), якая на сённяшні дзень займае, можна сказаць, цэнтральнае месца ў яго творчасці. Паэт атрымаў за яе ганаровае званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы (1982).

Відаць, ёсць свой «зорны час» у тым знамянальным моманце, калі навеліст сядае за раман, а паэт-лірык бярэцца за паэму. Адразу, на самым пачатку творчага шляху, узяцца за такія палотны не лёгка: яны патрабуюць значнай падрыхтоўкі, вопыту, роздуму, каб усё гэта абагуліць у абсягу патрабаванняў паэмнага жанру.

«Маўчанне травы» ў многім не падобна на «Сялібу», хаця, безумоўна, і тут і там знайшлі выяўленне агульныя рысы, якія характарызуюць творчасць іх аўтара. Мы маем на ўвазе ўзросшую самастойнасць аўтара, адчуванне ім рэальнай складанасці народнага жыцця, уменне спалучыць цікавасць да яго з увагай да індывідуальнага свету асобы.

Вопыт «Сялібы» скарыстаны і ў «Маўчанні травы», але аўтар на гэты раз прыходзіць да значна больш ёмістага, сацыяльна і маральна насычанага эпічнага абагульнення, шырока разгорнутага ў прасторы і часе. Далёка не кожнай паэмы хапае на цэлую кнігу (маецца на ўвазе, зразумела, не памер твора), а «Маўчанне травы» адпавядае такім патрабаванням: гэта па-сапраўднаму маштабны мастацкі свет, «паэма лёсу», як называе свой твор аўтар. Называе не без падстаў — гаворка ідзе пра няпросты жыццёвы шлях чалавека, у якім адлюстраваўся народны лёс на цяжкіх, пераломных этапах гісторыі, ад дакастрычніцкіх часоў да нашых дзён. Паэма ўражвае шырынёй і ўгрунтаванасцю светапогляду паэта, глыбокім роздумам над лёсам роднага краю, які паэтызуецца ў вобразе Веснагоркі — прыдарожнай сельскай ваколіцы.

Веснагорка, маці-Беларусь,
І адкуль, скажы, не перла намець?..
На крыжах — Скарына і Кастусь,
Лёс народа, сэнс яго і памяць.
На крыжах кружыў з усіх Еўроп
Вецер злы з крывавым чадам Азій.
Ды знаходзіў люд мой чарнатроп
І да сонца зноў і зноў вылазіў.

В. Зуёнак не першы ў беларускай літаратуры спрабуе асэнсаваць гістарычны лёс народа, але, як вядома, шляхі мастакоўскіх пошукаў шматстайныя — у кожнага свой...

Беларуская паэзія здаўна славілася сваімі ўстойлівымі мастацкімі, развітымі, эпічнымі традыцыямі, пачатак якім паклалі народныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», а таксама творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча. Нельга не прыгадаць таксама ў гэтай сувязі імёнаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота, многіх іншых і, магчыма, у першую чаргу А. Куляшова, дасягненні якога ў галіне эпічна-паэмных форм асабліва ўражваюць.

Што ж новага адкрыў, ідучы па ўжо традыцыйным шляху, В. Зуёнак?

Пачнём з таго, што яго паэма, пры ўсёй сваёй эпічнай заглыбленасці, аўтабіяграфічная. Падзеі ў паэме адбываюцца ва

ўсходняй частцы Беларусі — у родных мясцінах паэта, вёсцы з абаяльнай назвай Узбор'е.

Палёўкай пры лесе — Узбор'е —
Вёска — сорак двароў:
На захад — жытное горне,
На ўсход — перазовы бароў,—

так пачынаецца паэма, у якой аўтар паэтызуе сваё Узбор'е — блізкае яму і бясконца дарагое. Узброены пачуццём свядомага гістарызму, В. Зуёнак ідзе да вытокаў — хоча даследаваць карэнні сацыяльнага і духоўнага жыцця свайго народа.

Пачынаецца твор сцэнай у карчме — канфліктам паміж галоўным героем паэмы Васілём і яго шваграм Сямёнам. Канфлікт тыпова вясковы: не падзялілі зямлю. Сямён, у якога надзел большы, чым у каго, адчувае сябе тым не менш пакрыўджаным і помсціць Васілю — пырнуў яго нажом.

Прайшоў час, зараслі травой акопы імперыялістычнай вайны, адгрымелі падзеі рэвалюцыі і вайны грамадзянскай, наступіла пара, якая ўвайшла ў гісторыю як перыяд калектывізацыі. Размова аб камуне, праўда, узнікла даўно, яшчэ ў грамадзянскую вайну, калі камандзір адной з часцей Чырвонай Арміі гаварыў мужыкам: «...шлях цяпер адзін ёсць — камуна...» Тыя не згаджаліся з ім, лічылі дзіваком, не падзялялі яго «праграмы» — і «стварыць тады не выпала камуну».

Прайшло дзесяць год, пачаўся калгасны рух. Сямён, як кулак, трапляе ў Сібір. Гэта, вядома, чалавечая трагедыя пры ўсіх адмоўных якасцях, уласцівых характару Сямёна. Кранае, напрыклад, тое, што Сямён узяў з сабой у вузельчыку жменьку жыта, як зарок не здрадзіць свайму хлебаробскаму абавязку. «На сібірскім папары будзе сеяць Сямён».

Хоць час (70-я гады) і не дазваляў, але паэт, наколькі змог, імкнуўся раскрыць цяжкую драму вясковага чалавека ў тыя гады. Яна закранула таксама і лёс Васіля і іншых яго аднавяскоўцаў, якіх не мінуў ні адзін паварот, ні адзін залом у жыцці беларускага сяла на працягу XX стагоддзя. В. Зуёнак аб'ектыўна расказвае пра жыццё даваеннай калгаснай вёскі, не ідэалізуючы сваіх герояў. Перад намі паэт зямных працоўных спраў, якія ў яго ўспрыманні ўздымаюцца да вышыні духоўнага акта, калі ўся чалавечая істота гарманічна спалучаецца з аб'ектыўным светам. Напрыклад, у цудоўных апісаннях падзей календара земляроба: касьба, жніво, ворыва... Вось выйшлі касцы — цяпер ужо калектыўна — на сенажаць.

Размах, разгон! Ці тое, як бывала —
На вузенькай палосцы ў два заходы:

Касу ўгамоньвай, каб не спудлавала
І да суседа не залезла ў шкоду.
Як пашырэў ты сёння, луг без межаў!

Аўтар паэмы ведае і толк, і смак у сялянскай справе, нездарма ён у вельмі шчырых, сакавітых радках апявае спрадвечную сялянскую прыладу — касу-літоўку, якая славілася на ўсё наваколле.

У паэме назіраецца шматпланавасць у развіцці сюжэта — намячаецца некалькі ліній. Васіль, абраны на пасаду старшыні калгаса, сустракаецца з разнастайнымі праявамі чалавечай натуры — дабром і злом. Ён працуе разам з усімі, на сенажаці — у агульным гурце.

Прыезджы, з раёна, начальнік папікае Васіля за тое, што ён абуў лапці: «Лапці галасуюць тваё за што?! За перажыткі ў быце?», не ведаючы, што гэты абутак вельмі прыдатны ў касьбу, на балоце, калі пад нагамі хлюпае вада.

Праўдзіва напісаны вобраз гультая і абібока Трыхана, які, нягледзячы на гэтыя свае якасці, хоча прабіцца ў сельскія актывісты (прыдбаў фрэнч, галіфэ, на грудзі павесіў значок), дзеля чаго ідзе на паклёпы і даносы. Ад яго пацярпелі і чэсны каваль Яўсей, і старшыня калгаса Васіль, якога таксама абвінавацілі ў шкодніцтве (нібыта ён зумысне згнаіў бульбу) і, як ворага народа, аддалі пад суд. У выніку — дзякуй суддзі: разабраўся, у чым справа, «паўгода толькі прымус працы».

Сёмкава працавітасць, які знік недзе ў далёкіх прасторах Сібіры, была скіравана на дасягненне сваіх эгаістычна-ўласніцкіх мэт, а Трыхан — гэты ўвогуле не прывык працаваць. Дай яму партфель — і ўсё тут. Імкненне да ўлады пераважае над усім.

На пасаду старшыні, замест Васіля, ён, аднак, не трапляе,— з раёна прысылаюць Плеўкіна. Яго партрэт напісаны па-майстэрску, з перавагаю гумару і сатыры.

Мажны, высокі, кучаравы.
Грудзіна — хоць абоддзе гні!
Шынель, гармонікам халявы —
Усё як ёсць для старшыні.

Што ж, магчыма, на нейкай іншай пасадзе ён і сапраўды быў бы на месцы, а калгасны старшыня з яго атрымаўся няўдалы. Калгас трымаецца на такіх людзях, як Васіль.

Вялікае значэнне ў паэме маюць не толькі такія пазасюжэтныя элементы кампазіцыі, як партрэтныя характарыстыкі, але і разнастайныя пейзажна-бытавыя карціны і замалёўкі. Значная ўвага ўдзяляецца ўзнаўленню жывых падрабязнасцей сялянскага жыцця, працы, побыту, напісаных буйным планам. Цэлы раздзел, напрыклад,

прысвечаны вясковай лазні, якая складала абавязковую прыналежнасць побыту з даўніх пракаветных часоў.

Хвала табе, чорная лазня!
Хвала табе, светлы Купала,
Што быў ты з намі не блазнам:
Гарэзваў, ды клёку хапала.
Хапала разважнасці мудрай
Нам песню ўдыхнуць у грудзі
І выправіць не лахудрай
Душу народную ў людзі.
Каб яснай была і чыстай,
Як белы кужаль абруса,
Каб днём не згасала імглістым
Яна, душа беларуса.

Паэт раскрывае, аднаўляе народную памяць, непаўторнасць этнічных рысаў у духоўным аблічча радзімы.

Осіп Мандэльштам у артыкуле «Слова і культура» ў артыкуле, напісаным у савецкі час, адзначаў:

«Паэзія — плуг, які ўзрывае час так, што глыбінныя пласты часу, яго чарназём, аказваюцца зверху»[1]

«Глыбінныя пласты часу» ў В. Зуёнка — гэта фальклор, сялянскі побыт, звычаі, працоўны каляндар земляроба, рэшткі міфалагічных уяўленняў. «Зверху» аказваюцца гуманізм і мудрасць народа, яго дабрыня і чалавечнасць, адлюстраваныя ў праўдзівых, пераканаўчых вобразах. Нацыянальнае пачуццё жыве тут памяццю, але, вядома, не адной ёю. Ад вытокаў пачынаецца рака — яна плыве праз часы і стагоддзі, рака чалавечых спраў і здзяйсненняў.

Актыўны ўдзел у фарміраванні духоўна-эмацыянальнай атмасферы паэмы прымае лірычны пачатак, які адкрываў прастор для думак і пачуццяў, стымуляваў асабовае адчуванне жыцця, паглыбляў псіхалагізм. У паэме шмат лірычных адступленняў, падказаных аўтару ўспамінамі дзяцінства, якія, аднак, не толькі не супярэчаць эпічнаму пачатку, але і паглыбляюць яе праўдзівасць, узмацняюць верагоднасць і цеплыню пачуццяў. Гэта тыповая беларуская вёска, што, як гаворыцца, «спрадвеку жыве з мазаля».

Вяснуецца ў полі з сяўнёю,
П'е жніўнем з ламоткіх крыніц
І боханам — сонцу раўнёю —
Узыходзіць на покут святліц.

---

[1] Мандельштам О. Слово о культуре. М., 1987. С. 42.

Ля борцяў узятак цікуе,
Румуе калоды на сплаў,
Цяслярыць і скрыпкі штукуе —
Ніхто не прыліпне да лаў!

Звярніце ўвагу на паэтычнае майстэрства, на дакладнасць і ёмістасць слова ў Зуёнка, на сакавітасць пісьма, ён умее адным штрыхом — праз дэталь, «мікравобраз» — даць цэласную карціну вясковага працоўнага ўкладу. Цудоўна апісаны сцэны ў карчме, перабудова вёскі на новы лад, касьба, рытуал вясковай лазні, у якой чалавек выганяе бярозавым венікам хворасць і стому пасля працоўнага тыдня. Паэма — уся! — прасякнута народным духам, ахутана атмасферай фальклорнага сінкрэтызму. У слове паэта спалучаюцца адлюстраванне і выражэнне, паказ і гучанне, думка і пластыка. ён умее цаніць устойлівыя народныя выразы, у якіх адклаліся цэлыя пласты жыццёвага вопыту чалавека.

Сёння шмат спрачаюцца пра сувязь літаратуры і фальклору. Паэма «Маўчанне травы» пераканаўча пацвярджае і сцвярджае здольнасць фальклору дзейсна ўзбагаціць светаўспрыняцце сучаснага чалавека, надаць яму адчуванне, на якой вялікай таўшчыні часу ён стаіць.

І ўсё ж такі паэма, відаць, не адбылася б як паўнацэннае эпічнае палатно, калі б даўняе, спрадвечнае не было б так арганічна спалучана з сучаснасцю, як яно спалучана ў «Маўчанні травы». Менавіта гэтым яна і цікавая.

Са з'яўленнем на сцэне галоўнага героя — Васіля — вызначаецца асноўная праблематыка твора. Гэты чалавек чымсьці нагадвае коласаўскага Міхала з «Новай зямлі». Не чужыя яму і Мікіта Маргунок з «Краіны Муравіі» А. Твардоўскага, Кандрат Майданнікаў з кнігі М. Шолахава «Узнятая цаліна», Дзяніс Зазыба з раманаў І. Чыгрынава і іншыя героі — «характаралогія» гэтага тыпу даволі шырокая ў савецкай літаратуры. У гэтых творах, апрача галоўных і другарадных персанажаў, ёсць яшчэ адзін вельмі важны герой — гэта сама зямля, якая адыгрывае значную ролю ў мастацкай канцэпцыі кожнага пісьменніка. Яна — аснова ўсяго. У гэтым пераконваешся з першых старонак паэмы, калі ўзнікае бойка паміж Васілём і Семкам у карчме.

У Іона Друцэ ёсць такая думка: «Чалавека павінна пракарміць зямля, на якой ён жыве,— гэта старадаўні саюз, заключаны нашымі продкамі з зямлёй, на якой яны аселі, і гэты саюз павінен быць для нас святым». Вось, думаецца, дзе вытокі маралі, блізкай і роднаснай Васілю. Аднак ён не паўтарае нікога са сваіх знакамітых літаратурных папярэднікаў — у яго сваё жыццё, свой лёс.

У старым селяніне сышліся — і ад гэтага нікуды не падзенешся — і працаўнік, і ўласнік. Такой супярэчнасцю, зразумела, адзначана і свядомасць Васіля. І ўсё ж такі ўласніцкі пачатак развіты ў ім — у адрозненне, скажам, ад Сёмкі — куды меней, чым пачуццё працаўніка з яго любоўю да зямлі, з якой ён звязвае сваё жыццёвае прызванне. У складаны час давялося жыць гэтаму чалавеку. У самым пачатку паэмы гучыць «прэлюдыя жалезнай птушкі», што не перастае яго праследаваць праз усё жыццё, якое змясціла ў сабе некалькі войнаў, рэвалюцыю, пераломную эпоху калектывізацыі, Айчынную вайну і многае іншае.

Такіх, як Васіль, называюць творцамі жыцця і яго ахоўнікамі. Яны кормяць сваю радзіму, аберагаюць яе ў час нягод і ліхалецця, адольваюць усе цяжкасці на яе шляху. Хочацца перш за ўсё адзначыць той відавочны факт, што аўтар вельмі нераўнадушны і шчыры ў адносінах да свайго героя і што ён вельмі добра ведае яго. Духоўны свет Васіля — чалавека з народа — гэта свет арыгінальнай і старажытнай культуры са сваімі ўстойлівымі каштоўнасцямі, тыпам паводзін. Паэт стаіць на тым пункце погляду, што народ стварыў цэлую сялянскую цывілізацыю, устанавіў выпрабаваныя вякамі нормы маралі і этыкі, што сялянская культура жывілася з крыніц, якія вытокамі сваімі карэняцца ў старажытных пластах народнага светаўспрымання.

Тут свае звычаі, свой аптымізм, адчуванне і прага жыцця, якія грунтуюцца на спаконвечных узаемасувязях з зямлёй. Некалі, у грамадзянскую, чырвоны камандзір казаў сялянам — і ў яго тоне адчувалася адценне недаверу і пагарды:

> — Я знаю ваша племя земляное:
> Хто з печы сцягне — рады ці не рады,—
> А з тым і пойдзеш і стаіш сцяною,
> Той для цябе і ўлада, і парадак.

На што Васіль адказвае:

> — Улада? Можа, й праўда. Але прагну
> Парадку іншага, што праз вякі — галоўны:
> Ну хто, скажы, мяне за крыссе цягне
> Вясной у поле, восенню да ёўні?
> Не толькі, брат, кішка, не толькі голад.
> Ёсць нешта і такое, што не знаю...

Таямніца заключаецца ў тым, што зямля існуе не толькі для таго, каб карміць чалавека, але і каб адорваць яго радасцю самога існавання, штодзённага жыцця. Васіль адчуваў сваю прывязанасць да зямлі, залежнасць ад яе,— залежнасць, якая, аднак, не перашкаджала

яму заставацца свабодным і адчуваць сябе такім, калі пад свабодай разумець «супадзенне таго, што ёсць, з тым, што павінна быць» (вызначэнне А. Ф. Лосева).

У паэме раскрываецца духоўна-маральная аснова народнага жыцця, прыгажосць душы земляроба — працаўніка і паэта. Гэта вобразы Васіля, Сілівея, Ёхі... Народна-нацыянальны тып быцця і светаўспрымання складае самую сутнасць жыццёвай і творчай пазіцыі паэта ў «Маўчанні травы». У асобе Васіля і яго сяброў-аднавяскоўцаў ён паказвае цягавітасць і працавітасць вясковага чалавека, вернасць запаветам продкаў. Дзяцінства, юнацтва, маладосць — усе сілы былі аддадзены зямлі, працы на ёй. Праца выступае як найвялікшая каштоўнасць народнага жыцця. Іншыя адносіны да працы вядуць, на думку паэта, да дэградацыі асобы. Справа, зразумела, не вычэрпваецца толькі клопатамі аб хлебе надзённым. Гаворка непазбежна выходзіць на такія катэгорыі духоўнасці народа, як мараль, мудрасць, прыгажосць. Пра Васіля можна сказаць, што па сваёй сутнасці гэта цэласны чалавек, які сінтэзуе ў сабе прыроднае і духоўнае, сацыяльнае і індывідуальнае, асобу і яе ролю ў грамадстве.

Гэта сапраўды эпічны, «паэмны» герой, у якім адлюстраваліся цэлыя пласты народнага вопыту. Рамкі яго біяграфіі ўключаюць вялікія абсягі перажытага. «Як ты выжыў, адкажы, народзе?» — так ставіць пытанне аўтар, і ўся паэма, як справядліва пісаў пра яе А. Лойка ў артыкуле «Выпраўленне ў людзі», з'яўляецца спробай адказаць на яго («Літаратура і мастацтва». 1981. 15 сак.).

Постаць Васіля — героя паэмы — трагічная, бо шмат страт давялося зазнаць яму за жыццё. Нялёгкія дарогі вялі яго да праўды, да таго, каб паяднаць «праўду зерня з праўдай барацьбы».

Яго жыццё — штодзённыя клопаты, радасці і турботы, скіраваныя на агульную карысць. Ён, гаворачы моваю філасофіі, не зробіць іншаму таго, чаго не пажадаў бы сабе.

Ч. Айтматаў у прадмове да рамана «Буранны паўстанак» пісаў: «...я далёкі ад абсалютызацыі самога паняцця «працаўнік» толькі таму, што ён «просты натуральны чалавек», рупліва арэ зямлю або пасе статак. У сутыкненні вечнага і плыннага ў жыцці чалавек-працаўнік цікавы і важны настолькі, наколькі ён асоба, наколькі вялікая яго духоўная нагрузка, наколькі сканцэнтраваны ў ім яго час. Вось я і спрабаваў паставіць Бураннага Едзігея ў цэнтр сучаснай мне светабудовы, у цэнтр хвалюючых мяне праблем. Буранны Едзігей — не толькі працаўнік ад прыроды і паводле роду заняткаў. Ён чалавек працалюбівай душы».

В. Зуёнак таксама даследуе маральны змест і напрамак чалавечай актыўнасці свайго героя. У яго ёсць не толькі сябры, але і ворагі. Васіль хоча захаваць і адстаяць у сабе і ў іншых чалавечае, без якога грамадства непазбежна прыходзіць да заняпаду. Думка паэта, скіраваная да сацыяльных пытанняў веку, глыбока раскрывае ўнутраны свет героя, яго маральную сутнасць, сувязі з грамадствам, прыродай, зямлёй. Аўтар ідзе па лініі павышэння ідэйных і маральных патрабаванняў да свайго героя. Але ён не канструюе яго, не «сачыняе». Такога героя «сачыніла» само жыццё з яго супярэчнасцямі. І ў тым важная заслуга паэта, што ён імкнецца ўлічыць усе ўмовы і акалічнасці жыцця свайго Васіля.

У. Калеснік у артыкуле «Эстафета лёсу» («Нёман». 1982. № 1) адзначыў інтэлектуалізм паэзіі В. Зуёнка. Адна з прыкмет інтэлектуалізму гэтага паэта — маштабнасць светаўспрымання і абагульненняў, наяўнасць сацыяльна-філасофскіх антыномій, увасобленых у такіх мастацкіх вобразах, як Васіль і Трыхан.

Трыхан лічыць сябе разумнейшым за ўсіх, хоча ўсімі кіраваць, вырашаць лёс народа без удзелу яго самога. Гэты вобраз удаўся паэту, як і вобраз Васіля,— ён жывы і канкрэтны. Трыхан усіх падазрае і гатоў бачыць ворага ў кожным серадняку. У адносінах да серадняка (а такімі была большасць беларускага сялянства) аўтар прытрымліваецца іншай думкі. Серадняк — не вораг, а перш за ўсё гаспадар, умелец, нястомны працаўнік, на якіх зямля трымаецца. На вялікі жаль, многіх з іх у перыяд калектывізацыі напасціг трагічны лёс — па віне такіх, як Трыхан...

Аўтар адлюстроўвае жыццё ў значных тыповых абагульненнях, шырока выкарыстоўваючы мастацкі вымысел, элементы фантастыкі.

Падзеі раскрываюцца праз узаемаадносіны і ўчынкі герояў, і заслуга аўтара ў тым, што ён не адыходзіць ад праўды, ад пражытага і перажытага...

У паэме знайшла сур'ёзнае і шматграннае асэнсаванне тэма подзвігу савецкага народа, у прыватнасці сялянства, у Вялікай Айчыннай вайне. Гэта таксама, як мы ўжо казалі, блізка В. Зуёнку па ўласным вопыце. Глыбока і аб'ектыўна паказвае ён лёс беларускай вёскі ў гады вайны. Таксама трагічны лёс. Жыццё працягваецца і ў час вайны.

Трэба было жыць, каб змагацца. Гераічнай, прыгожай смерцю загінуў старшыня калгаса Плеўкін, які ў першыя ж дні вайны, згараючы ад нянавісці да фашысцкага наслання, пачаў паліць па нямецкай мотакалоне птушыным шротам з паляўнічага драбавіка.

Яго злавілі і загадалі: «бяжы!», каб тут жа, вядома, расстраляць. Плеўкін не пабег.

Ён ганьбе не дасць узборцаў!
І крыкнуў крывёю рот
У смех азвярэлых забойцаў:
— Стреляйте! Пусть видит народ.

Але аднаго такога гераізму для перамогі недастаткова, патрэбна большая трываласць.

Гады акупацыі сталі вялікім выпрабаваннем для узборцаў. Васіля, былога старшыню калгаса, акупацыйныя ўлады (не без «падмогі» падпольшчыкаў) пераймяноўваюць у старасту. Нягледзячы на гэту пасаду, ён знаходзіць магчымасць заставацца чалавекам — савецкім чалавекам, які дапамагаў партызанам. Народныя мсціўцы мелі патрэбу ў такіх людзях.

Заглыблены гістарызм В. Зуёнка, у тым ліку і ў сферы ваеннай тэматыкі, таксама спалучаны з абвостранымі духоўнымі і маральнымі пошукамі мастака, якога не перастае хваляваць пытанне аб чалавеку і яго месцы ў жыцці.

Добраахвотна ў паліцаі пайшоў Трыхан — былы актывіст, ён паранейшаму праціўнік Васіля і творыць яму адну подласць за другой. Да вайны ён лічыў сябе абыдзеным і пакрыўджаным, а тут — магчымасць узяць рэванш за ўсё. Чалавечае сумленне і прыстойнасць яго ніколі не цікавілі.

У сувязі з гэтым прыгадваюцца словы Ч. Айтматава:

«Паняцце «маральнасць», на мой погляд,— адзначыў ён у размове з карэспандэнтамі «Правды» (1987, 14 лют.),— не падлягае ніякім навацыям, а тым больш прымітыўнай палітызацыі. Маральнасць — гэта першапачатковы і самы галоўны закон быцця для чалавека. Кожнае пакаленне, кожны індывід успрымаюць яго як непарушную і свяшчэнную спадчыну продкаў».

У гэтым якраз клопат і беларускага паэта — каб захаваць маральныя ўстоі чалавека, якіх не прызнае Трыхан. Прырода і карэнні яго здрадніцтва і злачынстваў — у эгаізме, непрыняцці маральнасці як асноўнага чалавечага закону. Такая думка сцвярджаецца на ўсім працягу паэмы.

Васілю даводзіцца змагацца і сеяць хлеб, у яго дзейнасці паядналіся «праўда зерня» і «праўда барацьбы». Шлях яго не лёгкі і не просты, ды інакшым ён, напэўна, і не мог быць. Тым самым герой паэмы выходзіць за межы свайго «я»: яго «прыватнае» ўзнімаецца да гістарычнага быцця, а духоўны пафас складае пачуццё патрыятызму, абавязку перад зямлёй і грамадствам.

«Маўчанне травы» расчынена ў мінулае і ў будучыню. У селяніне, у яго любові да зямлі, працавітасці, маралі паэт бачыць вялікую стваральную сілу. Менавіта да такой высновы прыводзіць паэма В. Зуёнка. Паэт пераканаўча гаворыць пра адзінства «зерня праўды» і «праўды зерня». «Я з полем звязан не кавалкам хлеба — тут і жыццё, і смерць, і бессмяротнасць»,— вось перакананне галоўнага героя. Ён пражыў цяжкае, складанае, але сумленнае жыццё. Пражыў на зямлі, абараняючы яе, вырошчваючы на ёй хлеб, востра адчуваючы адказнасць за свае паводзіны.

Васіль усведамляе сябе звяном у ланцугу чалавечай пераемнасці. Яго стваральная актыўнасць грунтуецца на гуманістычных традыцыях працоўнага чалавецтва.

Ёсць у паэме вобраз травы, які бярэцца ў розных вымярэннях і гранях: «маўчанне травы», «пакуты травы», «надзея травы»,— гаворка ідзе пра народнае жыццё, якое трэба ахоўваць, бараніць і берагчы ад войнаў і рознага роду непажаданых і непатрэбных сацыяльных эксперыментаў і разбурэння.

У ліра-эпічным характары «Маўчання травы» аўтар дасягнуў значнага ўзроўню філасофска-этычнага і гістарычнага асэнсавання жыцця. Паэт не хацеў бы, каб звужаліся далягляды сялянскай культуры — лепшае, што ў ёй ёсць, павінна ўзбагачаць усю сучасную складаную цывілізацыю. Галоўны маральны вывад, які вынікае з паэмы, заключаецца ў неабходнасці захавання працягу і развіцця лепшых гуманістычных традыцый мінулага, той дэмакратычнай культуры, якую выпрацавалі нашы продкі.

Гэтым паэма скіравана ў будучыню.

## НОВЫЯ АБСЯГІ

Памятны для В, Зуёнка 1982 год — ён быў абраны сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў рэспублікі, што, вядома, дабавіла клопатаў і накладала дадатковую мастакоўскую адказнасць.

У 1982 годзе ўбачыў свет зборнік вершаў «Світальныя птушкі».

«Світальныя птушкі» В. Зуёнка напомнілі мне словы Л. Ляонава: «Старонкі кнігі павінны ўспрымацца не толькі як тэкст, але і як лесвіца, па якой можна пранікнуць ва ўнутраны свет пісьменніка».

Змястоўна ўжо сама назва — «Світальныя птушкі».

У народзе лічаць, што на світанні ў птушкі асабліва чысты, звонкі і добры голас. Гэта ў поўнай меры можна аднесці да творчай задумы В. Зуёнка, яго разумення сутнасці паэтычнай творчасці. Аднак назва кнігі ў дадзеным выпадку нясе ў сабе і больш шматзначны сэнс: світальныя птушкі — думкі паэта, што ляцяць над зямлёю.

Ляцяць, калі днее
Надзорная сцежка,—
Ніхто не развее,
Ніхто не суцешыць.

Ніхто не стрымае —
Узяць на паслужкі...
З якіх небакраяў
Вы будзеце, птушкі?..

Ляцяць, як захочуць,
Ляцяць без дазволу...
Глядзіць ім у вочы
Марозны мой золак.

Глядзіць і пытае
Над цемраю чорнай:
А дзе яна, тайна
Бяды нескончонай?

Гэта адначасова і вобраз трывогі («прарастаю трывогамі»), якая кружыць над сучасным светам, прымушае непакоіцца і хваляваца. Паэт не перастае думаць аб сваім прызначэнні, месцы ў жыцці. Сваю задачу ён бачыць найперш у тым, каб узмацняць пачуццё трывогі, адчуванне небяспекі, якая навісла над сучаснікам.

Як холад апраметны
Кайданіць вышыню,

Мая душа над светам —
Краплінкаю агню.
Каб некаму ў дарозе
Хоць трошкі пасвяціць,
Каб некага ў знямозе
Сагрэць,—
Ляціць, ляціць...

Прывычны для паэтыкі В. Зуёнка маштаб: чалавек і свет.

У новай кнізе выразна адчуваецца ранейшая сацыяльна-эстэтычная аснова творчасці паэта, маральная бескампраміснасць лірычнага героя, маштабнасць погляду на з'явы, знаёмая нам па папярэдніх кнігах. Але «ўток» у многім іншы: у параўнанні з папярэднімі гэта кніга выглядае больш шматстайнай, дынамічнай. Часцей, чым раней, бачым паэта ў дарозе, у руху, у назіраннях, што, безумоўна, павялічвае магчымасці і абсягі размовы пра сучасныя з'явы грамадскага жыцця. Адпаведна мяняецца і стылістыка: з'яўляюцца рысы нарысавасці, дзённікавасць, рэпартаж, замалёўкі.

Я трыццаць год на асфальце,
А ўсё яшчэ цяжка хаджу —
Сутулены,
Нібы за плугам,
Над баразною —
Плечы да сонца.
Іду і ўглядаюся долу,
Каб не наступіць
На краску
Ці на жаўрукова гняздо.

Хіба не нагадвае лірычнае «я» ў гэтым вершы героя-аратага з першай кнігі «Крэсіва»? Ён і цяпер ідзе па абранай дарозе — з мінулага ў будучыню, але нешта ўсё ж змянілася ў яго лёсе.

А я ўсё іду —
Як паэт,
Што збіўся з вясковага рытму,
А рытм гарадскі не асвоіў
І на верлібр перайшоў...

«Верлібр» — у дадзеным выпадку — не толькі тып верша, але і новая канцэпцыя жыцця, якое бачыцца паэту ў яго рэальным напаўненні, у шматстайнасці «высокага» і «нізкага», у багацці штодзённай прозы. Пры гэтым з'явы глабальнага парадку і падзеі менш значныя, «камерныя» набываюць у яго паэзіі роўныя правы грамадзянскага голасу.

Адчуваецца, што яго па-ранейшаму вельмі хвалюе пытанне маральна-эстэтычных адносін да рэчаіснасці, ён зноў і зноў асэнсоўвае сваё мастацкае крэда, разуменне місіі паэта ў сучасным свеце. «Я не кумір — я чорны раб» — так пачынаецца яго верш пра свой грамадзянскі абавязак. Як разумець гэты выраз — «чорны раб»? Пачытаем далей:

Я не выбраннік — я крыло
Рукою замяніў пачварнай
І ў зрэнкі, як у жарало,
Штодня ссыпаю плён базарны.

Мне пры гэтым успамінаецца пушкінскі «Прарок».

И внял я неба содроганье,
И горний ангелов полет,
И гад морских подводный ход,
И дольней лозы прозябанье.

Пушкін у сваім вершы стварыў вобраз паэта-барацьбіта за праўду і непадкупнасць, якому наканавана пранікаць у глыбінную сутнасць з'яў. Разважанні Зуёнка аб долі і прызванні паэта — у рэчышчы пушкінскай традыцыі: аўтар «Світальных птушак» бачыць абавязак паэта ў пазнанні жыцця ва ўсім яго аб'ёме («Нутро эпохай прарасло»), у чалавечнасці («багоў заўжды на свеце многа, бо чалавекам быць — цяжэй»). Ён не абыходзіць эмпірычную стракатасць быцця, паэтызуе «стыхію і розум дарог», якія вяртаюць чалавека да адчування жыццёвай навізны і праўды.

Кніга стваралася ў той перыяд часу, які потым назвалі застойным, але скіравана супраць застою і ідэалізацыі рэчаіснасці. Ёсць падставы сцвярджаць, што тут з вялікай сілай выявіўся выкрывальны дар паэта, здольнага востра рэагаваць на ганебныя з'явы рэчаіснасці, якіх у нас, на жаль, вельмі шмат.

Востра, з'едліва напісаны верш «*** Праўду рэзалі згарача...», скіраваны супраць ананімшчыкаў.

Праўду рэзалі згарача,
Праўду рэзалі ўсе з пляча:
Каб узвысіць яе цану,
Каб зарэзаць не праўду — ману.
Як жа праўду рэжам цяпер?
Дык як хто. А ён — напавер:
З-за вугла, у кулак, з-за спіны,
Ананімна, сабе ў штаны.

Ананімшчык у разуменні паэта з'ява не выпадковая, а — параджэнне часу, які меў патрэбу ў такім сацыяльным тыпе, калі чалавек выхоўваўся ў атмасферы падазронасці і нездаровага суперніцтва.

Вось што значыць культурны прагрэс —
І прагрыз, і працяў, і пралез.
Вось што значыць умець пісаць:
Праўду ў вочы не трэба казаць.

Зборнік «Світальныя птушкі» вельмі разнастайны ў жанравых адносінах. Тонкі лірык, аўтар аказваецца адначасова і тэмпераментным публіцыстам, непрымірымым да розных праяў мяшчанства, спажывецкай, эгаістычнай маралі.

У зборніку ёсць верш, якому папярэднічае эпіграф: «Бабруйская зверагаспадарка прымае ў неабмежаванай колькасці коней па цане 40 кап. за адзін кілаграм жывой вагі» — знойдзены сярод газетных аб'яў.

На вагі, на вагі, на вагі,
Ветэраны капытнай цягі!
Смялей, вараныя, гнядыя!
Больш хамут не намыліць шыю.
На вагі, на вагі, на вагі,
Палёў рабацягі!..
Адшумела, адкаласіла
На загонах конская сіла...

Коні аказаліся патрэбныя на зверафермах, але ўжо ў якасці корма для іх насельнікаў — «чорна-бурых лісіц і норак». Вядома, тут можна абурыцца, запярэчыць: «Што ж вы робіце? Гэта бесчалавечна!» І г. д., і г. д. Аднак нельга не прызнаць, што ёсць свая логіка і ў дзеяннях бабруйскіх «зверафермераў», хоць і далёка не паэтычная. І справа не толькі ў тым, што паэт асуджае «безгаспадарчыя» дзеянні сучасных гаспадарнікаў,— для яго зноў пытанне ўпіраецца ў нашу бездухоўнасць, у нігілізм, адсутнасць разумных адносін да мінулага і традыцый, страту спрадвечнага ладу ў жыцці...

В. Зуёнак — паэт сучаснасці. Ён бачыць, што сучаснасці не хапае высакароднасці і гераізму, і, наколькі можа і як можа, пратэстуе супраць такога ходу рэчаў.

Кілаграм па чатыры грыўні...
Спяць вятры ў скасмыленай грыве...
Дзе падкова сталёвай адвагі?
Як зямля, гайдаюцца вагі.
Кілаграм — па чатыры грыўні.
Кілаграм, капытамі грымні!

Ён нічога не тоіць, ідзе ад праўды фактаў.

Адвыклі казаць: «Купіў»,
Гаворым часцей: «Дастаў...»
Адвыклі казаць: «Грабе»,
Гаворым часцей: «Сабраў...»

За словам для яго стаіць з'ява, таму ён і ўважлівы да яго сацыяльнага гучання. Пры гэтым ён не абмяжоўваецца фіксацыяй з'явы, а імкнецца зразумець яе сацыяльныя і маральныя прычыны і карэнні. Працяглы час мы рабілі выгляд і гаварылі, што ў нас пабудавана грамадства развітога сацыялізму, што ў выніку скасавання прыватнай уласнасці нарадзіўся новы чалавек, для якога ўласціва «поўная эмансіпацыя чалавечых пачуццяў і якасцей», «пераадоленне адчужэння», вяртанне да «сапраўднай чалавечай сутнасці»[1]. Аднак, як высветлілася, гэтага, на жаль, не адбылося. Больш таго, адбыўся рэгрэс — адыход, адступленне ад высокіх чалавечых норм. Сучасны В. Зуёнак — паэт-філосаф, які, можа, як ніхто, акрамя яго, уважлівы і цярпімы да чалавечых недахопаў, але ён востра крытыкуе гэты адыход ад высокіх маральных норм: «Развучыліся гаварыць — пераходзім на ананімкі».

Ён забіў трывогу, з болем загаварыў пра раз'яднанасць, узаеманепаразуменне, душэўную спустошанасць многіх сваіх сучаснікаў.

Кілокалорыі — спажыва цела,
Кінокалорыі — спажыва духу.
Каля экранаў пажывацела
Б'ём інтэлектагаладуху...

За гэтым вобразам «тэлемалітвы» стаіць адчуванне той небяспекі, якая тоіцца ў супердынамізме сучаснага жыцця, у недахопе часу, павярхоўнасці і хуткаплыннасці ўражанняў. Паэт бачыць, што ўсё гэта можа абярнуцца нецікавасцю да навакольнага свету, імітацыяй духоўнага жыцця, здрабненнем асабовага пачатку ў чалавеку.

У сваіх творах ён імкнецца супрацьстаяць застою, абараняць традыцыйныя духоўныя каштоўнасці.

У філасофіі ёсць паняцце «якасці жыцця», даволі складанае па сваім змесце,— сюды ўваходзіць цэлы шэраг патрабаванняў, якія вызначаюць уклад, узровень, рытм і стыль штодзённага чалавечага існавання. Паэт выступае супраць тых, хто хацеў бы ўсё звесці да прагматызму і утылітарнасці,— у гэтым яго маральны пафас. «Каму эпохі — каму панчохі» — такое супрацьпастаўленне знаходзім у адным з вершаў. Вядома, аўтар не лічыць яго абсалютным, бо і панчохі, і

[1] У двукоссі пададзены найбольш ходкія паняцці з сучаснага філасофскага ўжытку.

скуранкі, і дублёнкі, пра якія ён успамінае,— прадметы побыту і ўжытку, якія ў пэўным сэнсе таксама характарызуюць якасць нашага жыцця. Але дабрабыт — яшчэ не ўсё, і паэт хоча, аднак, узняць сучасніка на больш высокі абсяг быцця. Гэта патрабуе немалых намаганняў і вызначае філасофскую настроенасць яго верша. Традыцыйны вобраз: матэрыя і дух — як два крылы.

Два крылы ў мяне —
Зямля і неба.
Я лётаў на іх яшчэ не нарадзіўшыся.
Лётаў пад гукі матчынай калыханкі.
Потым стаў хадзіць па зямлі,
Іншы раз узнімаюся ў неба,—
Усё на адным, на адным крыле.
Калі ж, калі зноў на двух?
Скажыце, зямля і неба.
Можа, тады, як зліюся з вамі?

Што трэба зрабіць дзеля таго, каб, не адрываючыся ад зямнога, узняцца на новы, больш чалавечны абсяг разумнага існавання?

Зуёнак хоча шырока зірнуць на чалавека. ён імкнецца пазнаць чалавека. Можа, таму яго герой шмат пытаецца: «Пытаннем на свет чалавек зірнуў». Гэта павялічвае жыццёвую напоўненасць верша, яго эстэтычную ёмістасць. Яго хвалююць фундаментальныя пытанні чалавечага быцця, сучасную нашу рэчаіснасць ён уключае ў кантэкст агульначалавечай філасофскай праблематыкі. «На скрыжаваннях сусвету хто мы і колькі нас?» Паэзія павінна канцэнтраваць у сабе і нацыянальную і агульначалавечую свядомасць. «Мой люд, сябе не збудзься, мой лёс, не стань бяскрылым». Пашырэнне сацыяльна-гістарычных, духоўных даляглядаў — вось што ў значнай ступені ўласціва паэтычным пошукам В. Зуёнка. Ён хоча стварыць пэўную маральную атмасферу, фарміруе духоўнае аблічча чалавека, сістэму яго каштоўнасных арыенціраў.

Якія гэта арыенціры?

Першы з іх — памяць. Адзін з вершаў так і называецца — «Памяць».

Дай, памяць, сілу мне,
Апору ў крутаверць.
Нікога не міне
І не адпусціць смерць.
Свой тэрмін усяму —
Квітненню і пладам.
Адну цябе вазьму —

Нікому не аддам.

На гэту «тэму» паэт пісаў і раней, аднак менавіта цяпер голас яго набыў асаблівую лірычную глыбіню і пранікнёнасць.

У слоўніку В. Ластоўскага даецца такое вызначэнне паняццю «нігілізм»: «вучэнне, якое адкідае ўсё, чаго нельга ашчупаць». Сучасныя нігілісты шмат зрабілі, каб адкінуць, закрэсліць, затаптаць наша мінулае, як быццам яго і не было. Паэт супрацьстаўляе ім сваё ўяўленне аб памяці як аб нечым абсалютна рэальным, прадметна адчувальным, жывым і існуючым.

Адну цябе — з сабой:
Зарукаю зямной
Хай жорсткі твой прыбой
Не гасне нада мной.
На стылым рубяжы
Адным мяне ратуй:
Няхай усё, чым жыў,
Мне помніцца адтуль...

Аўтару «Світальных птушак» заўсёды вельмі блізкай была думка вядомага савецкага паэта Мікалая Ушакова, які сцвярджаў, што «жыццё чалавека становіцца цікавым толькі ў судакрананні з гісторыяй і часам», аднак сёння чалавечая памяць асэнсоўваецца ім і сама па сабе як фенаменальная духоўная каштоўнасць.

Бяспамяцця вякі
З душы хай ападуць:
Цяжкія жарсцвякі —
А мёртвыя жывуць!

Буйным планам убачана постаць салдата Вялікай Айчыннай вайны ў вершы «*** З-пад гусеніц, з-пад руін...».

З-пад гусеніц, з-пад руін,
З агню безыменных страт
Са смерцю адзін на адзін
Апошнім выходзіць салдат...

Гэты салдат — увасабленне нашага сумлення, маральнасці. Паэт справядліва трывожыцца за нашы маральныя, духоўныя вышыні, якія, здараецца, «і сёння здаюць». «І засціць салодкі дым // Вышыні і гарады». Салдат, што ўявіўся паэту неспакойным прывідам вартавога, увасабленнем маральнай чысціні, павінен дапамагчы вярнуць гэтыя «вышыні і гарады».

І ў сэрцах заснуў салдат,
Якому ўсё браць назад.

Паэт не дазволіць сабе апусціцца да дробязей, да побыту — гаворка ідзе пра бітву дабра са злом, ён арыентуе чытача на вяршыні чалавечага духу. Верш спалучае пранікнёны лірызм з плакатнай публіцыстыкай, рэалістычную дакладнасць пісьма з узнёслай, але не адарванай ад зямлі рамантыкай.

Тэма памяці гучыць у вершах «Узараны ўспамінамі», «*** Я трыццаць год на асфальце...», «Помнік Якубу Коласу», «*** Імён і дат вялікія планеты...», «Тры дарогі», «*** Жывеш, пакуль жывыя...» і інш., скіраваных на разгадку таямніц нашага духоўнага быцця.

Жывеш, пакуль жывыя,
Хто нарадзіў цябе,
Хто на кругі зямныя
Праводзіў у журбе.
А пойдуць — і абдыме,
Прашэпча пустата:
«Ты — напалову з імі,
Ты напалову — там».
Жывеш — як часу даннік,
Надзея і працяг,
Нясеш цану пазнання
І смерці, і жыцця.
І з імі паяднаны
Той страшнаю цаной.
І дні ідуць за днямі,
А памяць — за труной.

У гэтым выдатным вершы таксама праяўляецца духоўная актыўнасць паэта і маральная патрабавальнасць у адносінах да чалавека і часу.

Найвялікшы носьбіт памяці — народ.

На скрыжаваннях сусвету
Хто мы і колькі нас?
Пылінка. Малая пры гэтым.
Драбок галактычных мас.
А песня свая і мова
Нам дадзены недарма:
Народу няма напалову —
Ён ёсць ці яго няма.

Памяць абвастрае маральную адказнасць за тое, што сёння адбываецца. У радку абуджаецца палемічны запал, нацыянальныя традыцыі якога ідуць з сівой даўніны — ад беларускай літаратуры XVI-XVII стагоддзяў, калі жылі і пісалі такія публіцысты, як, скажам,

А. Філіповіч. Гэта, думаецца, і да іх памяці звяртаецца паэт, гаворачы са сваімі сучаснікамі:

І нельга забыцца, пазбыцца —
Яны не даруюць нам:
Мы з іх — як рэчка з крыніцы —
Выходзім насустрач сынам.
Выходзім насустрач нашчадкам
І на скрыжалі вякоў
Нясём не пагрозы і звадкі,
А мудрую памяць бацькоў...
Чыя ж гэта песня і мова
І хто гэткі знае народ —
Жывы, калі мёртвае слова
І голас пайшоў на зблот?

Другі арыенцір — «вочы прыроды». Гэта тэма з першых радкоў прысутнічае ў яго творчасці, знаходзячы ўсё больш глыбокае мастацкае асэнсаванне. Так, паэт бачыць сваё адлюстраванне не толькі ў сферы духу, але і ў прыродзе, якая з'яўляецца крыніцай і стымулятарам вечнага працэсу стварэння, развіцця і ўзнаўлення маральных першаасноў чалавечага існавання на зямлі. Ён у чымсьці набліжаецца да думкі, якую ў свой час — на мове навуковай філасофіі — сфармуляваў Ф. Энгельс, які лічыў чалавека часцінай прыроды: «...на кожным кроку факты нагадваюць нам пра тое, што мы зусім не маем над прыродай такой улады, якую заваёўнік мае над чужым народам, не уладарым над ёй так, як нехта, хто знаходзіцца па-за прыродай,— што мы, наадварот, нашай плоццю, крывёю і мозгам належым ёй і знаходзімся ўнутры яе, што ўсё наша панаванне над ёй заключаецца ў тым, што мы, у адрозненне ад усіх іншых істот, умеем пазнаваць яе законы і правільна іх прымяняць...»[1]

Цяпер слову «прырода» ў паэзіі В. Зуёнка, як і паняццю «памяць», надаецца яшчэ больш глыбокае і змястоўнае значэнне. Прырода для яго — усё існае на зямлі, увесь свет, а найперш сукупнасць натуральных умоў існавання чалавечага грамадства, уключаючы і самога чалавека.

Ён верыць у выратавальную сілу прыроды, у яе выхаваўчую ролю. З гэтага пункту гледжання глыбокі філасофскі змест тоіцца ў вершы «Непаўторнасць». У ім прысутнічае ёмісты вобраз — «вочы прыроды». Умоўна-асацыятыўны па форме, ён вельмі значны па сваім маральна-эстэтычным напаўненні, аснову якога складае жыццёвы

---

[1] Маркс К. и Энгельс Ф. Соч. Т. 20. С. 496.

вопыт паэта. Паводле яго разумення, «вочы прыроды» — гэта нешта жывое і разумнае. Яны надзелены дарам маральнага ўздзеяння.

Прыходзіць жа аднойчы
Такая вышыня:
Глядзяць прыроды вочы
Штоночы і штодня.
Глядзяць табе насустрач,
Глядзяць табе наўслед.
І ты ўжо — невідушчы —
Бачыш цэлы свет...

У гэтым адчуванні свайго чалавечага адзінства з сусветам угадваецца цютчаўская духоўная сіла, скіраваная на разгадку жыцця і смерці, дабра і зла. Беларускі паэт асэнсоўвае «Жыццё — як непаўторнасць, Як непазбежнасць — тло». Думка ўзнімаецца на светапоглядную вышыню, сцвярджаючы жыццё як каштоўнасць, якую ніхто не мае права насільным, ненатуральным, згубным чынам адабраць у чалавека.

Удакладняюцца формы стаўлення да свету сацыяльна-маральнай практыкі сучаснага чалавека, адносіны да прыроды, законы якой, аказваецца, распаўсюджваюцца і на чалавека.

Звернемся да верша «*** Дала прырода мне ваду і цвердзь...»:

Дала прырода мне ваду і цвердзь,
Дала агонь, каб не блукаў я слепа,
Дала жыццё, а з ім дала і смерць...
Дала зямлю — а я глядзеў у неба...
А каб агонь свяшчэнны не патух,
Каб зноў не захлынуўся чорнай багнай,
Дала прырода мне высокі дух.
А я стварыў багоў — я неба прагнуў...

У перыяд, калі рыхтавалася кніга, у творчасці паэта значнае развіццё атрымаў жанр натурфіласофскай лірыкі. Гэтая акалічнасць знайшла адбітак у зборніку і пра многае сведчыць.

У сусветнай літаратуры натурфіласофская лінія бярэ пачатак ад паэмы Лукрэцыя «Аб прыродзе рэчаў». З таго часу многія паэты звярталіся да гэтага жанру. Паэзія В. Зуёнка заўсёды шырока асвойвала навакольны свет прадметаў і з'яў. Лексіка-семантычны масіў яго кніг складаюць паняцці і тэрміны, якія маюць адносіны да розных сфер жыццядзейнасці чалавека.

У вершы, да якога мы звярнуліся, разглядаецца старажытная антыномія «зямля і неба», «быццё і свядомасць», «матэрыя і дух», не вырашаная і да нашага часу. Аўтар паэтызуе неспакойны дух

чалавека, яго апантанасць у пазнанні свету і бясконцасць гэтага пазнання. Філасофская лірыка В. Зуёнка ўмацоўвае сувязь неба і зямлі. У дадзеным выпадку паэт не спяшаецца апусціць чалавека на зямлю, «знізіць» яго да штодзённых праблем побыту.

Сучаснік атрымлівае надзвычай вялікі аб'ём інфармацыі аб навакольным свеце, якая значна рассоўвае, пашырае межы нашых ведаў, мяняе многія навукова-філасофскія ўяўленні.

Я шмат чаго тады не разумеў,
Як і цяпер, бадай, не разумею.
Я іх ствараў, і з імі я старэў,
Як і цяпер ствараю і старэю.
Усё, што сёння ісцінай слыло,
Назаўтра толькі рэхам адгукнецца.
І сіняй птушкі сіняе крыло
Кавалкам неба ў сэрцы разаб'ецца.

Філасофскія паняцці і вызначэнні перакладаюцца на вобразную мову паэзіі, якая, аднак, кранае і хвалюе не толькі сваім эмацыянальным зместам — яна ўздзейнічае на чытача глыбінёй і праўдзівасцю пазнання чалавечага свету — як знешняга, так і ўнутранага. Роздум аб чалавеку, прыродзе, сусвеце спалучаецца з шчодрым душэўным самавыяўленнем мастака, багатага на дабрыню і шчырасць. Далёка не кожны паэт, які ўмее адлюстраваць непасрэднае лірычнае перажыванне, умее перадаць рух думкі, якая вызначаецца паэтычнай свежасцю і дакладнасцю, тонкім лірызмам і разам з тым унутраным драматызмам.

Верш «*** Дала прырода мне ваду і цвердзь...» разгортваецца ў цэлы навукова-паэтычны трактат.

Быў атам — «непадзельны» — атам-бог.
Цяпер — цяпер ажно дыханне займе,
Калі ступаю праз яго парог —
Галактыку адкрыць у пі-мезоне.
Якое неба заўтра засялю?
З якіх арбіт пабачацца мне цуды?
Не ведаю. Адно скажу: зямлю —
Вось гэту, грэшную, ніколі не забуду.
Як ёсць яна — я сэнс вышынь лаўлю,
Ствараю неба — сонечны паганец.
А дайце неба — я ствару зямлю,
І пойдзе ўсё зваротнымі кругамі.

Твор пранізаны сучаснымі навуковымі ідэямі. Пры гэтым паэзія валодае сродкамі, не даступнымі навуцы. Яна больш арганічна, чым

навука, адчувае прысутнасць чалавека ў свеце, сярод яго таямніц і загадак. Магчымасці чалавечага розуму бязмежныя, але паэт зацікаўлены, каб ён у дасягненні пастаўленых навукай мэт не паступаўся чалавечнасцю і гуманізмам.

Сёння дзейнасць чалавека дасягнула планетарных маштабаў. Паэт прыходзіць да думкі аб неабходнасці «раўнавагі», гармоніі паміж натуральным быццём прыроды, яе ўласным, унутраным, так сказаць, існаваннем, і «вытворчай» працай на людзей. Чалавек В. Зуёнка выступае як адкрывальнік і творца, які дзейнічае ў гарманічнай згодзе і суадпаведнасці з прыродай.

Часам паэту шкодзіць залішні, як нам здаецца, рацыяналізм, некаторая адцягненасць, якія, на нашу думку, адчуваюцца, напрыклад, у вершы «Агонь».

Згарае атам, і згарае дрэва,
Каб нарадзіцца зноў упершыню.
Натура вечная, а формы — ад агню,
Жыццё расце на сонечных сугрэвах.

Паэтычная прырода гэтых радкоў несумненная. Але, на мой погляд, ёсць і адчуванне некаторага рацыяналізму, звязанага, відаць, перш за ўсё з выдаткамі інтэлектуалізацыі лірычнай паэзіі, некаторай стратай эмацыянальнага пачатку паэтычнага перажывання.

Паняцце «агонь» у В. Зуёнка набывае вобразна-асацыятыўнае значэнне і мае ў яго паэзіі шырокі семантычны кантэкст.

Старажытны філосаф Геракліт лічыў, што свет, у якім мы жывём,— гэта «вечны жывы агонь, які мерна загараецца і мерна патухае», што ўсе рэчы выплаўляюцца з агню. Агонь і ў Зуёнка выступае як рухавік жыцця: «Натура вечная, а формы — ад агню, жыццё расце на сонечных сугрэвах», як маральны фактар, які дапамагае абнаўленню ўсяго існага. І ўсё ж такі... цяжка адмовіцца ад уражання, што ў гэтым вершы ёсць нешта і ад філасофскага трактата, у якім асабова-аўтарскі пачатак гучыць некалькі прыглушана.

Умоўна-асацыятыўнае асваенне свету не супярэчыць яго шматколернасці і сакавітасці фарбаў, яго пластыцы.

Прагрукатаў над хатаю і знік
За небам сёмым
сіні штурмавік.
Аблокамі застылі ў вышыні
Кавалкі
цішыні.

Мастацкі стыль аўтара «Світальных птушак» вельмі ёмісты. У яго — свая «чаканка», вобразнасць найбольш звязана з імкненнем да

маштабнасці, глабальнасці светаўспрымання, да шырокіх, духоўна-завостраных абагульненняў. Звычайнае, бытавое ён умее узняць надзвычай высока.

Пра ленінскі плед, які падарыла Уладзіміру Ільічу маці, у Зуёнка сказана:

Усёй планеты ўсе мацерыкі
Ён ахінае з матчынай рукі.

Паэт даследуе стан свету, даследуе своеасабліва. Ён, паводле слушных назіранняў Г. Далідовіча, «не сканцэнтроўваецца на сабе, але сканцэнтроўвае свет у сабе, асэнсоўвае яго, жыццё, дабро і зло, шукае ідэйна-маральны ідэал, сваю пазіцыю — здабывае чароўны агонь паэзіі» («Літаратура і мастацтва». 1982. 16 ліп.). Гэта дазваляе яму вастрэй адчуць зменлівасць свету. Паэтычны пошук у Зуёнка звязаны з ростам асобы, узбагачэннем духоўнага свету чалавека стваральнай памяццю. Пафас кнігі — у непрымірымасці да прыстасавальніцтва, прагматызму, да мяшчанскай спажывецкай філасофіі, якая спараджае бездухоўнасць, дэгуманізуе чалавека. І гэта якраз тое, што надае кнізе цэласнасць, канцэптуальнасць, што аб'ядноўвае яе раздзелы ў адно.

Асоба лірычнага героя ў многіх выпадках выступае як прызма аўтарскай свядомасці, у якой знаходзяць праламленне важнейшыя праблемы сучаснасці. На свайго героя — хаця гаворка ідзе ад імя асабістага «я» — паэт глядзіць як бы крыху збоку. Такая пазіцыя дазваляе яму, не адрываючыся ад зямлі, узняцца над штодзённасцю і па-новаму, у новых вымярэннях зразумець узаемаадносіны чалавека і свету. А яны выглядаюць вельмі драматычна. У чалавека безліч пытанняў — адказу ж няма!

Пытанне ёсць прадчуванне ісціны.
Пытанне за глотку бярэману.
Пытаннем усё было калісьці.
Пытаннем на свет чалавек зірнуў.
А колькі пытанняў схавана
ці ўкрадзена...
Ды крыж іх нясе непадкупны час:
Калі аднойчы пытанне зададзена —
Павінен быць і адказ.

Верш выглядае даволі нечакана на фоне ўсеагульнай «улагоджанасці» 70-х — пачатку 80-х гадоў. Паэт нутром адчувае трывожную загадкавасць быцця, яго падземныя штуршкі. Ён параўноўвае сябе з Архімедам.

Меў намеры стары Архімед

Рычагом падасверыць свет.
Я таксама надзею нашу.
Пункт апоры таксама прашу:
«Дайце мне яго толькі — і я
Падужэю ўдвая і ўтрая...»

Вагай для паэта — ягоны радок, якім ён хоча растрывожыць грамадзянскае сумленне чалавека і ўсеагульны сон і заспакоенасць грамадства, характэрныя для перыяду застоя.

Я нашу надзею з надзей:
Гнёт звярнуць у людзей з грудзей.
Я падважыць адважыўся свет
Беспрасветны — маны і бед.
Толькі словы не тыя, відаць,
Што цяжар не магу падгайдаць.
І да месца як быццам яны —
Ды ні з месца горы маны...

Паэтам валодае, можна сказаць, адчай: слова аказваецца бяссільным і бездапаможным, каб што-небудзь перайначыць, і ўсё ж такі ён не падае духам.

Тут варта ўспомніць словы А. Блока з яго дзённіка: «Дело поэта вовсе не в том,— пісаў ён,— чтобы достучаться непременно до всех олухов».

Ды і далёка не ўсякі чалавек здольны настроіцца на адну хвалю з паэтам, не кожны здольны на такое душэўнае суперажыванне.

Духоўны свет В. Зуёнка як паэта другой палавіны XX стагоддзя яскрава і дакладна і з незвычайнай эмацыянальнай паўнатой адлюстраваўся ў наступным вершы:

Узараны ўспамінамі,
Як нарогамі поле.
Пад спякоту палынную
Засеяны болем.
Прарастаю трывогамі,
Як зямля каранямі,
Як імкненне — дарогамі,
Як цемень — агнямі.
Узыходжу чаканнем,
Як вечнасць, бясконцым,
Як травінка праз камень:
Без сонца — да сонца.
Узлятаю надзеямі,
Як жаўранак весні.

Толькі дзе яны, дзе яны —
Поля жніўнага песні?

Якая вобразнасць! Які круты «палявы» замес! Стыль Зуёнка караніцца ў народнай творчасці, але ён — сучасны! Таму што ўбірае ў сябе стылёвы і светапоглядны вопыт літаратуры XX стагоддзя. Асноўнай вартасцю вобразнай думкі паэта становяцца яе высокая маральнасць, глыбіня, прыгажосць і мастацкая пераканальнасць. Час застою не пахіснуў яго маральныя, чалавечыя прынцыпы.

У працы — сэнс, і плён, і праўда,
І запавет, стары, як свет:
Каб ніва ўладжвалася спраўна
І не буяніў пустацвет,
І з іншай радасцю не знацца —
На ўсё жыццё — адзін урок:
Хлеб не расце пад гром авацый.
І ў гэтым тайна. І зарок.

Крыху дыдактычна? Магчыма. Аднак вынашана, узважана, праверана, атрымана ў спадчыну і перададзена як запавет — наступнікам. Афарыстычнасць, прадметнасць спалучаюцца з дакладнасцю мастацкіх вобразаў, празрыстай яснасцю паэтычнага радка. Дыдактыкі не можа быць там, дзе ёсць нераўнадушнасць і неспакой,— а яны заўсёды былі родавымі рысамі яго таленту, як і імкненне да вобразнага-стацкага асваення свету. Паэт адмаўляе практычна-утылітарныя павучанні, грунтуецца на асабіста пражытым, што добра вядома яму на ўласным жыццёвым вопыце.

Паэзія В. Зуёнка выпраменьвае святло радасці дабрыні і чалавечнасці, якія засталіся, перамаглі, нягледзячы ні на што. Светлымі, незамутнёнымі вачыма глядзіць ён на дзяцінства сваіх равеснікаў, якое пры ўсіх нягодах заставалася і застаецца светлай парой чалавечага веку.

«Гыля, гыля, гусанькі,
Да ракі...»
Дзе мае хаўруснікі —
Дружбакі? .
Кульба часу топчацца
Па спіне,
Ці гукаць вас, хлопчыкі,
А ці не?
Пэўна, не пачуеце
Ля кастроў
Пастушка-мачулінца

З-за муроў...
Як прыйду — без імені —
Я здалёк,
Ці пазнаеш ты мяне,
Васілёк?
«Гыля, гыля, гусанькі...
Дзе вы, дзе?..»
Ціха, нікагусенькі...
Хутка дзень.
Белы снег кружыцца —
З-пад крыла пух,
Што ў маёй падушачцы —
Нам, на двух.

Пра верш можна шмат гаварыць — пра яго сэнсавую ёмістасць, сувязь з фальклорам, наяўнасць двайніка — таго пастушка-мачулінца Васілька, што сядзеў сярод такіх, як і ён, хлопчыкаў ля кастра, пра цудоўнае майстэрства паэта, спалучэнне глыбокага песеннага лірызму з сюжэтнасцю і апісальнасцю балады. Найбольш цікавае ў гэтым вершы — лірычны характар самога паэта, які паварочваецца да нас інтымна-задушэўным бокам сваёй асобы, раскрываецца ў глыбока ўнутраных рухах пачуцця. У інтымным паэт імкнецца знайсці і знаходзіць агульны сэнс: нам блізкі і гэты пастушок — герой верша, і яго сябры, што грэюцца ля вогнішча, і гусі, якія пасвяцца непадалёк.

Верш навязвае думку пра феномен дзяцінства, да якога ў чалавека на ўсе гады захоўваюцца цёплыя, нераўнадушныя пачуцці і памяць, і пра разнастайнасць людскіх лёсаў, якія вядуць з дзяцінства ў неспазнанасць жыцця...

Б'ецца жывая чалавечая душа ў вершы «*** На заходзе — чырвань хмурыя...», таемная загадка якога раскрываецца так усмешліва-нечакана... Герой гэтага верша — сам паэт з яго здольнасцю бачыць свет прыгожым і чалавечным.

* * *

У В. Зуёнка ёсць, як ужо гаварылася, зямляк-касманаўт У. Кавалёнак, які ўпершыню ўзляцеў на небную арбіту ў першай палавіне 70-х гадоў, а ў 1978 годзе ўзняўся ў космас разам з Аляксандрам Іванчэнкавым. У прысвечаным гэтай падзеі артыкуле «Адрас прыцягнення», што з'явіўся ў тым жа 1978 годзе, В. Зуёнак пісаў:

«Здаецца, яшчэ гучыць ён з касмічнай арбіты — бадзёры, урачыста-дзелавы голас Уладзіміра Кавалёнка,— так прывыклі мы да яго за гэтыя 140 дзён. Здаецца, толькі што з хваляваннем чытаў я

першы раз і перачытваў адрас на канверце: «Зямля, г. Мінск...» Ужо неяк неўпрыкмет амаль дамашнімі зрабіліся для нас гэтыя сустрэчы: Космас, «Салют-6», Уладзімір Кавалёнак, Аляксандр Іванчэнкаў. Мы слухалі іх, мы адкрывалі нязведанае іх вачыма, мы святкавалі з імі, вячэралі, нават пабывалі ў касмічнай лазні. Мы жылі з імі. І, здаецца, неяк сумнавата стала без іх у зорнай прасторы...

Але затое і радасць сёння ў нас — сапраўды касмічная! Радасць сустрэчы з героямі на роднай зямлі».

Пазней была напісана і паэма «Агонь і сонца» пра гэты касмічны палёт. Прысвечаная Уладзіміру Кавалёнку, яна складаецца з дванаццаці раздзелаў, якія аўтар фігуральна назваў «Дванаццаць сеансаў касмічнай радыёсувязі з неабходнымі адступленнямі». Твор кранае як спроба заглянуць у духоўны свет нашага сучасніка, які знаходзіцца на самых перадавых пазіцыях навукова-тэхнічнага прагрэсу. Народнасць светаадчування тут арганічна паяднана з інтэлектуалізмам і філасафічнасцю. Пераконваючыся ў гэтым, даруеш аўтару і некаторую сумарнасць, уласцівую галоўнаму вобразу, і адценні ілюстрацыйнасці, што пакінула свой след на асобных радках, і просты пераказ падзей.

Многія старонкі па-сапраўднаму хвалююць глыбінёй і праўдзівасцю лірычнага перажывання. Напрыклад, там, дзе паэт непасрэдна звяртаецца да свайго героя-касманаўта, які знаходзіцца на арбіце.

Хто зараз ты:
працяг мой у сусвеце
Ці сам сусвет, што да мяне ідзе?
Якім таўром —
скажы мне, ці прыкмеціў —
Між зор адзначаны зямны мой дзень?

Паэт разважае пра месца чалавека ў свеце, пра яго здольнасць арганічна «ўпісацца» у развіццё прыроды, не парушаючы яе натуральных асноватворных працэсаў.

Паэма «Агонь і сонца» — працяг яго натурфіласофскай лірыкі, але тут знайшлі адбітак і чыста зямныя матывы і адчуванні паэта, яго чалавечая задушэўнасць, што таксама родніць яго з героем гэтага твора.

«Я, калі пралятаю над Беларуссю,— прызнаваўся У. Кавалёнак,— заўсёды ўглядаюся ў родныя мясціны... Лічаныя секунды ляціш, а ў думках адразу ўяўляеш дубровы, палі, лугі, нават узбалоткі згадваеш, дзе грыбы даводзілася збіраць».

Але ж гэта вельмі блізка В. Зуёнку. Разам з касманаўтам ён прыгадвае родныя мясціны, шляхі-дарогі, успамін аб якіх не перастае

цешыць чалавечую душу нават тады, калі яна раптам апынецца на небнай вышыні касмічнай арбіты.

«Пасля палёту,— прызнаваўся ў свой час вучоны-касманаўт К. Феакцістаў,— наколькі па сутнасці невялікая наша Зямля, наколькі яна кволая і безабаронная...» («Вопросы литературы». 1973. № 1. С. 92).

Беларускаму паэту гэтая думка таксама не чужая.

Паэма «Агонь і сонца» — сцвярджэнне чалавечай еднасці, еднасці ачалавечанага свету, які развіваецца і можа развівацца толькі паводле гуманістычных законаў існавання жыцця.

Я крылы дум узношу летуценна,
Ды не сагнацца з хуткасцю тваёй.
Свяці з нябёс, а я пабуду ценем —
У еднасці:
ты — сонцам, я — зямлёй.

* * *

Зборнік «Світальныя птушкі» паказальны ў многіх адносінах, у тым ліку і ў моўных пошуках яго аўтара. У В. Зуёнка, як некалі трапна зазначыў І. Шклярэўскі, «свой слоўнікавы фонд». «Вагар! Слоў ліхвяр — знай — яшчэ не змагар»,— хто яшчэ з беларускіх паэтаў можа гэтак сказаць? ён ведае, як на новы лад пераасэнсаваць старое слова ці выраз, надаць яму новае адценне: Архімед меў намер «рычагом падасверыць свет». Здараецца, што часам прыдумае і новае слова: *«шыльдуйся».*

С. Ясенін некалі любіў казаць: «Я адчуваю сябе гаспадаром у рускай паэзіі і таму ўцягваю ў паэтычную мову словы ўсіх адценняў, не чыстых слоў няма». У В. Зуёнка моўныя пошукі адлюстроўваюць парадаксальнасць мастацкай думкі, імкненне да вострай формы, смеласць паэтычнага эксперымента. Яны вядуцца ў розных накірунках. Ён любіць, ведае смак гутарковага: *наўслед, зблот, зляканы, вычварае, рукацца...* Тут сутыкаюцца самыя розныя лексічныя рады.

Адзін з раздзелаў зборніка — «Кактэбельскія эцюды». Тут ёсць уласцівая гэтаму паэту вагомасць радка, адчуванне сувязі культурна-моўных традыцый. Аўтар, аказваецца, не толькі паэт, але і ўдумлівы філолаг, які ўмее, скажам, даць беларускае прачытанне слова Карадаг (горны краж у Кактэбелі): даг-гара-дах. Промні асацыяцый заглыбляюцца ў гістарычныя пласты і вяртаюцца ў сучаснасць. Яшчэ раз успамінаюцца словы Цютчава: «Каб паэзія цвіла, ёй трэба мець карані ў зямлі».

Па-новаму адкрываючы ўнутраную форму слова, выносячы на святло старажытную свежасць светаўспрымання роднага народа, паэт яднае эпохі, культуры, народы.

## У ГЛЫБІНЮ ГІСТОРЫІ

У 1984 годзе выйшаў чарговы зборнік «Лукам'е». Ён таксама вельмі разнастайны па сваім змесце. Разнастайны, але не стракаты. Цэласнасць мастацкага светапогляду, дэмакратызм і народнасць аберагаюць паэта ад усялякіх крайнасцей і непажаданых уплываў, дазваляюць яму заставацца самім сабой.

Літоўскі крытык Вітаўтас Кубілюс у артыкуле «Зорны час» — наперадзе?» адзначаў, што «ў сучаснай літоўскай паэзіі... можна вылучыць два значныя псіхалагічныя і эстэтычныя комплексы. Адзін з іх пабудаваны на ўспрыняцці, выхаваным сельскім жыццём,— на вобразах і мелодыях. Другі адлюстроўвае самасвядомасць чалавека, які вырас «на гарадскім бруку» («Литературная газета». 1985. 12 ліп.).

У сучаснай беларускай паэзіі такога рэзкага падзелу, на наш погляд, няма,— і пра мастацкую аўтаномію дзвюх традыцый, у тэматычнай і выяўленчай сферах, гаварыць, відаць, не даводзіцца. На самай справе, хіба можна, напрыклад, лічыць В. Зуёнка — аўтара, на першы погляд, «сельскага», верша «Крыніца»— «вясковым» паэтам? Вось пачатак гэтага верша (які надрукаваны ў зборніку «Лукам'е») :

На скрыжаванні ўсіх дарог,
Усіх вятроў,
усіх эпох
Мая вякуе вёска.
Усіх надзей,
усіх трывог,
Усіх смярцей і перамог
Жывуць тут адгалоскі...

Думаецца, што не. Маральныя і эстэтычныя вытокі яго творчасці народныя ў шырокім сэнсе гэтага паняцця — тут бачна шматгранная мастацкая індывідуальнасць паэта, узбагачанага духоўным вопытам другой палавіны XX стагоддзя. Вёска В. Зуёнка — асяродак сусветных трывог і хваляванняў. Гэта толькі на першы погляд яна глухая і адгароджаная ад жыцця. Не, яна і сапраўды стаіць на скрыжаванні ўсіх дарог-шляхоў, што можна было б адчуць і ў паэмах «Сяліба», «Маўчанне травы», іншых творах.

Зуёнкаўская вёска непарыўна звязана з вялікім светам чалавечага быцця як асобнае з агульным. У гэтым, можна сказаць, сутнасць яго творчай канцэпцыі, якая яскрава прадстае і ў кнізе «Лукам'е».

«Адна з адметнасцей творчай індывідуальнасці Зуёнка,— справядліва пісаў пра яго К. Камейша,— пачынаць з малога, ісці да маштабнасці і потым з усёй грамадзянскай адказнасцю сцвярджаць

вечнасць жыцця, адчуваць сябе яго працягам» («Полымя». 1973. № 10. С. 191). Адсюль — адпаведна эстэтычны густ. Услед за класікамі і разам з сучаснікамі ён, адораны пачуццём гісторыі, узнімае з народных глыбінь невычарпальныя запасы выяўленчых магчымасцей роднай мовы, яе духоўны скарб.

Млечны Шлях у тысячы званоў
Пазыўныя вечнасці вызвоньвае.
Сэрцам прыпадаю да асноў,
Покуль
у запас жыццём не звольнены.
Клопатаў цяжкую чараду
Гэтай зорнай поўначчу бяссоннай
Да зямлі,
да маці я вяду,
У пушчанскі край незаімглёны.

Малая радзіма — вёска — зноў і зноў уладна цягне яго да сябе.

Там усё апірышча быцця,
Там усе вышыні і глыбіні,
Там пачатак мой
і мой працяг —
У падстрэшшы б'ецца галубіным.

Мова паэта становіцца асабліва пяшчотнай і выразна-вобразнай.

Прыпадаю да травы шчакой,
Вуснамі —
да ручая ляснога,
Аблачынку кратаю рукой
Толькі там — ля роднага парога.

І заключныя, вельмі важныя для разумення маральных і духоўных далягядаў радкі:

Што мне вечнасць —
я не цар, не бог...
Сёння я маліўся з баравінаю:
Каб струмень крынічкі не засох.
Каб зямля не стала дамавінаю.

Вёска не засланяе перад ім вялікі той свет, у якім жыве чалавецтва.

Вобраз крынічкі належыць да архетыпна даўніх вобразаў беларускай паэзіі, скразных для яе развіцця. Крынічка сімвалізуе сабой жыццё, неўміручасць народа, яго здольнасць да адраджэння. Сёння абараніць крынічку ад знішчэння і перасыхання можна толькі ўсім

разам, будуючы супольную людскую «сялібу». Да гэтай думкі В. Зуёнак звяртаецца пастаянна. Яго шлях у паэзіі — паслядоўнае імкненне да пашырэння сферы нацыянальнага за кошт таго, што спалучае нацыянальнае з інтэрнацыянальным, з тым, што з'яўляецца супольным для ўсяго перадавога чалавецтва, якое ўсвядоміла сваё адзінства і цэласнасць зямнога лёсу.

В. Бялінскі ў свой час пісаў:

«Вялікі паэт, гаворачы пра сябе самога, пра сваё Я, гаворыць пра агульнае — пра чалавецтва, таму што ў яго натуры ляжыць усё, чым жыве чалавецтва. І таму ў яго смутку кожны пазнае свой смутак, у яго душы кожны пазнае сваю і бачыць у ім не толькі паэта, але і чалавека, брата свайго па чалавецтву»[1]

Гэтыя словы вялікага крытыка маюць непасрэдныя адносіны да паэзіі В. Зуёнка якраз у тым сэнсе, што ён сапраўды здольны ў іншым чалавеку ўбачыць «брата свайго па чалавецтву», па агульных мэтах і імкненнях.

Пра гэта шмат гаворыць наступны верш:

У Твардоўскага — вочы Гагарына:
І разрэз, і брыва крыло.
Хітравата-задумнае зарыва,
Геніяльнай здагадкі святло.
Вышынёю вочы апалены,
Тым, чаго не пабачыш з зямлі,
І такімі далёкімі далямі,
Дзе мы з вамі яшчэ не былі.

Звычайныя, здавалася б, радкі, аднак, прачытаўшы іх, не адразу перагортваеш наступную старонку. Аўтар заклікае чытача да актыўнага саўдзелу ў роздуме. Паэт Твардоўскі і касманаўт Гагарын — землякі, нашы сучаснікі. Аднак, відаць, не толькі гэта акалічнасць Гх аб'ядноўвае ў нашых вачах, але і ўласцівая аднаму і другому высокая мера чалавечага вопыту, які дазволіў ім убачыць і зразумець нешта такое, «чаго не пабачыш з зямлі».

І адзін і другі жылі з поўнай душэўнай аддачай, высокімі думкамі і страсцямі.

У кнізе «Лукам'е» знаходзім і непасрэднасць шчырага пачуцця, і філасафічнасць, якая праяўляецца праз рэалістычную канкрэтнасць. На апошняй хацелася б спыніцца асобна.

Гаворачы пра адзін з новых зборнікаў вершаў П. Панчанкі, В. Зуёнак задае пытанне:

---

[1] Белинский В. Г. Полн. собр. соч. Т. IV. М., изд-во АН БССР, 1954. С. 521.

«Чым хвалюе, знаходзіць сугучча ў нашых пачуццях, думках — як заўсёды, так і на гэты раз — паэзія Пімена Панчанкі?»

І адказвае на яго:

«Канкрэтнасцю светаразумення, светаўспрыняцця. Канкрэтнасцю народнага ладу. Канкрэтнасцю адчування канкрэтнага чалавека. Канкрэтнасцю той, з якой бярэ ў руку ратай вясновую грудку зямлі ці ўзважвае на далоні жнівеньскую — з аднаго коласа сямейку зярнят. Той канкрэтнасцю, з якой слухае каваль звон металу. Канкрэтнасцю, з якой хлапчук-свавольнік спрабуе на зуб марозную крохкасць сакавітага ледзяша» («Літаратура і мастацтва». 1985. 4 студз.).

Аднак падобная рыса ўласціва творам і самога В. Зуёнка. Дастаткова ўспомніць верш «Тры зоркі на спіне» — маналог чалавека, траўміраванага вайной, якому яна пакінула на спіне, як памяць і як нейкую жудасную «ўзнагароду», выразаныя варожым штыком «тры зоркі».

Узнагароджаных
Не шмат на той вайне
Было такіх:
Тры зоркі на спіне.
Хто ў брацкай,
Хто з выгодамі ў труне...
А я ў жывых —
Тры зоркі на спіне.

Няма межаў бесчалавечнасці чалавека. Пра гэта крычаць і пратэстуюць «тры зоркі на спіне».

Зямля хай пракляне
Той штык, што выразаў
Тры зоркі на спіне.

І герой верша (яго вуснамі гаворыць сам паэт) ціха дадае: І хай
Узнагарода абміне Мая ўсіх вас — Тры зоркі на спіне.

Праз гэты вобраз паэт глыбока раскрывае ўнутраны, псіхалагічны стан свайго героя, яго душэўнае самаадчуванне, боль. Боль не толькі за сябе, але і за тых людзей-нелюдзяў, якія гэтак паздзекаваліся над ім.

«Тры зоркі на спіне» — гэта адначасова і рэалістычная канкрэтнасць, і вобраз, напоўнены значным асацыятыўным зместам.

Псіхалагічнаму аналізу ўдзяляецца ўсё большая ўвага. Мы маем магчымасць глыбей зазірнуць і ва ўнутраны свет самога лірычнага героя — таго, якога ў першай сваёй кнізе паэт называў «юным аратым». Сярод іншых вершаў зборніка «Лукам'е» ёсць і такі:

Ці знаеш ты,

Якуначы
Ад нематы
Душа крычыць...
Крычыць аб тым,
Што адцвіло,
Адбушавала,
Адгуло...
Чаго даўным-даўно
Няма,
Пра што забылася
Сама...
Крычыць душа,
Калі адна,—
І тая —
Выпіта да дня.

Верш уражвае драматызмам унутранага жыцця чалавека — з гэтага пункту гледжання твор вельмі праўдзівы, хаця ў ім, здавалася б, няма тых канкрэтных дэталяў і падрабязнасцей, да якіх мы прывыклі ў паэзіі В. Зуёнка і якія звычайна спадарожнічаюць рэалістычнаму мастацтву.

Неспакой, сумненні, незадаволенасць сабой, драматызм — родавыя рысы чалавека, вечная, анталагічна яму ўласцівая. Праўда, у кожную эпоху яна мае свае, адрозныя прычыны і абумоўленасць — у наш час таксама. Душэўную неўладкаванасць паэта можна адчуць у многіх яго кнігах і асобных творах. Пра гэта ўжо шмат гаварылася, калі закраналася сацыяльна-маральная, духоўная і гісторыка-філасофская праблематыка яго творчасці — як адлюстравання сучаснасці.

Сучасная атмасфера нашага жыцця адбілася і ў «Лукам'і». Часам нават сам стыль і лад нашага сённяшняга жыцця становіцца матэрыялам верша.

Бягуць усе —
І мы бяжым.
Куды нясе?
Такі рэжым.

Бяжым — рэжым... Ужо сама рыфма намякае на асноўную думку верша: жыццю — у рэжыме бегу, спешкі, якая, аднак, не набліжае людзей да мэты, а абарочваецца мітуснёй, рухам дзеля руху, без накірунку.

Счапленне з векам
На віражы:
Не кукарэкай —

Бяжы, бяжы.
І ты падключай —
Не адставай.
Эпоха вучыць: —
Давай, давай!
Нібы распяцце
На крыжы.
Нібы пракляцце:
Бяжы, бяжы...

Атрымліваецца нейкі гіганцкі абсурдны калаўрот, які не дазваляе чалавеку прыпыніцца, памаўчаць, падумаць, адчуць і зразумець жыццё ў яго глыбіні і ўласнай самацэннасці...

Роздумам над сучаснасцю народжаны таксама цікавы верш «Тапор» з падзагалоўкам «балада прагрэсу», у якой на канкрэтных, так сказаць, прыкладах праводзіцца думка аб тым, што навукова-тэхнічнае развіццё цывілізацыі толькі тады павядзе да «вяршыні прагрэсу», калі яно будзе адпавядаць законам чалавечай маралі і розуму.

Па-ранейшаму заўважаецца скіраванасць да філасофскай аб'ёмнасці вобразаў, шматмернасці раскрыцця чалавечага «я» ў адзінстве са светам сацыяльнага жыцця, імкненне да разнастайнасці выяўленчых і выразных сродкаў.

Чалавецтва на зямлі —
Самародак ці прышэлец?—

такое пытанне ставіцца ў вершы «*** Гэта памяць— праз вякі...». Як вядома, на гэты конт існуе шмат гіпотэз. Справа, аднак, не ў іх. Кінуўшы рэтраспектыўны погляд на гісторыю чалавецтва, поўную «войнаў і разбою», і ўзіраючыся ў сучаснае становішча, аўтар задае сабе і ўсім новае пытанне: «Чалавецтва, што з табою?!»

Нібы з плахі галава —
Шар зямны, радарам вуха,
Праз мяне — зялёны шар,
Праз мяне — яшчэ не лысы...
Галава, галава, безгаловая,
Паслухай! —
Як гудуць на вуху тым
Бомбаатамныя кліпсы.

Колькі тут музыкі і пластыкі! Звяртае на сябе ўвагу дасканалае, гнуткае паэтычнае майстэрства, якое, між іншым, заключаецца яшчэ і ў тым, што аўтар своечасова, у імя пастаўленай задачы, умее і адмовіцца ад знойдзенага рытму і мелодыі і «дэзарганізаваць» верш, рэзка парушыць ранейшае яго гучанне. Паглядзіце, як адрозніваюцца

першыя чатыры радкі ад чатырох наступных (пачынаючы з — «Галава, галава, безгаловая»...), як верш зрываецца на крык («Паслухай!»), як пачынае пульсаваць нечаканая гутарковая інтанацыя... Аўтар імкнецца да шырокага выкарыстання метафары, усіх сродкаў выразнасці. Значную ролю тут адыгрывае «віхравы» пачатак, напружанасць паэтычнай думкі, творчая фантазія. Лірыка-экспрэсіўны стыль мае схільнасць да большай насычанасці паэтычнага радка паўзамі, узмацнення ролі асацыяцый. Ён праяўляецца ў высокаразвітым мастацтве падтэксту, таленце «недавыказанасці», прынцыпе няўлоўных контураў вобраза, імпрэсіяніцкай дынаміцы колеру, аб'ёмаў і асацыяцый. Паэт смела выкарыстоўвае магчымасці мовы, адценні думкі і пачуцця, інтанацыйны пачатак. У імкненні да расшырэння мастацкага падтэксту праявілася павышэнне гуманітарнай і філалагічнай культуры яго паэзіі, а галоўнае — яе грамадская актыўнасць.

Васіль Зуёнак — цудоўны жывапісец (у чым мы не раз пераканаліся), не баіцца нагружаць свой радок ідэалагічнымі задачамі, выказваць думку публіцыстычнага нават у форме звароту альбо закліку.

Чалавецтва, стань жа ўрэшце
Чалавекам!

— такімі радкамі заканчваецца верш, пра які толькі што ішла гаворка.

Зварот В. Зуёнка да публіцыстычных сродкаў паэтычнага маўлення не прыніжае і не абясцэньвае яго грамадзянскага пафасу. Паэт адчувае за сабой і права, і сілу сказаць тое, што ён хоча і як хоча. Для беларускай паэзіі нашых дзён вельмі характэрна ўзрастанне асабовага пачатку і ў паэме, і ў лірыцы, што знаходзіць адлюстраванне ва ўзбуйненні вобраза героя, росце яго ўнутранай, духоўнай значнасці і вядучай ролі ў структуры твора.

Будзь заўсёды, як Радзіма, добры,
Будзь ласкавы, як яе трава.
Будзь высокі, без памкненняў дробных,
Як над полем неба сінява,
Просты будзь, як калыханка маці,
Дбайны будзь, як сейбіт і ратай.
Нават калі ўсё на свеце страціў —
Заклінаю: гэта — не аддай!

Гэта — адказ паэта на пытанне аб сучасных каштоўнасцях жыцця, аб тым, што лічыць сучасным.

Даводзіцца гаварыць пра далейшае паглыбленне і ўзнаўленне гістарычнай памяці, ён хоча адчуць і пазнаць старажытныя карані народнага жыцця і культуры.

Звяртае на сябе ўвагу ёмістасць вобразнага пісьма, напрыклад, там, дзе ён, услед за Янкам Купалам, звяртаецца да вобраза старажытных курганоў.

На шляхах вялікай даўніны,
На дарогах нашай новай славы —
Над вякамі ўзносяцца яны,
Сцвердзіўшы на бессмяротнасць права...

Паэт ідзе шляхамі роднай гісторыі, узнаўляючы яе драматычны змест і глыбіню часу. Аўтар перадае шматпакутны дух нашай гісторыі, якая пакінула пасля сябе столькі курганоў-магіл, курганоў-помнікаў, што велічна ўзносяцца —

Над вякамі подзвігаў і страт,
Навальніц крыві і спапялення,
Над вякамі, дзе народ — салдат,
Над вякамі, дзе салдат — сумленне;
Над вякамі здрады і маны,
Што з вякамі соладка глыбее,
Над вякамі, дзе жывуць адны,
А другія — чэзнуць ды гібеюць...

Вершу папярэднічае эпіграф з Янкі Купалы:

Хто зачэпіцца іх межаў,
Хто чапне іх сны,
Як званы на цёмнай вежы,
Стогнуць курганы.

Купалаўскія радкі нібы дапаўняюць зуёнкаўскі верш, набліжаюць яго да чытача, канкрэтызуюць змест...

* * *

Стогн беларускіх курганоў чуецца таксама і ў паэме «Лукам'е», завершанай у 1983 годзе. Яна ўвайшла ў аднайменны зборнік, склаўшы важную яго частку.

Паэмы В. Зуёнка, як мы ўжо маглі пераканацца, з'явіліся з неабходнасці глыбока засвоіць урокі мінулага, цікавасць да якога расце па меры станаўлення і развіцця творчай індывідуальнасці паэта. Цікава адзначыць, што з цягам часу аўтар палічыў мэтазгодным напісаныя ў розныя часы «Сялібу», «Агонь і сонца» і «Лукам'е» аб'яднаць у адзін твор пад агульнай назвай «Агонь і сонца» з падзагалоўкам «Паэма Радзімы». Атрымалася своеасаблівая паэтычная трылогія.

Часткі размеркаваны такім чынам: першым ідзе «Лукам'е»,— усярэдзіне — «Сяліба» і завяршае гэтае эпічнае палатно паэма «Агонь і сонца», якая атрымала назву «Прыцягненне».

«Лукам'е» — свет далёкай мінуўшчыны. На гэты раз паэт заглыбляецца ў сівую даўніну народнага жыцця. Падзеі, якія адбываюцца ў паэме, адносяцца да сярэднявечча беларускай гісторыі — канца пятнаццатага стагоддзя. Гэта — перыяд Вялікага княства Літоўскага.

В. Зуёнак застаецца паэтам лірыка-эпічнага складу, схільным да апавядальнай манеры, якая ўласціва таксама і яго паэме «Лукам'е».

Хто нашы продкі? Як суадносяцца іх погляды і памкненні з тым, чым жывуць нашы сучаснікі? Думаецца, такія пытанні знаходзіліся ў падтэксце аўтарскай задумы, хаця сучасны план і не выйшаў на паверхню твора, не рэалізаваўся ў адпаведных мастацкіх вобразах.

Сюжэт паэмы звязаны з раскрыццём галоўнага яе героя, з якім у паэта звязаны ўяўленні аб гістарычнай значнасці чалавечай асобы, яе ўдзеле ў грамадскіх справах.

У артыкуле «Юнаку, які жыццё абдумвае» (1974) В. Зуёнак пісаў:

«Нам патрэбны перакананыя барацьбіты, людзі рэвалюцыйнага гарту, страсці, шырыні і глыбіні натуры. Такія рысы бачацца нам у вобліках Каліноўскага, Трусава, Лепяшынскага, Галадзеда, Чарвякова і многіх іншых славутых нашых землякоў. Расказаць пра іх маладому пакаленню, выхоўваць на іх прыкладзе — найпершы наш абавязак».

Герой «Лукам'я» Іван Лукомскі да такіх герояў, вядома, не адносіцца. І не толькі таму, што ён князь,— ён належыць да іншай эпохі, характар якой аўтар узнаўляе ў вельмі дакладных, ёмістых вобразах.

На зыходзе было стагоддзе.
Смутны час для дароў і тыранаў,
Час бяссонніц, што прывідна ходзяць
Цяжкім ценем ахвяр пакараных.
Час пажадны, няўтульны, нервовы,
Час вар'ятаў і самагубцаў.
Здрадны час, падазроны да слова —
За віжамі віжы аж прагуцца.

У паэме згадваецца лёс беларускай зямлі, якую ў той час называлі Літвою і якую напасціг незайздросны лёс,— яе, разам з князем Ягайлам, «залучылі ў польскія прымы». Беларусь і Карона (Польшча) апынуліся ў адной дзяржаве — Рэчы Паспалітай. Літва — Беларусь у гэтым дзяржаўным саюзе ўсё больш губляла сваю самастойнасць і традыцыі.

Князь Лукомскі — нашчадак старажытнага роду Ізяславічаў. «Лукам'е з Друцкам, Заслаўе з Чарэяй» — так паэт акрэслівае землі, якія мроіліся Лукомскаму ў адзінай дзяржаве.

«Моц уся там, дзе свой люд і закон» — такі наказ, паміраючы, пакінуў князю Івану бацька.

І на паклон адзінае
Мушу сказаць сынам:
Здраджваем мы радзіме,
Радзіма не здрадзіць нам.
Яна праз вякі застаецца —
Як маці, як песня, як хлеб...

Аднак адстойваць сваю самастойнасць і вернасць радзіме давялося ў цяжкіх умовах — з аднаго боку панская Варшава, з другога — велікакняская Масква. Апынуўся Іван паміж польскім каралём і маскоўскім князем.

У паэме згадваецца юнацтва галоўнага героя, яго выхаванне, дабратворны ўплыў, які зрабіў на маладога княжыча ляснік Жыжаль. З гэтым чалавекам (у яго прозвішчы жыве дух агню) звязана адно з сюжэтных адгалінаванняў паэмы, ён увасабляе сабой лясны дух, які спрадвеку жывіў Беларусь.

Паэт сумуе па гармоніі чалавека і прыроды, якая карэніцца ў мінулым і павінна быць звернута ў будучыню.

У творы, як і ў паэме «Сяліба», праявіўся своеасаблівы антрапамарфізм — адухаўленне рэчаў і прыродных з'яў. Гаворка ідзе пра эпоху язычніцтва. Нельга сказаць, што аўтар паэтызуе яго,— ён, аднак, імкнецца перадаць дух старажытнага язычніцтва, якое здаўна жыло на гэтых землях і прывучыла людзей да прыроднага ўлоння, дапамагло арганічна ўжыцца ў яго, парадніла.

Ляснік Жыжаль удачарыў некалі дачку «апошняй вайдэлоткі» Дануту, якая, ратуючы ад згубы родны край, гіне сама пад стрэламі разгневанага Перуна. Язычніцкі свет саступіў месца хрысціянству, але саступіў далёка не добраахвотна. Гэта была з'ява заканамерная, але працэс перабудовы грамадскай свядомасці праходзіў са шматлікімі ахвярамі і стратамі. Нешта мянялася ў аблічча краю, а нешта захоўвалася, перадавалася нашчадкам.

Паэма населена цікавымі персанажамі. Голасам паэта загаварылі пакаленні продкаў, якія доўгія стагоддзі знаходзіліся ў стане сну і нематы.

Вобраз вайдэлоткі Дануты — захавальніцы старажытнага язычніцкага культу агню — напісаны з перавагай рамантычных фарбаў, як і вобраз яе духоўнай спадчынніцы Стасі, лёс якой таксама трагічны. Стася — сімвал Беларусі, якая прымае пакуты ад заваёўнікаў, што ішлі сюды з крыжам і мячом, сеючы рабунак і здзек, не звяртаючы ўвагі на тое, што гэта быў ужо край хрысціянства, праваслаўя.

Народ абкладзены падаткамі, прадугледжана ўсё:

З борцяў — васковы падатак і медны,

Стаўшчыну — з рыбнай лускі ў невадах.
Потым — пасошны, падымны, пабродны...
А пры вяселлі — паёмшчыну здай.

Як бачым, аўтар валодае не абы-якімі гістарычнымі пазнаннямі з той эпохі.

Героі паэмы змагаюцца супраць феадальнага прыгнёту і акаталічвання краю, і гэта было выяўленнем сацыяльнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы, у якой заняў сваё месца і Іван Лукомскі — сын сваёй зямлі.

Цікавы, безумоўна, і варты ўвагі і сам сюжэт паэмы — старонка роднай гісторыі. Але хочацца сказаць таксама пра выдатна перададзенае паэтам адчуванне асабістай далучанасці, прыналежнасці да гістарычных падзей і рэчаіснасці таго часу, да волі і моцнага духу продкаў, пра якіх расказваецца ў гэтым творы.

«Лукам'е» — гэта глыбокі, эмацыянальна трапяткі роздум над гістарычнымі шляхамі і лёсам роднага народа. Паэма сведчыць аб здольнасці аўтара арганічна ўжывацца ў далёкую эпоху, у асаблівасці жыцця і побыту, псіхалогіі, светаадчування людзей таго часу. Твор успрымаецца як шырокая мастацкая фрэска, прысвечаная нашаму мінуламу, прасякнутая філасофскім роздумам над гістарычным бегам часу. У паэта ёсць ідэал, грамадзянскае пачуццё справядлівасці, выяўленае з лірычнай пранікнёнасцю і драматызмам. Звяртаючыся да розных мастацка-выяўленчых сродкаў — ад умоўна-сімвалічнай вобразнасці да дакументальнай дакладнасці,— ён імкнецца праўдзіва і шматбакова раскрыць духоўны свет чалавека.

## РЫТМЫ ЧАСУ

Пра ўспрыманне беларускай паэзіі сучаснымі рускімі паэтамі можна меркаваць па выказванні У. Гардзейчава (у лісце да А. Вярцінскага):

«Я не зрабіў адкрыцця, заўважыўшы ў творчасці беларускіх майстроў верша, пры зусім відавочных стылёвых адрозненнях, нешта агульнае, што можна ахарактарызаваць як адзіныя моўныя і маральныя токі, неаддзялімыя ад жывячага іх народнага, нацыянальнага пласта. Я б сказаў, што такую прадвызначанасць накладвае на сваіх майстроў і чаляднікаў ужо сама беларуская мова, гістарычна замешаная на ўстойлівых выразных элементах народнага погляду на жыццё, часцей — дабротнай сялянскай афарбоўкі».

Далей У. Гардзейчаў так працягваў сваю думку:

«Адсюль вынікае, на мой погляд, цікавая асаблівасць: ні ў самай малой ступені не пакутуючы на нацыянальную абмежаванасць, здольная выяўляць сусветныя матывы, савецкая беларуская паэзія тым больш паспяхова перамагае адцягненую рыторыку, голую дэкларацыйнасць, што для саміх паэтаў, чулых да ладу натуральнай роднай мовы, надта чужародная, надта «пазафізіянамічная» матэрыя верша, не абагрэтая цяплом сардэчным» («Литературная газета». 1981. 25 сак.).

Сказанае У. Гардзейчавым, думаецца, цалкам адносіцца таксама і да паэзіі В. Зуёнка, відавочны нацыянальны характар якога не абмежаваны ў сваіх творчых абсягах.

Пераканаўчае сведчанне гэтаму — зборнік «Вызначэнне» (1987). Гэтая кніга і іншыя публікацыі сведчаць, што паэзія В. Зуёнка развіваецца ўпоравень з часам, у шырокім сацыяльна-грамадскім кантэксце. У новы зборнік увайшлі вершы аб радзіме, подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, маральным абліччы чалавека, лёсе міру на зямлі... Зрэшты, пералічыць тэматычныя грані новай яго кнігі не так і лёгка — тут якраз той выпадак, калі галоўнае не ў тэме, а ў тым арыгінальным, грамадзянскі актыўным лірычным характары, з якім мы маем справу ў паэзіі В. Зуёнка і які абумоўлівае цікавасць да яе.

Вось верш «Поле». Тут быццам бы і няма таго, каго мы называем лірычным героем (у канкрэтным сэнсе яго «я»), але ёсць цікавы духоўны характар, народны па сваёй сутнасці.

Поле — не толькі зямля,
Гэта і неба, і ветрык,
І васілёк, што здаля
Свеціць душою прыветнай.

Гэта і жаўранка спеў —
Першынца хмаркі вясёлай,
Гэта надзеі пасеў,
Мудрасці жніўная школа.

Аўтар пераканаштаны: існуе, не памірае паэзія сялянскай, зямляробчай працы, мудрай, як само жыццё.

Гэта і дождж, што ідзе,
Каб з ярыной паяднацца,
Гэта бяссонне людзей
І хлебадайная праца.
Поле — не поле без нас.
І перапёлкаю ў жыце
Кліча:
— У першы свой клас,
Дзеці, у поле бяжыце!

Паэт нязмушана і вельмі пераканаўча вядзе размову пра важнасць захаваць і ўзбагаціць такія вечныя духоўныя каштоўнасці, правераныя жыццём, як радзіма, праца, чалавечнасць, вера ў дабро... Грунтуючыся на асабістым вопыце, паэт імкнецца адказаць на спрадвечнае пытанне: «Як жыць?»

Адзнака сённяшняга Зуёнка — філасафічнасць. Зрэшты, ён заўсёды любіў думаць у вершах, меў схільнасць звяртацца да вечных пытанняў быцця. Гэтую схільнасць знаходзім у вершах «Так і застаешся чалавекам», «Перад судом галоўным», «Жаўранкі» (звязаныя, відаць, з вершам І. Драча «Крылы», што не перашкаджае баладзе «Жаўранкі» заставацца цалкам арыгінальным творам), «Аб мазалях» і шмат іншых.

Адзін з самых моцных вершаў зборніка — «Аб мазалях».

Век машынны пачаў забывацца,—
Век машынны, напомніць дазволь:
Што такое мазольная праца,
Што такое, урэшце, мазоль...

Гэта своеасаблівая вершаваная навела — і дасціпная, і глыбокая ў сваім змесце.

Паэт як бы аспрэчвае спрадвечную ісціну-«пагудку» «аб мазольнай нядолі», аб тым, што мазоль, які «вылазіць з-пад скуры слівай»,— паказчык асаблівых працоўных заслуг. Існуе іншая прымаўка: «гультай за работу, а мазоль — тут як тут — за руку».

А на той руцэ, спрацаванай,
Не шукай мазалёў дарма,—
На прасмоленай, адшліфаванай

Не было іх раней і няма!

I — прамы зварот да сучасніка «веку машыннага»:

І таму прашу: век машынны,
З той рукайся заўжды даланёй,
Што ніколі мазольным аршынам
Не вымервала долі сваёй.
Бо на ёй — не таўро, не пракляцце
І зусім, брат, не мазалі,—
Гэта працы вузлы, багацце
Найчаснейшае на зямлі.

Што яшчэ прынцыпова важна — В. Зуёнак не абмяжоўвае сябе сялянскім матэрыялам, вясковай традыцыяй, ён умее глядзець на рэчы шырэй. Для прыкладу можна спаслацца на цудоўны верш «Песня вечнага аратага». Гэта — верш-міф, які звяртае на сябе ўвагу менавіта шырынёй філасофскага абагульнення. Яго герой — хаця ён быццам бы і селянін («Двое нас і два цені — полем крочым і крочым...»),— аднак гэта постаць пры ўсёй сваёй рэальнасці, нават канкрэтнасці ўмоўная, гранічна абагуленая. Размова ідзе пра чалавечы абавязак «араць аблогу», пра жыццёвую наканаванасць не здраджваць свайму прызванню.

Поўня дзень мне надточыць,
Каб адолець аблогу...
Ары, ары, мой канёчак,
Да апошняга ўпрогу...

Якасная асаблівасць творчай індывідуальнасці В. Зуёнка заключаецца ў сацыяльнай насычанасці яго творчасці, здольнасці глыбока асэнсоўваць з'явы сучаснага жыцця. Каб выпісаць толькі назвы такіх — па-сапраўднаму глыбокіх — вершаў, спатрэбілася б, напэўна, цэлая старонка. Зрэшты, гэта справа колькасная, а вось што датычыцца традыцыі, школы, уплыву, стылю, прыкладу (без гэтага цяжка зразумець месца паэта ў літаратурна-мастацкім працэсе), то ўсё ж такі хто яму бліжэй?

Адзін час мне здавалася, што яму бліжэй такія паэты, як М. Танк, Р. Барадулін. Чым? Уменнем перш за ўсё рэальнае ўзбуйніць зваротам да ўмоўных прыёмаў, удала выкарыстаць фальклорныя фарбы, міф, прытчу, мастацкую дэталь ( успомнім той даўні «яблык», што ўпаў ля Халопеніч).

Як М. Танк, В. Зуёнак умее падпарадкаваць фальклорны пачатак свайму асабоваму, індывідуальнаму заданню («Зазімнае» і інш., і інш.).

Прадметнасць, жывапіснасць, пластычнасць даюць падставу тыпалагічна суадносіць паэзію В. Зуёнка з Р. Барадуліным.

Аднак тыпалагічная супольнасць гэтым не канчаецца.

Цяпер мне здаецца, што ён у цэлым блізкі і да П. Панчанкі. Так, блізкі — сваёй грамадзянскасцю, сацыяльна-публіцыстычнай скіраванасцю творчасці («Дзетдомаўцы», «Табу супрацьлегласці...», «Цяпер усе, як паэты...» і інш.). Такіх вершаў шмат, і яны, як правіла, вельмі ўдалыя, вострыя, надзённыя.

Пры ўсім гэтым Зуёнак застаецца Зуёнкам, гэта значыць самім сабой, сінтэзуючы многія эстэтычныя пачаткі ў сваёй творчасці. Гэтаму дапамагае шырокі погляд на свет, арганічнасць думкі і эмоцыі, здольнасць да глыбокага лірычнага перажывання.

«Лепшыя вершы зборніка В. Зуёнка «Вызначэнне»,— пісаў М. Арочка,— якраз і пазначаны своеасаблівасцю такога адзінства, калі думка, развага, дзякуючы інтэнсіўнасці пачуццёвага выяўлення, не павяваюць холадам рацыяналістычнасці. Нярэдка нас захоплівае напружанасць роздуму над праблемамі супярэчлівых дачыненняў чалавека і зямлі, прыроды, чалавека і роднага котлішча, што часам халадзее пакінутае, нібы тое гняздоўе на зіму («Перад судом галоўным...» «Як ад лёсу, ад хат не ўцячы...», «Аб мазалях», «Прыпар») («Полымя». 1988. № 5. С. 201).

У кнізе «Вызначэнне» адчувальней стаў рытм часу, дынаміка жыцця, пошукі шляхоў у будучыню. Для яго непрымальна аднабаковасць тэхнакратычнага, «машыннага» шляху развіцця грамадства, таму што ён вядзе ў тупік. Просьба паэта, якую ён называе «зорнай просьбай» (значыць, жыццёва важнай, выключнай), такая:

Хай неадольны час імчыцца,—
Каго — не знаю, а прашу:
Вярніце небу таямніцу,
А закаханым — іх душу.

*(«Зорная просьба» )*

Гэтая здольнасць адчуваць глыбінныя з'явы жыцця, як ужо гаварылася, адна з найбольш прывабных рыс паэзіі В. Зуёнка, які даўно прывык жыць балючымі пытаннямі свайго часу. Адно з іх, так сказаць, разглядаецца ў вершы «Прыпар».

«Прыпар» — «балада неперспектыўнай вёскі», напісаная верлібрам. Гэтай баладзе папярэднічае верш «Дзед» — пра старога вясковага чалавека, жыццё якога набліжаецца ўжо да свайго няўмольнага завяршэння.

Стаптаўся кіёк дарожны,
Расплясканаю лапай ступае.

Ні стукнуць, ні грукнуць не можа,
Нячутна ідзе, як памяць.
Перасцярожна і слепа
Пыл узбівае пухлы.

Параўнанне ў паэзіі В. Зуёнка звычайна дае цэласнае ўяўленне не аб адной якой-небудзь рысачцы, а аб усім прадмеце, пра які ідзе размова. Менавіта так успрымаецца параўнанне «Нячутна ідзе, як памяць».

Блуканняў і выраяў злепак —
Дарога — нібыта аглухла.
Не вабіць больш і не кліча
Далей загуменных прысадаў...

*(«Дзед»)*

Некалькі радкоў, а перададзены ўнутраны стан чалавека. Гэта стан, у якім знаходзяцца так званыя «неперспектыўныя вёскі».

«Неперспектыўная вёска» — паняцце, узнікшае ў эпоху застою, якая ўмела камуфліраваць горка-трагічны змест чалавечага жыцця, наспелыя праблемы рэчаіснасці нейтральна-раўнадушнымі, «абцякаемымі» словамі.

Неперспектыўная вёска — выміраючая вёска, занядбаная, вёска без будучыні. Такіх, дзе няма ні школы, ні магазіна, ні дзіцячага садзіка (не гаворачы ўжо пра царкву, якую разбурылі даўно), дзе жывуць апошнія старыя, у Беларусі шмат. Паэт у думках звяртаецца да яе былых славутых насельнікаў — дзядзькі Восіпа, дзядзькі Хведара, дзеда Захара, прадзеда Аўласа, бабкі Хімы і іншых, на чыіх плячах вёска трымалася і якіх ужо няма з намі, каб расказаць пра сучаснае становішча — як зарастаюць у полі дарогі, як «лапушыцца, буяе крапіва, а насенне з бярозы магільнай прарасло на парозе хаты».

Ён помніць іх усіх...

Хто вінаваты ў тым, што наступныя пакаленні аказваюцца не вартымі сваіх папярэднікаў — працаўнікоў і руплівцаў на ніве жыцця? Такое пытанне напрамую не ставіцца, але недзе ў глыбокім падтэксце яно ўгадваецца...

Заключныя радкі ўспрымаюцца як нейкае запозненае галашэнне па тых, без каго вёска асірацела.

Што ж вы гэта,
Дзядзькі і цёткі,
Што ж вы гэта,
Дзяды і бабкі,
Што ж вы,
Прадзеды і прабабкі,

Што ж вы, мёртвыя,—
Сорам у прыпар
На тым свеце ляжаць і лайдачыць.
Уставайце хутчэй!..

А потым —
Мы яшчэ раз па вас пагалосім.

Аўтар умее ўзбагаціць шматбарвны спектр сваіх эмоцый нават ноткамі гумару, якія, звернутыя да сумлення сучасніка, адцяняюць драматызм і незваротнасць падзей...

Непадступна мучаць, страшаць і праследуюць яго працэсы эрозіі роднай глебы, занядбання нацыянальнай мовы і культуры.

Цяжка бачыць, што з поля знікла песня.

Калыханкі таксама знікаюць:
На ўсю вёску — адзін унук,
Ды і той падкінуты з горада...

Мастацкая абагульненасць у Зуёнка звычайна суседнічае з псіхалагічна насычанымі падрабязнасцямі.

Праблема будучыні беларускай мовы, літаратуры закранаецца ў вершы «*** Настаўнікаў і прарокаў...». Гаворка ідзе пра тых бессаромных настаўнікаў і прарокаў, якія ўсё зрабілі, каб беларус пазбыўся і мовы сваёй, і нацыянальнага аблічча.

Наеліся ісцін удосыць,
Наслухаліся мудрацоў.
Патрэбен слову філосаф
Сарамлівы. Як Міша Стральцоў.

Гэтай страфой заканчваецца верш — і зроблена яна выдатна. Майстэрства і думка нарадзіліся і ўзніклі разам, як адно цэлае, непадзельнае. Сказаў — як звязаў. Проста, звычайна, натуральна. Празаічнае выказванне (рытміка, рыфма, перанос), якое стала паэтычным радком з высокім каэфіцыентам мастацкага абагульнення. Аўтар увёў у тканіну верша канкрэтнае імя — пісьменніка Міхася Стральцова, якога цанілі за тонкі эстэтычны густ і пачуццё слова, уменне зазірнуць у яго патаемны свет, адчуць адценні. М. Стральцоў з яго чуйнасцю да жывой пульсацыі нацыянальнай культуры і высокім усведамленнем яе вялікага значэння для жыццядзейнасці народа супрацьстаўляецца тым «сваім брахунам і чужым», хто ўсё зрабіў, каб усё гэта стаптаць і занядбаць.

Паэт абжывае з'явы рэчаіснасці ўсёй сваёй біяграфіяй і жыццёвым вопытам, не забываючы — што вельмі важна — пра сваю асабістую адказнасць.

Перад судом галоўным,
Перад вялікаю стратай
Не называю віноўных,
Бо знаю: я вінаваты.
Я — вінаваты самы,
Самы пагубца галоўны,
Перад табою, хата,
Што засталася бяссłоўнай.
Перад табою, мова,
Перад табою, мама,
Я не збярог ваша слова,
Я — вінаваты самы...

Тут няма аніякай позы (хаця вінаватых і трэба было б назваць!) — у праўдзівасці пачуццяў паэта не даводзіцца сумнявацца, хоць яго віна не большая, а хутчэй меншая, чым віна іншых. Верш хвалюе бязлітаснай шчырасцю душэўнага самааналізу, які кожны можа прымерыць да сябе.

Я не пачуў на радзінах,
Я не спыніў на хаўтурах,
Я не сагрэў — адзінае,—
Што ад смярцей ратуе.
Я не знайшоў такое,
Каб страшным судом судзіла,
Каб не давала спакою
Адступнікам і за магілай.

«Усё бяру на плечы»,— кажа пра сябе паэт у адным з вершаў («Мой анёл-ахоўнік...»). Ён бачыць чалавека ў калаўроце яго спраў і абавязкаў, у суадносінах традыцыйнага і сучаснага. Ён бярэ чалавека на шырокіх абсягах часу.

Зборнік «Вызначэнне», кажучы па-руску, «располагает к разговору». Аўтар абжывае свет па-свойму, ператвараючы яго ў сваю, мастакоўскую эстэтычную рэальнасць.

Па-ранейшаму дарагім застаецца працоўны побыт народа, яго духоўныя традыцыі і матэрыяльна-прадметны свет шматвяковай культуры. Гэтая думка вынікае з многіх яго вершаў, у якіх праўдзіва раскрываюцца абрысы сённяшняга дня Беларусі.

Як ад лёсу, ад хат не ўцячы:
Хоць крыж-накрыж на вокнах дошкі,
Хоць здзічэла брыдзе па начы
Да астылае печы кошка,
Хоць заплёў над дзвярыма павук

Свае сеці для мух няцямкіх,
Хоць без цёплых дзіцячых рук
Іржавеюць астылыя клямкі...
Хоць Адамамі ў гарады —
Нібы ў райскі сад — з пяцісценак
Мы бяжым — прагрэсу плады
Атрасаць па спакуслівых цэнах,
Хоць па клетках глухіх камяніц
Ладзім новага лёсу пачатак,
Нібы пальцы, што з рукавіц
Паразбегліся ў норы пальчатак...

— так, гэта адзнакі і тэндэнцыі нашай сучаснасці. Вызначаліся яны, аднак, як вядома, даўно, але з цягам часу набылі ў выніку паскоранага, фарсіраванага працэсу развіцця характар грамадскай катастрофы. Тут дарэчы будзе сказаць, што верш напісаны да перабудовы — у першай палавіне 80-х гадоў. Тым больш уражваюць радкі, якімі ён завяршаецца:

І хоць будучыню за грош
Не збываем нікому,—
ды ўсё ж —
Пасля стрэсаў і рэвалюцый
Мы да хат яшчэ мусім вярнуцца...

«Будучыню за грош» усё ж такі збывалі — калі мець на ўвазе інтэнсіўны экспарт за мяжу прыроднай сыравіны: нафты, газу, лесу, бавоўны і г. д., і г. д. Збывалі направа і налева — тут аўтар аддае даніну застойным часам, але заключныя два радкі кранаюць сваім прарочым сэнсам і верай: «Пасля стрэсаў і рэвалюцый мы да хат яшчэ мусім вярнуцца...» Сёння шырыцца кааператыўны, фермерскі рух на вёсцы, ёсць выпадкі, калі туды вяртаюцца людзі з гарадоў (праўда, у Беларусі гэты рух адбываецца вельмі марудна), але ж верш быў напісаны да гэтага! Адкуль такая вера?

Вытокі яе — у светапоглядзе паэта, які прызнае толькі «праўду зерня» — логіку самога жыцця, яго покліч.

Зборнік «Вызначэнне» сведчыць, як вырасла і ўзмацнілася светапоглядная актыўнасць паэта, вынашаная ім канцэпцыя жыцця.

У гэтай сувязі, думаецца, нельга абмінуць верш «Наша праўда», якому прыдадзены цікавы эпіграф: «Я верую, и мне не так больно...» — словы чэхаўскай Лікі з кінафільма «Сюжэт для невялікага апавядання».

Пра што гэты верш?

Пра жыццё беларусаў, пра маральнае аблічча народа, яго гісторыю, духоўны характар, пакуты, адносіны да іншых народаў.

Выраз «наша праўда» ў суладдзі са шматлікімі і разнастайнымі эпітэтамі, прыкладзенымі да яго, набывае выключна глыбокі і шматсastаўны вобразна-мастацкі змест. Праўда народнага жыцця вызначаецца словамі: «сярмяжная», «сарамяжная», «як птушка весняя», «шчырая і зычлівая», «крэўная і адзіная», «мужная і нязломная» — у гэтых і іншых эпітэтах відаць зоркасць мастака, яго назіральнасць і дакладнасць, уменне трапна вызначыць прадмет, даць уяўленне аб ім.

Паэт імкнецца пераканаць — і пераконвае.

Векапомная і суровая,
Наша мужная і нязломная,—
Не была ты ніколі бяздомнаю.
Беларуская, ды не вузкая —
Чалавечная і праўдзівая,—
Не была ты ніколі шкадліваю.
Сарамяжная, і зычлівая,
І шчаслівая, і сярмяжная,
Не была наша праўда прадажнаю.

«Беларуская, ды не вузкая»... В. Зуёнак па-ранейшаму ўважлівы да беларускай гісторыі, да дзейнасці многіх яе ўдзельнікаў. Духоўныя далягляды сучаснасці — як заўсёды ў В. Зуёнка — абавязкова ўбіраюць у сябе і вопыт мінулага.

Выдатны верш «Развітанне Каліноўскага», у якім паэт глыбока акрэсліў светапогляд гэтага рэвалюцыянера, яго веру ў будучыню народа.

У другім вершы — «Такі быў знак...» паэт па-свойму расшыфроўвае герб Францыска (Акарыны — «у промнях сонца — рог маладзіка: як фас і профіль твару чалавека». Гэта гуманістычная думка аб чалавеку як цэнтры сусвету знайшла ўвасабленне ў многіх з'явах і працэсах еўрапейскага Адраджэння, якія заклікалі да дзейнасці і выдатнага беларускага асветніка і кнігадрукара.

Верш «Купала» — таксама погляд на беларускую гісторыю з характэрным для яе драматызмам і ў пэўным сэнсе несправядлівасцю, пра якую мы ўспамінаем як пра нейкае наканаванне лёсу.

Раздарыла сыноў сваіх...
Дастаеўскі, Міцкевіч, Біруля...
З імі голас, і зрок, і слых
Аддавала ў людзі матуля...

Спіс сыноў беларускай зямлі, якіх яна падарыла іншым краям і народам, вялікі...

Хтосьці зблізку забыў... Хто здалёк...
І аднойчы маці сказала:
— Ты збяры, прысаром іх, сынок,—
І тады ў людзі выйшаў Купала.

У паэзіі В. Зуёнка сцвярджае сябе прынцып універсалізму. Поле для яго не толькі зямля, якая родзіць хлеб, але і школа, у якой нараджаецца асоба. Бытавое ў яго не рэдка аказваецца ў адным радзе з касмічным, пацвярджаючы здольнасць паэта адчуваць «звышзямныя» прыцягненні.

Якое малое зярнятка, а ў ім
Трывожна і чуйна космас,
Няспраўджаны, спіць, покуль воляю зім
Снуюцца завейныя кросны.
А дайце надзею вясны і цяпла —
Сузор'е выбухне раптам:
Травінка малая — правобраз крыла,
Крыло — прадчуванне галактык.

У лірычным героі В. Зуёнка ёсць нешта ад светаўспрымання старажытнага грэка, які адчуваў космас як нешта адухоўленае, поўнае глыбокага, таямнічага сэнсу.

Паэт схіляецца перад бязмежна вялікім, якое неабходна яму таксама; як і тое зямное, што яго акружае, што знаходзіцца побач. Гаворка ідзе пра спалучэнне, сінтэз «генералізацыі» і «дробнасці», што Л. М. Талстой лічыў умовай эпічнай мастацкасці, здольнай спасцігнуць цэласнасць свету.

Якія мільярды ад зор да Зямлі:
Гады светлавыя — імгненнем.
Пылінкай касмічнай ляцяць караблі:
Няма — і ці будзе — збліжэнне...
А толькі скраніце арбіту Зямлі
На нейкую долю мінуты —
І хопіць, каб мігам агонь спапяліў
Ці холад планету ахутаў...
Якую ж нам тайну касмічную знаць
І мудрасць якую мець трэба,
Каб нашу Зямлю на далонях трымаць
І несці пад сонечным небам...

З часоў Я. Купалы і М. Багдановіча касмічны пачатак не раз пранікаў у беларускую паэзію як адна з яе тэм. Успомнім верш А. Куляшова «Зямля» (1947), у якім расказваецца аб тым, як касманаўты,

наведаўшы «восем вялікіх планет», пасля саракагадовага перапынку вяртаюцца на зямлю.

У В. Зуёнка свой падыход да гэтай тэмы, абумоўлены філасофска-гуманістычнымі прынцыпамі яго светапогляду. Жыццё адчута паэтам на ўзмежжы эмпірычнага, рэчаўнага свету, штодзённага чалавечага існавання і, з другога боку, свету, абумоўленага касмічнымі сувязямі, якія ідуць да нас з далёкіх прастораў сусвету. Універсалізм яго паэтычнага кругагляду ахоплівае чалавека ў яго сувязях з грамадствам, прыродай, светам і сусветам, у яго духоўнай цэласнасці.

Сёння чалавецтва можа, як вядома, само сябе знішчыць. Справа не толькі ў ядзерным узбраенні, якога накоплена на зямлі больш, чым шмат. І не толькі ў экалагічнай небяспецы, якая спалучылася з ядзернай у адно цэлае. Вялікая небяспека — духоўнае, маральнае разбурэнне чалавечай асобы, якое вядзе да малых і вялікіх катастроф на вадзе, на сушы, у паветры і космасе. Чалавеку пагражае духоўная мутацыя, ператварэнне ў біялагічнага робата. На жаль, гэтую пагрозу далёка не ўсе людзі ўсвядомілі з належнай яснасцю, не зрабілі адпаведных высноў.

«Універсалізм,— лічыць сучасны крытык Міхаіл Эпштэйн,—...гэта імгненнае азарэнне, якое раскрывае ў глыбінях чалавецтва яго цэласнае, недзялімае «Я»[1] Беларускі паэт у гэтым сэнсе шукае новыя шляхі спасціжэння універсальнага пры захаванні прыватнага і канкрэтнага.

Хто ў век боегаловак і ракет
Схіляць галовы ўздумае бяздумна
Перад Зямлёй, калі ўжо ўвесь сусвет
Паўстаў на нашым скрыжаванні тлумным...
Змірыліся — зямляне, землякі,
Што трэба пакідаць сваю калыску.
Адно не знаем: застануцца з кім
Магілы мацярок і абеліскі...

Праз паэтычнае ўспрыняцце космасу адкрываюцца вельмі важныя зямныя ісціны. Без велічнага, касмічнага, бясконцага чалавек прыйдзе ў адчай — таксама, калі ён страціў бы зямныя свае арыецціры.

Хто выйдзе ў поле з першай баразной,
Каб жаўрука шчаслівага паслухаць,
Каму ён скажа, як былой вясной
Было хоць зябка трохі, ды не глуха...

---

[1] Эпштейн М. Парадоксы новизны // О литературном развитии XIX-XX веков. М., 1988. С. 386.

Бяры, Зямля, усё бяры ў запас —
І жніўны спеў, і сонечныя промні,—
Бо хто сагрэе, як не будзе нас,
Хто пра такія дробязі успомніць!..

Прынцып універсалізму ў В. Зуёнка праяўляецца па-рознаму. Між іншых прозвішчаў на плітах мемарыльнага комплексу «Прарыў» ва Ушацкім раёне ён прачытаў: «Зузёнак». Ну і што ж такога? Звычайнае супадзенне, якіх безліч. Нават і поўнага супадзення няма. Аднак выпадак вельмі ўзрушыў.

Як гэта блізка ад мяне
І прозвішчам і сутнасцю...
Ляціць, ляціць — і не міне
Мяне той гук адсутнасцю.
Хрысціў адзін свінцовы знак
Тады Ушачу з Начаю,
Ды тое «з» было, аднак,
Мне лёсам не пазначана.
І свіст ягоны кулявы —
Як быў — навекі з Вамі ён.
Той зычны гук забралі Вы
З усіх маіх экзаменаў.

«З-з-з» — палёт кулі, якая ў свой час абмінула дзяцінства паэта (яно ж таксама прыпадае на вайну), спыніўшы жыццё камусьці іншаму.

Стаю, схіліўшы галаву,
Перад каменнай кнігаю:
У гэтым прозвішчы — жывуць,
Майго дзяцінства дні гарачь.
Адзіны гук... Ён не кране
Мяне сваёй астудаю.
Ён Вам — апошні — празвінеў,
І ўратаваны буду я.
Адзіны гук... І я хаджу
Пад сонцам тымі сцежкамі,
Дзе Вы ўсміхаліся дажджу,
Калі ўраджаем цешыў ён.

Пачуццё ўдзячнасці — пачуццё абавязку — пачуццё прыналежнасці да вялікай чалавечай сям'і.

Адзіны гук... Мне колькі жыць
Ён даў на свеце права —
Не знаю... Толькі даражыць

Мне вечна Вашай славай.
Калі ж трывога ўскалыхне
І ўстануць зноў брыгады —
Адно ў запасе і ў мяне
Ёсць «з» на той выпадак.

І ў кнізе «Вызначэнне» В. Зуёнак, ідучы наперад, застаецца самім сабой. Шмат што пра паэта, душэўную структуру яго асобы гавораць гэтыя вось радкі:

Крыўды я не лічыў —
Не такога талану.
Ціха раны лячыў
Тым, што быў пастаянны...
Пастаянства граніт
Стаў цяжэй надмагілля.

Некаторая стрыманасць у пачуццях, паэтычны рацыяналізм, уласцівыя і «Вызначэнню», абумоўлены філасофскай скіраванасцю творчага пошуку, духоўнымі запатрабаваннямі сучаснага чалавека ў маральна-эстэтычным асваенні свету. Паэзія В. Зуёнка—гэта імкненне да сапраўднай вышыні пачуццяў і свята думкі, у адказ яны нараджаюць актыўнае суперажыванне.

Глыбока па сэнсе «Начное вогнішча» — верш вельмі, калі так можна сказаць, зуёнкаўскі, з шырока выяўленым лірыка-эпічным пачаткам, жывымі і дакладнымі назіраннямі.

Восень. Начны, ахутаны цемрай, касцёр. Вакол агню — незнаёмыя людзі: свой свет, свая размова, свае ўзаемаадносіны...

І што за людзі? Ці патрапіш
На добры час, на добры лад?
Ці раптам вылезеш нахрапам
І будзеш лішнім акурат?..
І вабіць вогнішча, і выйсці
Не дазваляе нейкі страх —
Той, першабытны, што калісьці
Згараў падушна ў злых кастрах...

Вогнішча, як нам здаецца, метафара жыцця, якое, як і начны касцёр, не грэе здаля. Трэба падысці бліжэй — стаць чалавекам сярод людзей, пранікнуцца іх супольнасцю.

А выйдзеш з цемры — і сустрэнеш
І цеплыню, і дабрыню.
І станеш моўчкі на калені:
Паклон — людзям, паклон — агню...

У вершы гучыць глыбока гуманістычнае пачуццё чалавечага яднання, у чым паэт бачыць сэнс і мэту жыцця.

Гарыць касцёр на ўзмежку лета,
Гарыць на ўзлессі, у палях —
Маленькай зоркаю сусвету
І сэнс падказвае, і шлях:
Вось так адкрыцца на дасвецці,
Так добрым словам памагчы,
Паклікаць, абагрэць, прывеціць —
Як тое вогнішча ўначы.

Паэт умее мысліць вялікімі, «вечнымі» катэгорыямі, дасягаючы ў сваіх вобразах шырокага абагульнення з'яў рэчаіснасці, глыбока пранікаючы ў іх чалавечы сэнс.

Вершы В. Зуёнка прымушаюць думаць высокімі вобразамі і ўяўленнямі, але ён не адрываецца ад зямлі, добра бачыць яе і прыродны, і сацыяльны рэльеф.

Паэт умее знешняе, «прыроднае» суаднесці з унутраным, «душэўным». Пра гэта красамоўна сведчыць верш «*** Люблю той подых лета нясмелы...». Ды ці толькі адзін ён — яго радок хвалюе сваёй душэўнай адкрытасцю, шчырасцю і сталасцю пачуццяў.

Люблю той подых лета нясмелы,
Той позірк пралескавы з-за куста,
Калі асіна паружавела,
Калі бяроза на паўліста.
Калі да венікаў вунь як далёка,
Як да замуства ў шаснаццаць год,
Калі вярба, набрынялая сокам,
Скручвае дудку — вадзіць карагод,
Калі пад лотаццю рогат і войкат
Жабы спраўляюць, як сто маладзіц,
І чарнакніжніцай грэшная вольха
Азы пісьмёнаў вясновых цвярдзіць...

І — зноў-такі прарываюцца касмічныя матывы:

Люблю цябе, майскае перасяленне
Бога вайны ў перуноў чараду,
Люблю цябе, крэўнае зазямленне
Касмічных дум і касмічных душ.

Характэрнае для В. Зуёнка спалучэнне і сумяшчэнне двух планаў — навакольных, прывычных з'яў і таго велічнага, неабсяжнага, што выходзіць за межы звычайных зямных уяўленняў, але трывала звязана з чалавечым жыццём вялікім адзінствам сусвету.

Уласцівае яму адчуванне прыроды ў спалучэнні з тым, што мы называем сацыяльнымі эмоцыямі, выразна адбілася ў пейзажнай замалёўцы «*** Заснежаная леснічоўка...» элегіі «Дзяцінства бор». Яно далёка не бязвоблачнае — гэта адчуванне. Вось як выглядае бор дзяцінства на радзіме паэта:

Лясіна не даклічацца лясіны,
І воды адышлі ад каранёў,
На салаўя сарока вучыць сына,
І шастае па гнёздах вараннё...

Гэта — вынік аднабокай тэхнакратычнай, машыннай, «энтэраўскай» дзейнасці чалавека, яго бяздумнасці, да якой прывучыла каманднa-бюракратычная сістэма (пра што ішла размова і раней — у паэме «Сяліба» і інш.).

З вострымі маральна-этычнымі, экалагічнымі, духоўнымі праблемамі сучаснасці звязаны вершы «*** Цяпер усе, як паэты...», «Дзетдомаўцы», «Удача», «*** Кіслыя азёры...». Тут шмат горкай праўды пра нашы палі і лясы, рэкі і азёры, падвержаныя бессаромнаму здзеку і глуму з боку чалавека — «безгаспадарнага гаспадарніка».

Вы і хларафосамі,
Вы і гербіцыдамі,
Каб з гектара поснага
Лішні цэнтнер выдаіць.

А ў выніку тое, што ўсім сёння добра вядома...

* * *

Як і кожны сучасны паэт, В. Зуёнак часта бывае ў разнастайных паездках. «Мне краю роднага і подзвіг і краса выразней бачны з далячынь планеты».

Многія творы навеяны падарожжамі па краіне — ад Палесся да Сібіры, і за мяжой — ад Балгарыі да амерыканскага кантынента.

Таму, хто любіць радзіму, лягчэй адчуць непаўторнасць і хараство чужога краю.

Нібы козы, вінаградныя лозы
З пругкім выменем дыбяцца на падпоркі...
Вязанкі лісця на сушылках —
У заценьку, нібы гірлянды...
З падстрэшшаў — струкі
Ледзяшамі гарачымі...
Гармонія светлая гронак...
Філасофія тытуню...
Перцу чырвонага крык

з жоўтымі падгалоскамі...

Такой убачыў паэт Македонію. У гэтых сакавітых, яскравых дэталях угадваецца прыгажосць і гармонія душы працоўнага чалавека, паэзія яго жыцця і побыту.

У вершы «Пеўчае поле» В. Зуёнак засведчыў здольнасць адчуць і зразумець нацыянальнае адзінства братняга народа — эстонцаў, якое праяўляецца і ў працы, і ў песні.

У зборніку «Вызначэнне» знаходзім цыкл вершаў — «Лісткі з амерыканскага блакнота». Аўтару давялося ўдзельнічаць на адной з сесій Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Йорку. Цыкл мае характар нарысавасці і пакідае неадназначнае ўражанне — стварaўся ён, не забудзем, да перабудовы.

Ф. Яфімаў у рэцэнзіі на зборнік крытыкаваў аўтара за цыкл «Лісткі з амерыканскага блакнота»:

«Паэзія — не столькі вершы,— пісаў ён,— колькі жыццё паэта, а ў жыцці бывае, што маўчанне каштуе даражэй нават за добрае слова. Маўчанне — таксама паэтычны жанр...

Возьмем, напрыклад, вершы з замежнай камандзіроўкі. Я хацеў бы, як чытач, каб гэта былі сапраўды вершы, а не тое, што па традыцыі прывозяць нам з пасяджэнняў ААН — нешта накшталт фінансавай справаздачы пэўнай установе. Вершы В. Зуёнка ў гэтым сэнсе не адрозніваюцца ад тых, што мы чыталі раней. Уласна кажучы, гэта не вершы, а іменна вершаваная публіцыстыка. Я і стаўлюся да яе як да публіцыстычнага выступлення, г. зн. звяртаю ўвагу выключна на змест, знаходзячы ў ім вельмі многа спрэчных момантаў» («Літаратура і мастацтва». 1988. 20 мая).

У нечым Ф. Яфімаў мае рацыю, але ўсё ж такі гэта вершы, у якіх адлюстравалася амерыканская рэчаіснасць і савецкі чалавек пэўнага перыяду, з яго выхаваннем і ўспрыманнем капіталістычнага свету, якое было закладзена савецкай літаратурай яшчэ ў 20-я гады (Маякоўскі, Ясенін і інш.). «Лісткі з амерыканскага блакнота» — аб'ектыўнае сведчанне

гэтага ўспрымання, якое мы сёння ў нечым адвяргаем, у нечым удакладняем, паглыбляем...

І «Лісткі...», і кніга «Вызначэнне» ў цэлым прымушаюць думаць пра адказную місію іх аўтара ў сучасным свеце. Зберагчы зямлю, зберагчы жыццё, абараніць духоўны свет чалавека — гэта і ёсць «сацыяльны заказ» грамадства сучаснаму паэту, чуйнаму да шматстайных падзей і з'яў навакольнай рэчаіснасці. Імкненне суаднесці з імі маштаб сваёй душы, творчы неспакой, вастрыня пачуццяў робяць яго слова блізкім і патрэбным людзям.

## ВЫБІРАЮ — ЖЫЦЦЁ...

... Каб пісьменнікам стаць, трэба, дружа, раман напісаць»,— любіў гаварыць некалькі гадоў таму назад мой даўні сябар-літаратар. Не ведаю, ці сказаў бы гэтак ён сёння, калі ў нашым грамадстве шырока ўзрасла патрэба не толькі ў добрай прозе, але і ў ёмістым, эмацыянальна і інтэлектуальна насычаным паэтычным слове, прасякнутым верай у чалавека, у сілу яго розуму, у здольнасць абараніць жыццё і мір на зямлі.

Усё часцей чуецца: жывём напярэдадні трэцяга тысячагоддзя — толькі пятнаццаць год аддзяляе нас ад яго... На «мяжы» часаў — сёння гэта асабліва адчуваецца — незвычайна востра паўстае пытанне аб захаванні і ўмацаванні духоўных і маральных каштоўнасцей чалавека — чалавечай годнасці, дабраты, сумленнасці, павагі і г. д. Сучаснасць, на думку многіх, ускладнілася ў самой сваёй жыццёвай сутнасці,— чалавецтва апынулася ў віры нябачана вострых праблем вайны і міру, захавання навакольнага асяроддзя, зберажэння гістарычнай памяці і ўсіх каштоўнасцей, створаных народам. Сацыяльныя пераўтварэнні, набыткі і страты цывілізацыі, урбанізацыя, праблемы, створаныя развіццём навукова-тэхнічнага прагрэсу — усё гэта павінна знаходзіць і знаходзіць водгук у паэзіі.

Не раўнадушны да гэтага, як мы ўжо бачылі, і верш В. Зуёнка. Нядаўні зборнік паэта — выйшаў у 1990 годзе — атрымаў назву «Лета трывожных дажджоў» па аднайменным вершы, напісаным пасля чарнобыльскай бяды.

Ліпнёвую ноч бліскавіц паясы
Святлом абпраменьваюць рэдкім.
Ігліцай нейтроннай іскрацца лясы.
Чарнобылем пахнуць кветкі.
Сухое чаканне трывожных дажджоў
Стаіць на покуці ў лета.
Распяты на ценях касмічных крыжоў,
Бяздомна лячу над планетай.
«Што я нарабіў,— праклінаю сябе,—
Якія бяздонныя сілы
Я выпусціў, покуль бяздумна гарбеў
Над тайнаю, як над магілай...
Вазьміце, вазьміце ўсю тайну маю
За той васілёчак у жыце...
Я сам сябе — сам сябе! — не пазнаю:
Я д'ябал ці бог — адкажыце...»

Судакранаючыся з трагічнай глыбінёй быцця, адчуваючы жудаснае дыханне катастрофы, канца, чалавек (а ён выступае тут ва ўласцівай для паэзіі В. Зуёнка ўнутранай маштабнасці) яшчэ і яшчэ раз хоча асэнсаваць і пераасэнсаваць свой жыццёвы і духоўны вопыт.

Як, з якіх пазіцый гэта можна зрабіць? Паэзія зноў ставіць пытанне аб чалавеку, яго родавых асаблівасцях і маральнай сутнасці, аб яго месцы ў прыродзе.

Сёння шмат спрачаюцца аб паэзіі — якой яна павінна быць, у чым яе мастацкая спецыфіка і задачы. Некаторыя лічаць, што за паэзіяй трэба пакінуць толькі яе вузка эстэтычную ролю (гл., напрыклад, артыкул Л. Дранько-Майсюка «Як» і «навошта»?», змешчаны ў газеце «Літаратура і мастацтва» ад 17 ліпеня 1987 года).

В. Зуёнак— паэт маральна і сацыяльна ангажаваны, без чаго ён не ўяўляе сабе творчасці, у чым мы маглі пераканацца, гартаючы старонкі папярэдніх яго зборнікаў. У новым зборніку фактычна атрымала працяг тэма, заяўленая яшчэ ў «Світальных птушках» (1982):

Над светам паглумным,  
Над векам бяздушным  
Ляцяць мае думы —  
Світальныя птушкі.

Свет заўсёды быў арэнай барацьбы дабра і зла — пра гэта В. Зуёнак у тых жа «Світальных птушках» пісаў:

Як сонца засвеціць,  
Падваляць і хмары.  
Як зелень на вецце —  
Дык засуха ўдарыць.  
А песня пачнецца —  
Рахунак падвойны:  
То мор пранясецца,  
То выбухнуць войны...  
Адно не па чыне —  
Затое практычна:  
Зямля — як пясчынка,  
А боль — галактычны...

Галактычны боль працяў Беларусь вясной 1986 года.

Трывожныя хмары, трывожныя дажджы і да гэтага часу ідуць на яе з боку Чарнобыля...

З таго часу, калі здарылася чарнобыльская трагедыя, мы жывём у новым свеце, у іншым псіхалагічным вымярэнні.

Што застаецца паэту ў такіх абставінах? Замкнуцца ў свеце сваёй душы? Адвярнуцца ад навакольнага?

«Лета трывожных дажджоў» сведчыць, што гэтага не адбылося. Наадварот, ён пацвердзіў здольнасць і мужнасць глядзець праўдзе ў вочы, успрымаць рэчаіснасць такой, якая яна ёсць.

Чарнобыльскі выбух можна параўнаць з ціхім выбухам нейтроннай бомбы, які атруціў усё жывое.

З глыбокім болем гучыць верш «Урок паўтарэння»:

Зноў лічэбнік... Жывым і мёртвым —
Паўтарэння зададзены ўрок...
Паўтараем: «кожны чацвёрты...»
І — «чацвёрты энергаблок...»
Крочыць здань на хадулях ракетных...
Просіць свет надзеі глыток...
Б'юць у звон Чарнобыля ветры
І — чацвёрты энергаблок.
Ён гукае: устаньце, людзі,
Каб адолець ядзерны змрок,
Бо інакш — не жыццё ў нас будзе,
А чацвёрты энергаблок...

На пранізаны галактычным болем радок лёг цень сусветнага жаху.

Паэт звяртаецца да паўтораў як да мастацкага сродку большай выразнасці. Чацвёрты энергаблок— гэта якраз той, у якім адбыўся злашчасны выбух.

Трагедыя Чарнобыля, на думку паэта, не проста чыйсьці недагляд, яна мае свае сацыяльныя і маральныя карэнні і прычыны, якія трэба шукаць у зніжэнні духоўнага ўзроўню грамадства, непавазе да жыцця, празмерна валявых да яго адносінах, у яго дэгуманізацыі і абесчалавечванні.

Вядомы пісьменнік і фізік Ральф Лэп задоўга да Чарнобыля наступным чынам вызначыў стан сучаснага свету: «Мы імчымся ў поездзе, які ўсё набірае хуткасць і ляціць уперад па чыгуначнай каляі з мноствам адгалінаванняў, што вядуць невядома куды. Ніводнага вучонага няма ў кабіне машыніста, а за кожнай стрэлкай тоіцца небяспека катастрофы. Большая ж частка грамадства знаходзіцца ў апошнім вагоне і глядзіць назад».

Падобная сітуацыя заявіла аб сабе і ў выпадку з Чарнобылем...

Побач — афганская трагедыя, пра якую таксама выразна сказана ў новай кнізе В. Зуёнка. «Афган» — праяўленне агульнай тэндэнцыі дэгуманізацыі свету і чалавека.

Калі трымае маці на руках
Свайго малога, мне здаецца — маці

Трымае чалавецтва, што ў вяках
Жыве, як светлы дух у гэтай хаце.
Калі ўзрывае цішу самалёт,
Ламаючы бар'еры гукавыя,
Здаецца, што з усіх зямных шырот
Глядзяць трывожна ў неба ўсе жывыя.
Калі ён сядзе з грузам дамавін,
І маці зразумее, што ніколі
Не выйдзе з металічнай хаты сын,
І загалосіць: «Мой жа ты саколік...» —
Чым гэты слёзы можна акупіць,
Якім — зямным альбо нябесным — раем?..
Пясок ля ямы ад слязы кіпіць,
Зямля — наскрозь, навылет — прагарае.

У вершы «Родны мой краю...» паэт гартае старонкі пакутлівай гісторыі свайго народа. В. Зуёнак ніколі не быў бясстрасным летапісцам. Яго заўсёды цікавілі гарачыя перыяды нашай гісторыі (яна ўся — гарачая!).

Яго гняце сасоннік у Курапатах, што падняўся на чалавечых касцях, бяздумная, сляпая жорсткасць, якая вяла людзей да гібелі, фанатызм, якому таксама няма апраўдання. Цяжкім, вельмі цяжкім аказаўся лёс народа.

З душою наросцеж, хапком, напавер
Ты ўзводзіў вышынную хату:
На шыі з пятлёй
                    трыццаць сёмы паверх
Вісеў над падмуркам трыццатым.
«Дзе вашы магілы, бацькі і дзяды?» —
У жвір, як у памяць,— лапата:
Дарог абарваных шукаюць сляды
Нашчадкі твае ў Курапатах.
Няўмольна твой лёс паўтарае віткі,
Ды вочы твае з надзеяй
З-пад хлебаробскай мазольнай рукі
Насустрач сынам паглядзелі.
Ты жыцьмеш, мой краю: не ўсе паляглі
Пад сосны — хто ў крамным, хто ў зрэбным...
Ты выжыць павінен, бо з гэткай зямлі
Узнімаюцца зоркі на неба.

Паэт з болем задумваецца над станам сучаснага свету, над узаемасувяззю вынікаў і прычын, складанасцю і шматмернасцю чалаве-

чага вопыту. Свабода і маральнасць для яго непадзельныя. Маральная ацэнка павінна суправаджаць кожны акт свабоднага выбару.

Ён б'е трывогу аб стане роднай мовы — стане, які таксама з'яўляецца пэўным звяном у ланцугу тых прычын і вынікаў і з відавочнасцю ўплывае на паводзіны чалавека, фарміруе яго залішне утылітарны падыход да жыцця.

Паэт разумее, што маральнасць грамадства складаецца з маральнасці яго асобных членаў, і кожны нясе адказнасць за лёс духоўных каштоўнасцей народа — у тым ліку такіх, як мова. Мова — аснова нацыянальнай культуры. Стан роднай мовы — як адной сцяблінкі ў сусветным моўным суквецці — гэта таксама пытанне аб выжыванні свету і чалавека, аб яго духоўным здароўі.

Зборнік «Лета трывожных дажджоў» яшчэ раз напамінае, якое вялікае значэнне ў паэзіі мае характар, асоба. Маштабнасць характару, значнасць тэмы, шырыня пачуцця ў Зуёнка — усё гэта было відаць адразу, яшчэ ў першых зборніках. Захаваўся порах і сёння захаваўся сухім. Паэт па-ранейшаму імкнецца гаварыць пра тое, што яму рупіць, і ў гэтым сэнсе ён нікольні не паступаецца ўласнай сваёй індывідуальнасцю. Наадварот, быццам бы яшчэ больш востра адчувае сваё «я».

Цікавы верш «Канвеер...», ён створаны спосабам «калаж» — выкарыстаны загалоўкі з газетных артыкулаў, асобныя радкі, якімі стракаціць сённяшняя прэса.

«Назначаны ці абраны?..»
«Вучоныя ў пашчы кратэра...»
«Адбыўся кангрэс наркаманаў...»
«Забілі меліяратара...»
«Народ не бярэ ні грама...»
«Камп'ютэр — ахвяра логікі...»
«Пайшло не жыццё, а крама:
Чарга і ў загс і на могілкі...»

У стылі з'явілася аскетычнасць і суровасць. І ўсё ж такі кнігу «Лета трывожных дажджоў» нельга назваць творам змрочнай безвыходнасці, суцэльнага апакаліпсіса. Нягледзячы на боль і раны, у кнізе няма папрокаў, нараканняў на жыццё.

Паэзію В. Зуёнка жывіць яе сялянская закваска, неўміручы палявы, жытні дух. «Паміраеш — але жыта сей!» — кажуць беларусы. У аснове яго творчасці, як мы ўжо казалі, ляжыць яго асабісты жыццёвы вопыт, які дыктуе паэту тэмы — вечныя і заўсёды новыя: вера ў людское дабро, чалавечнасць, здольнасць да маральнага ўдасканалення,— новыя далягляды. Паэта хвалююць лёс свету і лёс асобнага

чалавека, тэма памяці, часу, радзімы. Ён шукае асноваўтваральныя духоўныя каштоўнасці, на якіх грунтуецца нармальная, асэнсаваная чалавечая жыццядзейнасць і якія здольны зберагчы асобу ў драматычных абставінах канца ХХ стагоддзя.

Сучасная лірыка В. Зуёнка звернута да сацыяльнай свядомасці чалавека. Сёння, разам з тым, многае бачыцца яму па-іншаму. Пра гэта сведчаць вершы «*** Ці прашэпча космасам жыта...», «*** Гадзіннікі не цікаюць...», «Касмічная вестка», «Я за тое...» і многія інш. Аўтар прыходзіць да высновы, што далёка не ўсе намаганні сучасніка, не ўсе формы яго сацыяльна-духоўнай актыўнасці можна разглядаць як сведчанне яго грамадзянскай годнасці.

Паказальныя для В. Зуёнка наступныя радкі:

Чаго мне лезці ў д'ябальскі натоўп,
Што прэцца на дзяльбу чыноў і славы?
Я толькі Ной, што ў атамны патоп
Ратуе слова продкаў ад расправы.

Аўтар выкарыстоўвае (у гэтым і іншых выпадках) біблейскі матыў, аднак увага яго канцэнтруецца на галоўных праблемах сучаснасці. Паэт яшчэ і яшчэ раз выказвае клопат аб чалавечай разумнасці, дабрыні, пачуцці адказнасці, аб тым, каб працэс перабудовы ў нашым грамадстве не быў затарможаны людзьмі, для якіх галоўнае — уласны дабрабыт. Вершам паэта ўласцівы строгасць слова, рэзкасць інтанацый, кантрастнасць мастацкіх фарбаў.

Якой павінна быць паэзія, каб прадухіліць зло ў сучасным свеце? Поўнага адказу на гэта пытанне даць немагчыма. Ясна адно, што яна, як і ўся літаратура, мусіць узяць на сябе вялікую частку той ачышчальнай работы ў сферы духоўнага жыцця, якую вядзе наша грамадства на шляхах перабудовы.

Не так даўно выказваліся меркаванні, што для гэтага прыдатна толькі «зверхлітаратура» (выраз А. М. Адамовіча). Гаворка ідзе пра літаратуру павышанай маральнай адказнасці. На гэты конт хочацца сказаць адно: якой бы надзённай і вострапраблемнай ні была «зверхлітаратура», яна не павінна абмяжоўваць увагай жыццё ва ўсіх яго праявах дабрыні, хараства і надзеі.

Мы ўдзячны В. Зуёнку, які вядзе нас у жытняе поле. Жыта паранейшаму — красуе!

Красуе жыта. І крані
Сцяблінкі лёгкай станік —
Агонь успыхне ў карані
І аблачынкай стане.
І што ні колас — ускалых

Маёй забытай долі:
Як хлебаробскі мой уздых,
Плыве пылок над полем.

Удача верша — у майстэрстве дэталі, якое перадае багацце і шматфарбнасць жыцця. В. Зуёнак, трэба сказаць, заўсёды надаваў вялікае значэнне важкай і сакавітай мастацкай дэталі і вылучаўся ў гэтых адносінах добрым эстэтычным густам. Прайшоў час, але, пагля-дзіце, свежасць успрыняцця засталася. Больш таго, «Лета трывожных дажджоў» дае падставы гаварыць пра рэальнае ўзбагачэнне стылявых дамінант яго паэзіі: узмацняецца размоўнасць, публіцыстычная напружанасць вершаванай мовы, хаця не знікаюць напеўнасць і плаўнасць — рысы, уласцівыя традыцыйнаму вершу, звязанаму з развіццём рэалістычна дакладнага стылю, не пазбаўленага, аднак, асацыятыўнасці і метафарычнасці.

У адзінстве свайго зместу і формы паэзія В. Зуёнка набывала моцнае сацыяльнае гучанне. Грамадзянскасць паэта ён разумее як яго здольнасць і магчымасць прымаць удзел у дзяржаўным жыцці краіны і імкнецца да гэтага.

Можна засведчыць, што тая паэтычная карціна свету, якую мастак стварыў у сваіх кнігах, адпавядае рэальным маштабам з'яў навакольнай рэчаіснасці.

Новы зборнік В. Зуёнка вельмі паказальны для духоўных пошукаў сучаснай беларускай літаратуры.

## ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ

Сёння, па ўсім відаць, беларуская літаратура, як і ўсё шматнацыянальнае савецкае мастацтва, знаходзіцца на пачатку новага і, хочацца спадзявацца, больш высокага этапу ў сваім развіцці, абумоўленага тым рашучым паваротам убок перабудовы ўсіх галін грамадскага жыцця, якім адзначаны наш час. Мяркуючы па ўсім, перабудова азначае пачатак новай эпохі ў гісторыі нашай дзяржавы на шляхах яе далейшага развіцця. Неабходнасць і заканамернасць перабудовы, шырокай дэмакратызацыі грамадства, усталявання прынцыпаў галоснасці і праўдзівасці ўсё глыбей і арганічней усведамляецца ўсімі людзьмі. Немалая заслуга ў гэтым належыць літаратуры, у прыватнасці паэзіі, якая ў лепшай сваёй частцы дапамагла і дапамагае выспяванню новых, перадавых грамадскіх настрояў і перакананняў.

У ліку такіх паэтаў — В. Зуёнак. Калі б мяне запыталі, якая галоўная рыса яго паэзіі, я б адказаў: непаказная народнасць, якая стала сацыяльна-эстэтычным і маральным крытэрыем аўтара. Слова гэта — народнасць — важкае, не легкадумнае, ім не кідаюцца, і далёка не кожнаму мастаку яно падыдзе. Зуёнку — падыходзіць. У цэнтры яго творчасці — сапраўды народны характар з уласцівымі для яго высокай маральнасцю і дабрынёй, разважлівасцю і бясконцай вынослівасцю, з пачуццём міласэрнасці і любові, якая здольна ўсё адолець на шляху да лепшага.

«Продкі мае,— піша ён у аўтабіяграфіі,— людзі простай сялянскай працы. Яны ўлагоджвалі зямлю-карміцельку, здабывалі хлеб свой. І калі ўзносілі малітву, дык не аб вечным жыцці, а найбольш аб ім — аб хлебе надзённым. Яны спрадвеку былі нашымі аднадумцамі: яны былі матэрыялістамі — няхай сабе стыхійна, неўсвядомлена, без кручкаватага шкалярскага мудраслоўя. Яны гаварылі: паміраць ладзься, а жыта сей. І ў гэтым быў залог бессмяротнасці...»

Паэт схіляе галаву перад народнай праўдай, якая выяўляецца ў яго ў вельмі канкрэтным абліччы.

Мне лёс мой сцвердзіў:
працай чорнай
За стромай год, даўным-даўно
Два словы цвёрда заручоны —
Жыццё і жыта — як адно.

Паэзія В. Зуёнка — цікавая, смелая, глыбокая — «круты палявы замес», настоены на багатым душэўным вопыце паэта. Тут знайшоў глыбокае адлюстраванне наш складаны век, перажыванні сучасніка,

суровая памяць вайны, узаемасувязь асобы, прыроды і грамадства, працоўная мараль і этыка сённяшняга чалавека, выявілася схільнасць паэта да маштабнага, асацыятыўна-ўзбуйненага вобраза, яркіх фарбаў і колераў. У метафары «праўда зерня», да якой звяртаецца паэт, закладзена сутнасць яго мастакоўскай канцэпцыі, успрыманне свету, цікавасць да вытокаў, імкненне глядзець у корань.

Не адразу ён знайшоў сваю дарогу. У першых кнігах ідэйна-маральны пафас часта саступаў месца жывапісна-выяўленчаму майстэрству, інтэнсіўныя мастацкія пошукі не заўсёды вялі да плённых вынікаў. Уласцівае раннім творам рамантычнае ўспрыманне з цягам часу дапаўняецца і спалучаецца з лірычна-пранікнёным і філасофска-заглыбленым асэнсаваннем сацыяльна-маральных з'яў сучаснасці.

Ужо ў першых кнігах ён праявіў цікавасць да вечных тэм чалавечага быцця і да канкрэтных набалелых праблем. Вершы і паэмы В. Зуёнка, эмацыянальныя і вострасучасныя, прываблівалі сваім жыццялюбствам, яскравасцю фарбаў, натуральнасцю паэтычнай інтанацыі. Яму ўласцівы шырокі духоўны дыяпазон, выразны грамадзянскі тэмперамент, пяшчотны лірызм, чалавечнасць. Мастацкі свет паэта ўключае прыроднае ўлонне і космас як складаемыя таго велічнага жыццёвага асяроддзя, сярод якога нараджаецца чалавек і якому ён абавязаны сваім розумам і пранікнёнасцю думкі. Усё навакольнае прадстае ў яго творах як частка ўласнай душы, розуму і лёсу паэта.

Яго творчасць даказвае, што сучасны паэт не магчымы без страснага, энергічнага маральнага пошуку, спавядальнасці, без свайго ўласнага! — адкрыцця агульнай ідэі часу. Праз яго індывідуальнае быццё праяўляецца быццё грамадскае — у кнігах В. Зуёнка знайшлі выяўленне патрыятызм савецкага чалавека, яго душэўная шчодрасць, дабрата, сыноўняя адданасць роднай зямлі. Паэт сцвярджае роднасць, сувязь з бацькоўскім домам, праз вершы аб прыродзе ён вяртае нас да вытокаў, да зямлі, на якой мы нарадзіліся. Тут яскрава адбіўся свет беларускай прыроды, да якой ён прывык з дзяцінства і якую нельмі добра ведае і адчувае і хоча перадаць гэта адчуванне нам.

Творчасць паэта прасякнута пафасам гістарызму, паяднала грамадзянскасць з лірычным асэнсаваннем жыцця. Герой і аўтар спалучаны ў адной асобе, у свядомасці якой адлюстроўваецца ўсё навакольнае жыццё.

Сёння савецкая літаратура значна пашырыла сваю сацыяльна-гістарычную і філасофскую аснову. Лірыку беларускага паэта непакояць і трывожаць старыя і новыя загадкі быцця. У яго ніколі не было схільнасці да душэўнай утульнасці.

Як лёгка наперад глядзець —
Калі табе дваццаць.
Адзвоніць асенняя медзь —
Як цяжка назад азірацца...

Гэтыя радкі былі змешчаны ў даўняй кнізе—«Сяліба» (1973). Іх можна паўтарыць і сёння, калі залаты юбілей застаўся недзе ззаду...

«У аблiччы ягоным,— пісаў пра В. Зуёнка Р. Барадулін,— у нетаропкіх, але ашчадна ўвішных руках, у манеры трымацца натуральна і ўпэўнена, у рэдкім апошнім часам таленце ўмення слухаць субяседніка ёсць нешта і ад разважлівага хлебароба, і ад засяроджанага над праблемамі веку інтэлектуала. Адначасова».

Вельмі дакладнае назіранне!

Вышэй гаварылася пра ўплыў У. Маякоўскага, пра некаторую тыпалагічную супольнасць гэтых паэтаў. У кантэксце выказвання Р. Барадуліна В. Зуёнка можна назваць «сялянскім Маякоўскім».

Майстэрства В. Зуёнка — вынік яго светапогляднай пазіцыі, ён імкнецца да гранічнай выразнасці радка, валодае гнуткім, гаваркім вершам, які дапамагае весці зацікаўленую размову з сучаснікам, аналізаваць актуальныя праблемы жыцця, страсна і пераконана сцвярджаць высокае прызванне чалавека на зямлі.

Варта прыгадаць таксама, што ў яго асобе маем таксама выдатнага дзіцячага паэта, а таксама сатырыка і гумарыста.

Творчасць В. Зуёнка звернута непасрэдна да сучаснікаў і неаддзяліма ад яго грамадскай дзейнасці. «Наканаванне таленту,—- лічыць ён,— сказаць тое, што перажыў, што перадумаў на шляхах, пазначаных лёсам, сказаць тое, што ўсхвалюе людзей, узвысіць іх духоўна, ачысціць, пакліча да святла... Акт лёсу — і акт паэзіі. Еднасць справы і слова, слова і справы — толькі ў непарыўнай лучнасці, толькі ў двухадзінстве — іх жыццяздольнасць. Інакш нельга» («Полымя». 1984. № 4. С. 196).

А вось верш з нядаўняй кнігі — «Лета трывожных дажджоў» (1990). Ён варты таго, каб прывесці яго цалкам:

Не дай мне бог духоўным стаць бадзягам,
Без памяці жывой, без каранёў,
Ісці бязмэтна за ілжывым сцягам
І верыць, што вяшчуе вараннё.
Народзе мой, не дай мне абмыліцца,
Маўчаць, як ты маўчаў цераз вякі,
І рабскаю рахманасцю хваліцца,
І падстаўляць для ўдару дзве шчакі —
Гісторыю, распятую на крэсах

І на заходніх-з-поўначчу краях,
І мову, што спрадвеку лёс накрэсліў,
Каб ты Купалы словам акрыяў.
Няўжо забыта ўсё, періазабыта —
Сыноў найлепшых светлы запавет?..
Не веру, што аднойчы з тварам сытым,
З духоўнай торбаю ты выладзішся ў свет...
Ці быў калі народ-самазабойца?
Скажыце мне, вучоныя мужы...
Дык што ж цябе, не мота, не прапойцу,
Штурхае да апошняе мяжы?
Я ведаю: народы паміраюць...
Але такі — з Хатынямі ў душы,
Якому пекла можа здацца раем,—
Такі, як свет, павінен вечна жыць!
Не дай жа ў сэрцы зруйнаваць краіну,
Што на шляхах крывавых збудаваў,
Пайсці перараджэнца каляінай,
Што мову забываў ці забіваў...
Народзе мой, прабач дакор палынны,—
Ці мне сароміць і ці мне вучыць?..
Ты знаеш лепш, ты не падсудны сыну.
Але ці лепш, як здрадна сын маўчыць?

Паэзія не маўчыць — яна не павінна маўчаць.

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

**ЗМЕСТ**

Пачатак дарогі
Для дзяцей
Парадокс паэта
З наборам вышыні
Шлях да паэмы
Пра нашу сялібу
Першы падрахунак
Праўда зерня
Новыя абсягі
У глыбіню гісторыі
Рытмы часу
Выбіраю — жыццё...
Замест заключэння

**Гніламёдаў У.**

Праўда зерня: Творчы партрэт В. Зуёнка,— Мн.: Маст. літ., 1992,— 143 с.,[8] л. іл.

ISBN 5-340-00882-7.

Гниломедов В. Правда зерна: Творч. портрет В. Зуёнка.

Васіль Зуёнак — адзін з самых самабытных і таленавітых сучасных паэтаў, хто бярэцца за пяро не толькі дзеля таго, каб выказаць радасць і замілаванне жыццём, а перш-наперш каб адказаць на спрадвечныя пытанні: як жыць, што любіць, у што верыць? У кнізе аналізуецца жыццёвы і творчы шлях паэта, раскрываюцца глыбіня і своеасаблівасць мастацка-філасофскіх поглядаў, гуманізм, вера ў духоўныя каштоўнасці чалавека.